# Грамадазнаўства



10 клас

# Сацыяльная сфера

## Сацыяльная мабільнасць

- Індывідуальная
- Групавая

- Гарызантальная
- Вертыкальная

**Сацыяльны ліфт**

## Сацыяльныя супольнасці

- Статусныя: Клас, Страта
- Тэрытарыяльныя: Гарадскія жыхары, Сельскія жыхары
- Этнічныя: Нацыя
- Заснаваныя на паводзінах: Натоўп, Публіка

**Сацыяльныя групы**

## Сацыяльныя ролі

- Ролевае чаканне
- Ролевае выкананне

**Ролевы канфлікт**

## Сацыяльны статус

- Прадпісаны
- Набыты

- Асабісты
- Групавы

## Сацыяльнае дзеянне

**Сацыяльны інстытут**

- Сацыяльныя
- Эканамічныя
- Палітычныя
- Духоўныя

**Сацыяльныя працэсы**

- Эвалюцыя
- Рэвалюцыя
- Рэформа

## Сацыяльная структура

- Гарызантальная
- Вертыкальная

**Стратыфікацыя**

- Даход
- Улада
- Адукацыя
- Прэстыж

**Сацыяльныя камунікацыі**

- Камунікатар
- Паведамленне
- Канал
- Аўдыторыя
- Зваротная сувязь

# Палітычная сфера

## Палітыка
- **Улада** — Палітычная эліта
- **Кіраванне** — Палітычны лідар

## Дзяржава
- **Форма кіравання**
  - Манархія: Абсалютная, Канстытуцыйная
  - Рэспубліка: Прэзідэнцкая, Парламенцкая, Змешаная
- **Форма ўладкавання**
  - Унітарная
  - Федэрацыя
  - Канфедэрацыя
- **Палітычны рэжым**
  - Дэмакра-тычны
  - Аўтарытарны
  - Таталітарны

## Правы чалавека
- **Дэмакратыя**
  - Прамая: Рэферэндум
  - Прадстаўнічая: Парламент
- **Прававая дзяржава**
- **Грамадзянскае грамадства**
- **Выбары**
  - **Выбарчая сістэма**
    - Мажарытарная
    - Прапарцыянальная
    - Змешаная

## Палітычная сістэма
- **Ідэалогія**
  - Лібералізм
  - Кансерватызм
  - Сацыялізм
- **Грамадскае аб'яднанне**
  - Палітычная партыя
  - Грамадская арганізацыя
  - Грамадскі рух

# Эканамічная сфера

## Эканамічныя суб'екты

- Домагаспадаркі
- Фірмы, прадпрыемствы
- Дзяржава



## Уласнасць

- Дзяржаўная
- Прыватная
  - Асабістая
  - Індывідуальная
  - Калектыўная

## Эканоміка

### Даброты

### Рэсурсы

### Фактары вытворчасці

- Праца
- Зямля
- Капітал
- Інфармацыя
- Прадпрымальніцкая здольнасць

### Эканамічная дзейнасць

- Вытворчасць
- Размеркаванне
- Абмен
- Спажыванне



## Эканамічная сістэма

- Традыцыйная
- Рынкавая
- Планавая
- Змешаная

### Рынак

- Попыт
- Прапанова

### Канкурэнцыя

- Дасканалая
- Недасканалая
  - Манапалістычная
  - Алігаполія
  - Манаполія

## Фінансавая сістэма

### Бюджэт

- Прафіцыт
- Баланс
- Дэфіцыт

### Грошы

- Інфляцыя

### Банкі

- Дэпазіты
- Крэдыты

### Даходы

- Прыбытак
- Рэнта
- Дывідэнды
- Зарплата
- Працэнт
- Роялці

### Падаткі

- Прамыя
  - Падаходны
- Ускосныя
  - ПДК

# Духоўная сфера

## Рэлігія

- Монатэізм
- Політэізм

- Сусветныя
  - Хрысціянства
  - Іслам
  - Будызм
- Нацыянальныя

**Свабода сумлення**

Свабода веравызнання

## Этыка

**Мараль**

**Маральнасць**

- Каштоўнасці
- Ідэалы
- Нормы

## Філасофія

- Эмпірызм
- Рацыяналізм

- Матэрыялізм
- Ідэалізм

- Гнасеалагічны аптымізм
- Скептыцызм
- Агнастыцызм

## Адукацыя

- Дашкольная
- Сярэдняя
- Прафесійна-тэхнічная
- Сярэдняя спецыяльная
- Вышэйшая
- Пасляўніверсітэцкая

**Навучанне**

**Выхаванне**

## Навука

- Акадэмічная
- Універсітэцкая

- Гуманітарныя
- Прыродазнаўчыя
- Тэхнічныя

**Даследаванні**

- Фундаментальныя
- Прыкладныя

## Грамадства ведаў

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам
для павышанага ўзроўню)

Пад рэдакцыяй А. М. Данілава

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2020

УДК 3(075.3=161.3)
ББК 60я721
Г76

**Аўтары:** А. М. Данілаў, А. А. Палейка, Н. В. Кушнер, І. П. Бернат, Д. К. Бязнюк, А. А. Бялоў, Я. Ф. Грачнёва, А. В. Кабяк, С. П. Мармашова, М. А. Мажэйка, Л. У. Старавойтава, Н. У. Чарчэнка (пад рэд. А. М. Данілава)

Пераклад з рускай мовы Т. В. Басалыгі, Г. М. Федаровіч

**Рэцэнзенты:** доктар філасофскіх навук, прафесар, першы прарэктар установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» *С. П. Вінакурава*; метадычнае аб'яднанне настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства Глускага раёна Магілёўскай вобласці (дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія г. п. Глуска», настаўнік грамадазнаўства кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» *С. Я. Сяргееў*); доктар эканамічных навук, прафесар, загадчык кафедры эканамічнай тэорыі факультэта міжнародных эканамічных адносін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» *В. А. Вараб'ёў*; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 16 г. Брэста» *Г. В. Свентухоўская*

Электронны дадатак размешчаны на рэсурсе http://profil.adu.by

**Успамінаем вывучанае**

**Рашаем задачу, разбіраем сітуацыю**

**Персона ў навуцы**

**Ідэі для міні-праектаў**

**Абмяркоўваем і дыскутуем**

**Пытанні і заданні**

**Пошук**

ISBN 978-985-599-307-1

© Басалыга Т. В., Федаровіч Г. М., пераклад на беларускую мову, 2020
© Фотабанк Shutterstock, Inc., shutterstock.com, ілюстрацыі, 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2020

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Уводзіны

У дадзенай кнізе мы працягнем нашу размову пра чалавека, грамадства і дзяржаву. У мінулым годзе асноўны акцэнт рабіўся на вывучэнне свайго ўнутранага свету, міжасобасных адносін, узаемадзеяння з дзяржавай, дыялогу культур. Мы з вамі паглыбляліся ў свет уласных унутраных перажыванняў, спрабавалі навучыцца чуць сябе, разумець людзей, якія знаходзяцца побач. Гэта дазволіла нам адчуць дачыненне да спраў і клопату сваёй сям'і, калектыву, грамадства, дзяржавы, зразумець і ўзяць на сябе ўласную адказнасць за мір і згоду на Зямлі, бяспечнае існаванне.

Мы не здольны спыніць ход гісторыі, аднак можам выбраць правільны кірунак руху, зразумець, куды вядуць шляхі, якія адкрываюцца перад намі. Толькі празорлівыя могуць прадбачыць новае аблічча будучага грамадства. Каштоўнасці, якія выпрацоўваліся чалавецтвам на працягу многіх стагоддзяў сацыяльнай эвалюцыі, не павінны быць разбураны. Не ўсё, што эканамічна выгадна з погляду міжнароднага падзелу працы, мэтазгодна прымяняць. Выбар шляху развіцця грамадства абумоўлены нацыянальнымі інтарэсамі і бяспекай суверэннай дзяржавы.



*Мінск, 1941—1942 гг.*



*Мінск, 2020 г.*

Чаму сталіцу нашай краіны часта параўноўваюць з феніксам, які адрадзіўся з попелу? Што сімвалізуе дадзенае параўнанне? Як яно адлюстроўваецца ў каштоўнаснай сістэме беларускага народа? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Знайдзіце архіўнае фота вашага населенага пункта і вызначце месца, якое на ім адлюстравана. Якое яно сёння? Зрабіце здымак сучаснага выгляду дадзенага месца і параўнайце абодва фотаздымкі. Што і як змянілася? ■

Вам трэба будзе вывучаць сучаснае грамадства: якія ў ім адбываюцца змены, як узаемадзейнічаюць паміж сабой розныя сацыяльныя групы. Надзейным компасам у гэтай дзейнасці з'яўляюцца навукі аб грамадстве, у таямнічы і загадкавы свет якіх вы паглыбіцеся ў гэтым навучальным годзе.

Вам неабходна будзе засвоіць асновы сацыялогіі, паліталогіі, эканомікі, культуралогіі і філасофіі. Кожная з іх цікавая па-свойму, мае свае асаблівасці і метады даследавання, адлюстроўвае свой спектр чалавечага жыцця, яго адносіны да навакольнага асяроддзя.

Можна сказаць, што на вашых вачах змяняецца свет. Варта далучацца і пераўтвараць яго, выкарыстоўваць новыя тэхналогіі, будаваць IT-грамадства, асвойваць кіберпрастору, выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі для пазнання новага, атрымання сучасных ведаў, якаснай адукацыі.

## Як працаваць з вучэбным дапаможнікам?

Усе раздзелы дапаможніка пачынаюцца са схем, у якіх адлюстроўваюцца галоўныя мэты і чаканыя вынікі вывучэння дадзеных раздзелаў. Уступная інфаграфіка, што папярэднічае кожнаму параграфу, дае кампактнае і выразнае ўяўленне зместу тэмы ўрока і ключавога пытання для абмеркавання на занятках. Пасля кожнага параграфа прапануюцца пытанні і заданні для самакантролю. Акрамя таго, у тэксце вы знойдзеце заданні і пытанні для абмеркавання. У канцы кожнага раздзела даюцца пытанні і заданні для паўтарэння, сістэматызацыі і абагульнення па засвоеным матэрыяле і падрыхтоўцы да кантролю ведаў па ім.

Абавязковыя для засваення асноўныя паняцці, якія ўпершыню тлумачацца ў тэксце параграфаў, выдзелены **тлустым шрыфтам**.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На старонках вучэбнага дапаможніка прадстаўлены розныя рубрыкі. Ідэі і працы вучоных, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё навук пра чалавека і грамадства, разглядаюцца ў рубрыцы «Персона ў навуцы». Яе змест будзе карысны пры рабоце з заданнямі, падрыхтоўцы паведамленняў, самастойным выбары тэм для міні-праектаў. Рубрыка «Пошук» арыентуе на самастойную работу з інфармацыяй, яе пошук і праверку. Рубрыка «Абмяркоўваем і дыскутуем» прадугледжвае праблемныя пытанні і актуальныя тэмы для абмеркавання, а ў рубрыцы «Рашаем задачу, разбіраем сітуацыю» вы знойдзеце цікавыя вучэбныя і практычныя задачы, жыццёвыя сітуацыі. Да кожнай тэмы прапануюцца ідэі міні-праектаў, якія можна выканаць як у групах, так і індывідуальна. У вучэбным дапаможніку вы таксама сустрэнеце заданні з QR-кодам, для выканання якіх спатрэбіцца смартфон (для адкрыцця спасылак і прагляду кантэнта).

Звяртаем увагу на тое, што пошукавыя заданні, работа з QR-кодамі і выкананне міні-праектаў з'яўляюцца заданнямі па выбары, аднак яны робяць працэс навучання больш займальным і практыка-арыентаваным.

Для тых, хто вывучае грамадазнаўства на павышаным узроўні, створаны электронны дадатак на рэсурсе http://profil.adu.by. Пераход па спасылцы на матэрыялы павышанага ўзроўню ў вучэбным дапаможніку пазначаны спецыяльным сімвалам ⬆, а таксама QR-кодам для працы з электронным дадаткам са смартфона.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# I Сацыяльная сфера грамадства

## 1 Што такое грамадства?

- Сістэма
- Структура
- Іерархія

## 2 Як функцыянуюць?

- Групы
- Інстытуты
- Грамадства

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Маса і натоўп
- Супольнасць і група
- Інстытут і працэс

## 4 Як узаемазвязаны?

- Статус і роля
- Дзеянне і мэта
- Медыя і камунікацыя

## 5 Якія бываюць?

- Сацыяльныя ролі
- Сацыяльныя слаі
- Сацыяльныя групы

## ? Ці ўсе сферы жыцця грамадства ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 1. Грамадства як сістэма




**Паняцце грамадства.** Ужо мысліцелі старажытнасці зрабілі грамадства аб'ектам сваіх разваг, спрабуючы ўстанавіць законы і прынцыпы яго арганізацыі, растлумачыць характар і прыроду сумеснай жыццядзейнасці людзей. Такія развагі ажыццяўляліся ў межах міфалогіі, багаслоўя, філасофіі, але толькі ў XIX ст. сфарміравалася асобная самастойная навука пра грамадства — сацыялогія. Менавіта яна пачала фарміраваць разнастайныя тэорыі грамадства, распрацоўваць навуковыя метады яго вывучэння. *Сацыялогія* — гэта навука аб структуры, функцыях, формах і прынцыпах арганізацыі і развіцця грамадства як сацыяльнай сістэмы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Упершыню слова «сацыялогія» (ад лац. *societas* — грамадства і грэч. *λόγος* — слова) было ўведзена ў навуковы ўжытак французскім мысліцелем XIX ст. Агюстам Контам. Вучоны меркаваў, што гэтая навука стане адзінай сапраўднай рацыянальнай нагодай для пераўтварэння грамадства ў бок гуманізму, справядлівасці і прагрэсу. ■

**Грамадства — гэта ўстойлівая сістэма адносін паміж людзьмі, якая гістарычна склалася ў працэсе сумеснай жыццядзейнасці.**

Асноўным паняццем сацыялогіі з'яўляецца «сацыяльнае» (інакш кажучы, міжчалавечае, сумеснае, агульнае). Адсюль і логіка сацыялагічнага разумення сутнасці грамадства як сацыяльнага прадукту, як выніку сумесных дзеянняў. Паколькі людзі ўзаемадзейнічаюць адзін з адным, большасць гэтых дзеянняў можна разглядаць як сацыяльныя.

**Сацыяльнае дзеянне — гэта дзеянне, якое ўсведамляецца самім чалавекам, арыентавана на паводзіны іншых людзей і зразумела навакольным.**

Нямецкі сацыёлаг Макс Вебер у 1890-я гады стварыў тэорыю сацыяльнага дзеяння. Ён вылучаў дзве ключавыя прыметы, паводле якіх дзеянне чалавека або групы людзей можна вызначыць як сацыяльнае. Па-першае, дзеянне павінна быць дастаткова ўсвядомленым, іншымі словамі, мець суб'ектыўны сэнс. Па-другое, яно па сэнсе, які надаюць яму дзеючыя асобы або асоба, павінна суадносіцца з дзеяннем іншых людзей і арыентавацца на яго. ■

Напрыклад, мужчына прытрымаў дзверы і прапусціў перад сабой жанчыну; дзяўчына саступіла пажылой жанчыне месца ў грамадскім транспарце; маладыя людзі дапамаглі жанчыне з малым дзіцем у дзіцячай калясцы падняцца па лесвіцы. Усё гэта сацыяльныя дзеянні, бо яны носяць усвядомлены ўдзельнікамі і зразумелы для ўсіх характар. Пры гэтым матывы адных і тых жа дзеянняў у розных людзей могуць адрозніваца. Безумоўным з'яўляецца і тое, што падобныя матывы могуць спарадзіць розныя сацыяльныя дзеянні. Таму адна з асноўных задач


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сацыялогіі, на думку М. Вебера, — разуменне сацыяльнага дзеяння з мэтай тлумачэння яго прычын, працэсу ажыццяўлення і меркаванага выніку.

Абмен дзеяннямі паміж двума або больш удзельнікамі азначае, што адбываецца сацыяльнае ўзаемадзеянне. Калі ўзаемадзеянні паўтараюцца, то яны набываюць характар сацыяльных адносін.

**Сферы жыцця грамадства і сацыяльныя інстытуты.** Грамадства як устойлівая сістэма адносін паміж людзьмі складаецца з падсістэм, якія называюць сферамі грамадскага жыцця. Звычайна вылучаюць чатыры сферы: сацыяльную, эканамічную, палітычную, духоўную. Сферы жыцця грамадства — гэта не замкнёныя сістэмы, якія насяляюць розныя людзі, а адносіны адных і тых жа людзей у сувязі з рознымі бакамі іх жыцця. У кожнай са сфер грамадскага жыцця фарміруюцца спецыфічныя сацыяльныя інстытуты, з дапамогай якіх адносіны ў грамадстве набываюць устойлівы характар, упарадкоўваюцца і сістэматызуюцца. У дадзеным сэнсе сацыяльны інстытут падобны да паняцця «правілы гульні».

Паняцце «сацыяльны інстытут» увёў у навуковы ўжытак англійскі сацыёлаг XIX ст. Герберт Спенсер. ■

У сучаснай сацыялогіі пад **сацыяльным інстытутам** разумеюць форму арганізацыі сумеснай жыццядзейнасці людзей. Яе існаванне выклікана неабходнасцю задавальнення сацыяльных, эканамічных, палітычных, культурных ці іншых патрэб грамадства. Сацыяльныя інстытуты могуць уплываць на паводзіны людзей з дапамогай устаноўленых правіл, норм, санкцый.

Сям'я, вытворчасць, рэлігія, адукацыя, уласнасць, войска, дзяржава — гэта фундаментальныя сацыяльныя інстытуты, якія ўзніклі ў глыбокай старажытнасці і якія існуюць у цяперашні час. Кожны інстытут выконвае строга прадпісаную функцыю: абараняе, вырабляе, навучае і г. д.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сацыяльныя інстытуты

| Сацыяльная сфера | Эканамічная сфера | Палітычная сфера | Духоўная сфера |
|---|---|---|---|
| • Сям'я<br>• Медыцына<br>• Сацыяльнае забеспячэнне | • Уласнасць<br>• Вытворчасць<br>• Фінансавыя ўстановы | • Дзяржава<br>• Права<br>• Палітычныя партыі | • Адукацыя<br>• Навука<br>• Мастацтва<br>• Рэлігія |
| Забяспечвае ўзнаўленне чалавечага роду, захаванне здароўя людзей, дапамогу хворым і састарэлым | Забяспечвае ўмовы, якія спрыяюць вытворчасці, размеркаванню, абмену і спажыванню жыццёвых даброт | Забяспечвае падтрымку парадку, ажыццяўленне ўлады, умацаванне цэласнасці грамадства | Забяспечвае стварэнне, захаванне і перадачу новым пакаленням каштоўнасцей культуры, сацыялізацыю падрастаючага пакалення |

Прасачыце і абмяркуйце ўзаемасувязі паміж сацыяльнымі інстытутамі, якія належаць да розных сфер грамадства. ■

Для выканання сваіх функцый сацыяльны інстытут стварае неабходныя ўстановы, у рамках якіх арганізуецца яго дзейнасць. Акрамя таго, кожны інстытут павінен валодаць неабходнымі сродкамі і рэсурсамі. Напрыклад, для функцыянавання інстытута медыцыны ствараюцца такія ўстановы, як бальніцы, навукова-даследчыя інстытуты і лабараторыі, узводзяцца будынкі, выдаткоўваюцца грашовыя сродкі і іншыя рэсурсы. Адзін інстытут можа ўдзельнічаць у выкананні некалькіх функцый у розных сферах грамадства. Напрыклад, інстытут шлюбу рэгулюе шлюбныя адносіны, удзельнічае ў рэгуляванні сямейных адносін і адначасова спрыяе рэгуляванню адносін уласнасці і інш.

Функцыі сацыяльных інстытутаў могуць змяняцца, знікаць і трансфармавацца ў новыя. Стан сацыяльных інстытутаў — паказчык устойлівасці сацыяльнай сістэмы. Калі сістэма стабільная,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сацыяльныя інстытуты маюць зразумелыя і неабходныя функцыі. Напрыклад, сям'я як сацыяльны інстытут — гэта не канкрэтныя бацькі, дзеці і іншыя члены сям'і, а пэўная сістэма фармальных і нефармальных норм і правіл, на аснове якіх будуюцца сямейныя адносіны. Інстытут сям'і выконвае функцыі ўзнаўлення чалавечага роду і сацыялізацыі членаў грамадства.

## Сям'я

**Малая сацыяльная група**
Члены групы звязаны кроўным сваяцтвам або шлюбам, вядзеннем агульнай гаспадаркі, узаемнай адказнасцю і ўзаемадапамогай



**Сацыяльны інстытут**
Уяўляе сабой комплекс сацыяльных норм, узораў паводзінаў, правоў і абавязкаў, якія рэгулююць адносіны паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі

Чаму сям'я ў сацыялогіі разглядаецца адначасова і як малая сацыяльная група, і як сацыяльны інстытут? ■

**Сацыяльныя групы.** Непазбежныя ў грамадстве ўзаемадзеянні людзей спараджаюць канкрэтныя аб'яднанні людзей — непасрэднае сацыяльнае асяроддзе. Для абазначэння дадзенага асяроддзя выкарыстоўваюць паняцце сацыяльнай супольнасці. *Сацыяльная супольнасць* — гэта сукупнасць аб'яднаных па пэўнай прымеце людзей, якая выступае суб'ектам сацыяльнага ўзаемадзеяння.

Сацыяльныя супольнасці вылучаюцца вялікай разнастайнасцю відаў і форм. Напрыклад, калі браць у якасці крытэрыю працягласць існавання супольнасці, то можна пачынаць ад некалькіх хвілін і гадзін (пасажыры аўтобуса, тэатральная публіка) і заканчваць стагоддзямі і нават тысячагоддзямі (этнасы). Паводле якаснага складу вылучаюць як супольнасці, што складаюцца з некалькіх

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

асоб, так і шматлікія масы. Па ступені сувязі паміж індывідамі параўнальна ўстойлівыя аб'яднанні (сем'і, нацыі) адрозніваюцца ад сітуацыйных, выпадковых, кароткачасовых утварэнняў (натоўп у метро, балельшчыкі на стадыёне, публіка на канцэрце).

Сацыяльныя супольнасці ўяўляюць сабой зоны рэальных сацыяльных узаемадзеянняў і даюць неабходны матэрыял для вывучэння канкрэтных грамадстваў. Найбольшую цікавасць для сацыялогіі ўяўляе **сацыяльная група** — устойлівая супольнасць людзей з наступнымі прыметамі: два і больш чалавек, агульныя інтарэсы і каштоўнасці, наяўнасць рэгулярнага ўзаемадзеяння членаў групы, чаканні адносна адзін аднаго, якія падзяляюцца кожным членам групы, адасобленасць ад іншых груп і аб'яднанняў.

Існаванне групы непарыўна звязана з выкананнем ёю сваіх сацыяльных функцый, да якіх належаць: мэтавызначэнне (група вызначае мэту для сваіх членаў); кантроль (у групе адсочваюцца прынятыя ў ёй паводзіны і мысленне ўдзельнікаў); сацыялізацыя (членаў групы навучаюць пэўным правілам паводзінаў, адпаведным яе мэтам і задачам).

Успомніце, што такое малая сацыяльная група. Чым адрозніваецца фармальная група ад нефармальнай? ■





Вызначце, да якіх сацыяльных супольнасцей належаць людзі, адлюстраваныя на фотаздымках. У чым іх падабенства і адрозненне? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вялікай сацыяльнай групай называецца шматлікая сукупнасць людзей, якія не маюць паміж сабой непасрэдных кантактаў, але аб'яднаны ўсведамленнем прыналежнасці да дадзенай групы, ладам жыцця, агульнай псіхалогіяй, звычаямі і традыцыямі: нацыя, сацыяльны клас, саслоўе. У якасці вялікай сацыяльнай групы можна таксама разглядаць моладзь.

Моладзь уяўляе сабой асаблівую сацыяльную групу, што вылучаецца ўзроставымі рамкамі і становішчам у грамадстве, якое прадугледжвае пераход ад дзяцінства і юнацтва да дарослaverсці. Узроставыя межы маладосці не з'яўляюцца адназначнымі і вызначаюцца ў разнастайных даследаваннях ад 14–16 да 25–30 гадоў (а часам нават пазней). Згодна з беларускім заканадаўствам, **моладзь** — гэта сацыяльна-дэмаграфічная група (асобы ва ўзросце ад 14 да 31 года), якая валодае сукупнымі полаўзроставымі і сацыяльна-псіхалагічнымі асаблівасцямі і праходзіць стадыю сацыялізацыі ў канкрэтных умовах жыццядзейнасці грамадства.

## Характэрныя рысы моладзі

- Станаўленне самасвядомасці і ўстойлівага вобраза сваёй асобы, свайго «Я»
- Пошук свайго месца ў жыцці
- Завяршэнне адукацыі
- Пачатак працоўнай дзейнасці



- Набыццё матэрыяльнай самастойнасці
- Набыццё ўсёй паўнаты правоў
- Змяненне сацыяльнага статусу, пашырэнне сацыяльных роляў
- Стварэнне ўласнай сям'і

Якія асаблівасці маладога пакалення могуць быць праілюстраваны выказваннем, што прыпісваюць пісьменніку Марку Твену: «Калі мне было 14 гадоў, мой бацька быў настолькі дурны, што я з цяжкасцю вытрымліваў яго, але калі мне споўнілася 21 год, я быў здзіўлены, наколькі гэты стары чалавек за мінулыя сем гадоў паразумнеў»? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Колькасць сацыяльных груп, характар іх функцыянавання, развітасць міжгрупавых сувязей, важнасць і эфектыўнасць функцый, якія выконваюцца, — усё гэта можа сведчыць пра характарыстыкі таго або іншага грамадства.**

1. На сваім прыкладзе канкрэтызуйце, членам якіх сацыяльных супольнасцей можа з'яўляцца чалавек.
2. Апішыце мастацтва як сацыяльны інстытут (з характарыстыкай яго элементаў: сфера дзейнасці, суб'екты, сродкі).
3. Прасачыце ўзаемасувязь розных сфер грамадскага жыцця ў наступнай сітуацыі: дзяржава выдаткавала фінансаванне на рэстаўрацыю сярэднявечнага замка. ■




Выканайце міні-праект «Ці лёгка быць маладым?». На якія пытанні і тэмы, што хвалююць маладых людзей, вы знялі б сёння фільм (запісалі падкаст, відэа) пад назвай «Ці лёгка быць маладым?»? Параўнайце свой выбар з тэмамі, якія падымаліся ў дакументальным фільме «Ці лёгка быць маладым?» (1986 г.). Якімі сродкамі на пастары фільма перадаецца яго галоўная ідэя, мэсэдж? ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 2. Сацыяльная структура грамадства

## Грамадства: іерархія або сетка?




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце сацыяльнай структуры.** Грамадства — гэта сістэма, якая самаарганізуецца і складаецца з мноства ўзаемазвязаных сацыяльных груп. Прадстаўнікоў кожнай з груп характарызуюць агульныя інтарэсы і каштоўнасці, падобныя правілы паводзінаў і ўстойлівыя адносіны паміж членамі. Размеркаванне сацыяльных груп, сукупнасць сувязей і спосабы ўзаемадзеяння паміж імі вызначаюць **сацыяльную структуру грамадства**.

Сацыёлагі разглядаюць гарызантальную і вертыкальную структуру грамадства. У гарызантальнай структуры грамадства вылучаюць наступныя сацыяльныя групы: дэмаграфічныя (вылучаюцца паводле полу і ўзросту), этнічныя (па нацыянальнасці), канфесійныя (па рэлігійнай прыналежнасці), пасяленчыя (па месцы жыхарства), прафесійныя (паводле роду заняткаў) і інш.

**Сацыяльная структура**

**Дэмаграфічная**
- Мужчыны і жанчыны
- Узроставыя групы
- Працаздольнае і непрацаздольнае насельніцтва і да т. п.

**Этнічная**
- Родаплемянныя супольнасці
- Народнасці
- Нацыі

**Канфесійная**

Размеркаванне па рэлігіях і канфесіях

**Прафесійная**

Прафесійныя групы

**Пасяленчая**
- Гарадское насельніцтва
- Сельскае насельніцтва

На падставе даных перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь 2019 г. складзіце дыяграмы дэмаграфічнай, этнічнай, пасяленчай структуры беларускага грамадства. ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кожны чалавек адначасова з'яўляецца членам розных сацыяльных груп. Напрыклад: жанчына, беларуска, жыхарка аграгарадка, па прафесіі ветэрынар.

У вертыкальнай структуры грамадства адрозніваюць сацыяльныя групы ў залежнасці ад наяўнасці ў людзей уласнасці і даходу, валодання ўладай, узроўню адукацыі, прэстыжнасці пазіцыі, якую яны займаюць. Калі кажуць пра сацыяльную структуру таго ці іншага грамадства, перш за ўсё маюць на ўвазе сацыяльна-класавую структуру.

**Сацыяльныя класы.** У адпаведнасці з класавым падыходам у вертыкальнай арганізацыі грамадства вылучаюць грамадскія класы. **Класы** ўяўляюць сабой вялікія сацыяльныя групы, розныя па іх месцы і ролі ў сістэме вытворчасці і размеркавання даброт, а таксама — па адноснай долі спажываных даброт.

Нямецкі філосаф і эканаміст Карл Маркс у 1860-я гг. даследаваў заканамернасці развіцця чалавечай цывілізацыі і звяртаў асаблівую ўвагу на супярэчнасці паміж класамі, якія, на яго думку, рухаюць развіццём грамадства. ■

Успомніце, якія асноўныя класы вылучаюцца ў рабаўладальніцкім, феадальным, капіталістычным грамадстве. ■

Згодна з канцэпцыяй К. Маркса, класавыя інтарэсы процілеглыя і непрымірымыя, таму сацыялістычная рэвалюцыя заканамерна прывядзе да пабудовы новага, бяскласавага грамадства, у якім будуць знішчаны сацыяльныя няроўнасці. Магчыма, дзякуючы менавіта гэтай навукова абгрунтаванай перасцярозе сцэнарый сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі не быў рэалізаваны, бо пасля ўсведамлення рэальнасці будучых рызык сталі распрацоўвацца і ўкараняцца механізмы скарачэння сацыяльнай няроўнасці (праз супрацоўніцтва працадаўцаў з прафсаюзамі, прыцягненне працаўнікоў да ўдзелу ў кіраванні кампаній

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

за кошт акцыянавання, стымуляванне прафесійнага і кар’ернага росту работнікаў і інш.). Вопыт развітых краін паказаў, што вырашаць праблемы сацыяльнай няроўнасці можна нерэвалюцыйным шляхам.

У сацыяльна-класавай структуры сучаснага грамадства прынята вылучаць тры асноўныя сацыяльныя класы: вышэйшы, сярэдні і ніжэйшы.

*Вышэйшы клас* складаюць найбольш багатыя і ўплывовыя людзі (іх колькасць звычайна невялікая), якія валодаюць значнай уласнасцю і вялікім капіталам. Як правіла, менавіта яны аказваюць вырашальны ўплыў на эканоміку і палітыку.

*Сярэдні клас* вызначаецца як сацыяльная група, прадстаўнікі якой маюць устойлівыя даходы, дастатковыя для задавальнення шырокага кола матэрыяльных і сацыяльных патрэб.

Да *ніжэйшага класа* вучоныя адносяць работнікаў, занятых некваліфікаванай працай, найбольш бедных членаў грамадства. Ніжэй за дадзены клас размяшчаюцца людзі, якія апынуліся за межамі ўмоў і норм жыцця, прынятых у грамадстве (валацугі, беспрытульныя, наркаманы, злачынцы).

У развітых краінах большую частку насельніцтва ў наш час складае сярэдні клас. Яго прадстаўнікі фарміруюць і выказваюць грамадскую думку, з’яўляюцца гарантам сацыяльнай стабільнасці.

Колькасныя суадносіны прадстаўнікоў трох класаў адрозніваюцца ў розных краінах, аднак агульнай тэндэнцыяй з’яўляецца імкненне да павышэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва, павелічэнне колькасці прадстаўнікоў сярэдняга класа. Наяўнасць вялікай колькасці матэрыяльна забяспечаных людзей дазваляе развесці два процілеглыя «полюсы» (багатых і бедных), аслабіць сацыяльныя супярэчнасці і захаваць стабільнасць у грамадстве.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне




На ілюстрацыі прадстаўлены асноўныя характарыстыкі сярэдняга класа ў заходнім грамадстве.

Якія з дадзеных характарыстык з'яўляюцца актуальнымі для сучаснага беларускага грамадства?

Складзіце пералік прымет, якія могуць характарызаваць прыналежнасць да сярэдняга класа ў Беларусі. ■

**Сацыяльныя страты.** Нароўні з сацыяльнымі класамі да вялікіх сацыяльных груп адносяць таксама **сацыяльныя страты** (слаі). Тэрмін «страта» (лац. *stratum* — слой) быў запазычаны сацыёлагамі з геалогіі, дзе страты абазначаюць слаі розных парод, размешчаныя па вертыкалі. Стратавы «зрэз» грамадства дазваляе дапоўніць класавы «зрэз», зроблены на падставе пераважна эканамічных крытэрыяў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Расійска-амерыканскі сацыёлаг Пічірым Сарокін ў першай палове XX ст. абгрунтаваў крытэрыі прыналежнасці людзей да той ці іншай страты. Ён вылучыў тры асноўныя крытэрыі: эканамічны (даход і багацце), палітычны (улада і ўплыў), прафесійны (майстэрства, прафесійныя навыкі). ■

**У сучаснай сацыялогіі вылучаюцца чатыры асноўныя параметры для выдзялення страт: даход, улада, адукацыя, прэстыж. *Прэстыж* — гэта ацэнка ў грамадскай думцы той ці іншай прафесіі, пасады, роду заняткаў чалавека, сацыяльнай прывабнасці той ці іншай пазіцыі.**

Выберыце на графіку лінію пэўнага колеру і апішыце па дадзеных крытэрыях умоўнага чалавека. Прывядзіце гістарычныя і сучасныя прыклады:
- прэстыжных і непрэстыжных прафесій, якія дазваляюць атрымліваць высокія даходы;
- паспяховай і няўдалай кар'еры неадукаваных людзей;
- уплывовых людзей, якія не маюць высокіх даходаў.

Абмяркуйце іх. ■




**Сучаснае грамадства ўяўляе сабой складанае ўтварэнне і характарызуецца наяўнасцю ў ім розных класаў, слаёў.**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Суадносіны сацыяльных слаёў, класаў у грамадстве можна прадставіць графічна. Піраміда і ромб ілюструюць розныя мадэлі сацыяльнай структуры грамадства.

Якая мадэль характэрная для сучаснага грамадства? Абгрунтуйце сваю думку. ■




Даход, улада, адукацыя і прэстыж вызначаюць месца і становішча чалавека ў грамадстве. Аднак людзі знаходзяцца ў пастаянным руху, а грамадства — у развіцці. Сацыяльныя перамяшчэнні людзей з адной групы ў другую адбываюцца як са зменай іх становішча ў грамадстве (напрыклад, педагог зрабіў кар'еру — стаў міністрам адукацыі), так і на сваім узроўні (напрыклад, урач-стаматолаг змяніў месца жыхарства — пераехаў у іншы горад). Чалавек можа перамяшчацца па сацыяльнай лесвіцы не толькі індывідуальна, незалежна ад іншых людзей, але і разам са сваёй групай. Для таго каб мець больш поўнае ўяўленне пра сацыяльную структуру грамадства (як вертыкальную, так і гарызантальную) і сацыяльныя працэсы, неабходна азнаёміцца з паняццямі «сацыяльны статус», «ролі» і «мабільнасць».

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назавіце, па якіх асноўных крытэрыях вучоныя апісваюць сацыяльную структуру грамадства. Якія віды сацыяльнай структуры з'яўляюцца найбольш значнымі для апісання грамадства? Выкарыстоўвайце ўводную інфаграфіку.
2. Апішыце сацыяльную структуру грамадства, мадэль якога можна візуальна адлюстраваць у выглядзе Эйфелевай вежы. Якія класы, слаі больш шматлікія, а якія — менш?
3. Вызначце, да якога класа належыць кожны з прадстаўленых персанажаў.





Сфармулюйце прыметы, якія дазваляюць вам гэта зрабіць. Ці з'яўляюцца актуальнымі дадзеныя прыметы для сучаснага грамадства? Прывядзіце прыклады, абгрунтуйце сваю думку. ■

Выканайце міні-праект «Медыяпрофіль у сетцы». Параўнайце інфармацыю аб адным і тым жа чалавеку (публічнай персоне) у яго профілях у розных сацыяльных сетках. Праілюструйце яго прыналежнасць да розных сацыяльных груп і супольнасцей. Выкарыстоўвайце памятку для аналізу медыяпрофілю персоны. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 3. Сацыяльныя статусы, ролі і мабільнасць

## Статусам валодаюць, а ролю выконваюць?



### Пол
- Мужчына
- Жанчына

### Узрост
- Дзіця
- Дарослы
- Пажылы

### Тэрыторыя
- Мігрант
- Гараджанін
і да т. п.

### Раса
- Негроідная
- Еўрапеоідная
- Мангалоідная

### Нацыянальнасць
- Беларус/рускі/паляк/украінец/немец і да т. п.

### Здароўе
- Здаровы
- Інвалід: зрок/слых і да т. п.

### Шлюб, сям’я
- Дачка/сын
- Жонка/муж
- Маці/бацька
і да т. п.

### Палітыка
- Грамадзянін
- Выбаршчык
- Член партыі
і да т. п.

### Рэлігія
- Вернік/атэіст
- Хрысціянін/мусульманін/будыст і да т. п.
- Праваслаўны/каталік/пратэстант і да т. п.

### Эканоміка
- Вытворца/спажывец
- Работнік/наймальнік
- Беспрацоўны/заняты
і да т. п.




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сацыяльны статус.** Сацыяльныя дзеянні, што выконваюцца чалавекам, як правіла, залежаць ад яго **сацыяльнага статусу** — становішча ў грамадстве, з якім звязаны пэўны набор правоў і абавязкаў. Статус асобы вызначаецца праз пол, узрост, сямейнае становішча, нацыянальнасць, прафесію, пасаду, матэрыяльнае становішча, палітычны ўплыў і інш. Таму ў кожнага чалавека можа быць мноства сацыяльных статусаў. Сукупнасць усіх сацыяльных статусаў асобы складае яе *статусны набор*. У гэтым наборы вылучаюць наступныя асноўныя статусы: прадпісаны, набыты, змешаны, галоўны.

*Прадпісаны* (які прыпісваецца) статус — гэта статус, атрыманы носьбітам «аўтаматычна», згодна з фактарамі, якія ад яго не залежаць. Ён вызначаецца полам, расавай і нацыянальнай прыналежнасцю, узростам, сацыяльным паходжаннем і да т. п. *Набыты* (дасягнуты) статус чалавек атрымлівае дзякуючы сваім разумовым і фізічным намаганням (прафесійныя дасягненні, вучоная ступень, званне, пасада і да т. п.). *Змешаныя* сацыяльныя статусы валодаюць прыметамі прадпісаных і набытых, але дасягаюцца яны не па жаданні чалавека. Напрыклад, у выніку эканамічнага крызісу чалавек становіцца беспрацоўным.

Той статус, які сам чалавек або людзі, што знаходзяцца побач з ім, лічаць асноўным, называецца *галоўным*. Ён вызначае пераважнае становішча чалавека ў грамадстве, яго лад жыцця, кола знаёмых, манеру паводзінаў. У сучасным грамадстве гэта, як правіла, прафесійны статус. Калі гаворка ідзе пра незнаёмага чалавека, мы перш за ўсё цікавімся: «Чым займаецца гэты чалавек? Кім ён/яна працуе?»

*Асабісты* статус праяўляецца на ўзроўні малой сацыяльнай групы, напрыклад сям’і, школьнага класа, кола блізкіх сяброў, сваякоў. У малой групе статус чалавека вызначаецца асабістымі якасцямі і рысамі характару, аўтарытэтам, якім ён карыстаецца сярод іншых людзей.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Групавы* статус характарызуе індывіда як члена вялікай сацыяльнай групы ў якасці, напрыклад, прадстаўніка нацыі, канфесіі, прафесіі, узроставай або гендарнай групы.

**Сацыяльныя статус і ролі асобы**

| Мужчына | | Жанчына |
|---|---|---|
| 28 гадоў<br>Беларус<br>Сын<br>Муж<br>Бацька<br>Сябар<br>Сусед<br>Аспірант<br>Вадзіцель<br>Спартсмен<br>Кліент банка |  | 23 гады<br>Беларуска<br>Дачка<br>Жонка<br>Маці<br>Сястра<br>Цётка<br>Сяброўка<br>Рэжысёр<br>Акцыянер<br>Альпіністка |

Вызначце, членам якіх сацыяльных груп з'яўляецца кожны з апісаных персанажаў, якімі статусамі ён валодае і якія ролі выконвае. Працягніце прапанаваны спіс іншымі магчымымі статусамі і ролямі для кожнага персанажа. ■

**Сацыяльныя ролі.** Займаючы тое ці іншае становішча ў грамадстве, чалавек валодае пэўнымі правамі і абавязкамі, павінен выконваць пэўную сукупнасць дзеянняў. Узор паводзінаў, якія грамадства прызнае мэтазгодным для ўладальніка дадзенага статусу, называюць **сацыяльнай роляй**. Змястоўнае адрозненне паміж сацыяльным статусам і сацыяльнай роляй заключаецца ў тым, што статусам валодаюць, а ролю выконваюць. Паколькі кожны чалавек звычайна мае шырокі набор статусаў, то і роляў у яго таксама шмат. Сукупнасць роляў, якія належаць канкрэтнаму чалавеку, называюць *ролевым наборам*. У якасці асноўных

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

у ролевым наборы асобы вылучаюць наступныя ролі: сямейна-бытавыя, прафесійныя, грамадска-палітычныя, сітуацыйныя (пешаход, пакупнік, пасажыр). Дзякуючы своечасоваму засваенню і паспяховаму выкананню людзьмі сваіх сацыяльных роляў магчыма нармальнае функцыянаванне ўсяго грамадства і самой асобы.

Сацыяльная роля разглядаецца ў двух асноўных аспектах: чакання і выканання.

*Ролевае чаканне* — гэта мадэль паводзінаў для чалавека дадзенага статусу, якую чакаюць ад яго іншыя людзі. Ролевыя чаканні ўзаемазвязаны з ролевымі патрабаваннямі, інкаш кажучы, абавязковымі і неабходнымі дзеяннямі, якія вынікаюць з ролі, прынятай асобай. Напрыклад, бацькі павінны клапаціцца пра дзяцей, блізкі сябар — дапамагаць у цяжкую хвіліну, дыспетчар — адказваць на тэлефонныя званкі і да т. п.

*Ролевае выкананне* (паводзіны) — гэта фактычныя паводзіны чалавека. Яны залежаць ад асабістых якасцей чалавека, яго перакананняў і ўстановак, ад ступені засваення ім сацыяльных норм. Калі па якіх-небудзь прычынах чалавек не выконвае дзеянняў, прадпісаных яму сацыяльнай роляй, то чаканні людзей не апраўдваюцца. У адных выпадках гэта можа выклікаць здзіўленне і грамадскае ганьбаванне, у другіх — прывесці да фармальных санкцый (напрыклад, звальнення з працы, пазбаўлення права на кіраванне аўтамабілем і да т. п.).

Пры выкананні сацыяльных роляў могуць узнікнуць цяжкасці, звязаныя з няправільнай ролевай падрыхтоўкай, няўдалым выкананнем ролі, несумяшчальнымі патрабаваннямі розных роляў, значнымі намаганнямі і часовымі выдаткамі для выканання ролевых прадпісанняў.

Цяжкасці могуць прывесці да ролевага канфлікту. Напрыклад, не кожны чалавек можа адначасова спраўляцца з выкананнем прафесійных, дамашніх (вядзенне побыту) і сямейных абавязкаў, паспяхова сумяшчаць пабудову кар'еры і клопат пра сям'ю.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне







Вызначце найбольш частыя ролевыя канфлікты, характэрныя для старшакласнікаў, і сфармулюйце эфектыўныя стратэгіі іх пераадолення.

Для таго каб пазбегнуць праблем, неабходны спецыяльныя намаганні па аптымальным камбінаванні сваіх роляў. У працэсе сацыялізацыі чалавек навучаецца выкананню розных роляў і вырашэнню ролевых канфліктаў.

**Сацыяльная мабільнасць.** Адной з адметных рыс сацыяльнага развіцця сучаснага грамадства з'яўляецца магчымасць кожнага індывіда дасягнуць поспеху і падняцца вышэй па прыступках сацыяльнай лесвіцы. У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра **сацыяльную мабільнасць** — змену індывідам або групай сваёй пазіцыі ў сацыяльнай структуры.

Паняцце «сацыяльная мабільнасць» было ўведзена ў навуковы ўжытак у 1920-я гады Піцірымам Сарокіным.

Вучоны лічыў, што грамадства — гэта велізарная сацыяльная прастора, у якой людзі перамяшчаюцца як рэальна, так і ўмоўна, у меркаваннях навакольных і сваім уласным. Па кірунках сацыяльных перамяшчэнняў вучоны вылучыў два асноўныя тыпы мабільнасці: вертыкальную і гарызантальную.

*Вертыкальная* мабільнасць прадугледжвае перамяшчэнне ўверх або ўніз па прыступках сацыяльнай лесвіцы, якое прыводзіць да павышэння ці паніжэння сацыяльнага статусу індывіда. У залежнасці ад кірунку перамяшчэння вертыкальная мабільнасць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

можа быць узыходнай (сацыяльны пад'ём) або сыходнай (сацыяльнае падзенне). Як правіла, узыходжанне — з'ява добраахвотная, а сыходжанне — прымусовая ці вымушаная (напрыклад, паніжэнне ў пасадзе чыноўніка або разарэнне бізнесмена).

*Гарызантальная* мабільнасць уяўляе сабой перамяшчэнне ад адной сацыяльнай пазіцыі да другой, якая знаходзіцца на тым жа ўзроўні (напрыклад, пераход на іншае месца працы ў той жа пасадзе, пераход у іншую рэлігійную абшчыну, змена грамадзянства або змена адной прафесіі на другую, якая мае ў грамадстве такі самы статус).



*Марк Шагал. Вянчанне. 1918 г.*



*Васіль Пукіраў. Няроўны шлюб. 1862 г.*

Вызначце, прыкладам якой мабільнасці з'яўляецца ўступленне чалавека ў шлюб. ■

На вертыкальную і гарызантальную мабільнасць уплываюць розныя фактары — пол, узрост, узровень нараджальнасці і смяротнасці ў краіне, шчыльнасць насельніцтва. Моладзь звычайна больш мабільная, чым людзі старэйшага ўзросту, а мужчыны, як правіла, больш мабільныя, чым жанчыны. Таксама існуе закана-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

мернасць, што ў людзей, якія знаходзяцца на больш высокіх пазіцыях сацыяльнай лесвіцы, звычайна менш дзяцей, чым у прадстаўнікоў ніжэйшых слаёў. Такім чынам, нават калі дзеці багатых і паспяховых людзей ідуць услед за сваімі бацькамі, у верхніх слаях грамадства ўсё роўна ўзнікаюць вольныя месцы, якія запаўняюць выхадцы з больш нізкіх слаёў.

Шляхі, па якіх адбываецца перамяшчэнне людзей з адных сацыяльных груп у другія, называюць *каналамі сацыяльнай мабільнасці*.



На падставе прыведзенай вывы вызначце, якое паняцце выкарыстоўваецца ў якасці сінанімічнага для паняцця «канал сацыяльнай мабільнасці».

Асноўнымі каналамі сацыяльнай мабільнасці з'яўляюцца:
- армія;
- рэлігійныя арганізацыі;
- школа (адукацыя) і навука;
- палітычная або грамадская дзейнасць;
- мастацтва;
- сродкі масавай інфармацыі;
- назапашванне багацця, валоданне ўласнасцю;
- сям'я і шлюб.

Якія каналы лепш за ўсё «працавалі» ў мінулым, а якія з'яўляюцца найбольш значнымі ў сучаснасці? ■

Высвятліце, якія тры каналы сацыяльнай мабільнасці П. Сарокін лічыў асноўнымі, разглядаючы гісторыю розных грамадстваў. Вызначце, ці ўсе з гэтых каналаў захавалі значэнне ў нашы дні. Якія сучасныя каналы сацыяльнай мабільнасці вы можаце назваць у дадатак да прыведзеных? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сацыёлагі вылучаюць індывідуальную і групавую мабільнасць. *Індывідуальная* мабільнасць азначае сацыяльнае перамяшчэнне канкрэтнага чалавека. *Групавая* мабільнасць прадугледжвае, што перамяшчэнне здзяйсняецца калектыўна і цэлыя класы, сацыяльныя слаі змяняюць свой статус. Так здараецца ў перыяды кардынальных змен у грамадстве — сацыяльных рэвалюцый, грамадзянскіх ці міждзяржаўных войнаў, дзяржаўных пераваротаў і да т. п.

У сучасным грамадстве працэсы сацыяльнай мабільнасці працякаюць вельмі актыўна. Адбываюцца пераўтварэнні ў эканоміцы, пастаянна ўдасканальваюцца тэхналогіі, знікаюць старыя і з'яўляюцца новыя прафесіі. Пастаянна ўзрастае роля адукацыі. Сёння кожны чалавек павінен быць гатовы вучыцца на працягу ўсяго жыцця, асвойваць новыя заняткі, пастаянна павышаць кваліфікацыю, каб быць запатрабаваным на рынку працы і ў грамадскім жыцці.

Праходзячы стадыю сацыялізацыі ў такіх умовах жыццядзейнасці грамадства, лепш як мага раней вызначыцца са сваёй жыццёвай стратэгіяй і сканцэнтравацца на яе рэалізацыі.

*Жыццёвая стратэгія* — гэта асноўная лінія жыцця, абраная індывідам свядома, зыходзячы з яго ўяўленняў пра сэнс жыцця, каштоўнасцей і вобраза будучыні, а таксама з ацэнкі сваіх рэсурсаў і патэнцыялу. Гэта ўменне размяркоўваць свой час, энергію і рэсурсы дзеля дасягнення пастаўленай мэты. І нават у выпадку поспеху пастаянна карэкціраваць абраны курс.

Як дадзеная візуалізацыя адлюстроўвае жыццёвую стратэгію яе аўтара? Намалюйце плакат з уласнай жыццёвай стратэгіяй. ■



Па ступені і формах актыўнасці ў адносінах да сацыяльнага асяроддзя можна вылучыць: прыстасаванства, ізаляцыянізм (аўтанамізм), актывізм (можа быць накіраваны на развіццё сістэмы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

або яе злом, радыкальную перабудову). Адна жыццёвая стратэгія можа быць асноўнай на працягу ўсяго жыцця, але часцей бывае, што стратэгія змяняецца.

Фарміраванне жыццёвай стратэгіі асобы адбываецца ў юнацтве. У сучасным грамадстве на фарміраванне жыццёвых стратэгій моладзі ўплываюць:

- змена ўстаноўкі ад дзяржаўнай апекі да прыярытэту асабістых намаганняў для дасягнення поспеху;
- рацыяналізацыя сістэмы каштоўнасцей, зніжэнне ўплыву ідэалагічных мэт і сродкаў, далёкіх ад уласных запатрабаванняў індывідаў;
- пераход да пераважна рынкавых адносін, развіцця прыватнага прадпрымальніцтва;
- атрыманне вышэйшай адукацыі, калі практычна ўвесь перыяд сацыялізацыі прыпадае на перыяд навучання.

У цэлым адметнай сацыяльнай якасцю маладых людзей з’яўляецца аптымізм і больш гнуткая рэакцыя на сацыяльныя змены, высокая інфармаванасць аб працэсах у навуцы, тэхніцы, сацыяльным жыцці, дынамічнае авалоданне сучаснымі тэхналогіямі і ўключэнне ў сусветную інфармацыйную прастору.

Сучасны свет зменлівы, складаны і непрадказальны, хутка змяняе сацыяльныя статусы і ролі людзей. Паскараецца тэмп жыцця, узнікае вялікае жаданне чалавека хутка дасягнуць поспеху, падняцца вышэй па прыступках сацыяльнай лесвіцы ў адпаведнасці з абранай жыццёвай стратэгіяй, сваім уяўленнем пра сэнс жыцця, прыярытэтнымі каштоўнасцямі і вобразам будучыні.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

?

1. Канкрэтызуйце прыкладамі ўсе названыя ў тэксце віды сацыяльных статусаў чалавека (на сваім прыкладзе, на прыкладзе сваіх бацькоў).
2. Прывядзіце прыклады санкцый (з літаратуры, гісторыі), што прымяняліся да людзей, дзеянні якіх не адпавядалі ролевым патрабаванням і чаканням.
3. Прывядзіце канкрэтныя прыклады, каб адначасова назіралася:
   а) асабістая, гарызантальная мабільнасць;
   б) групавая, гарызантальная мабільнасць;
   в) асабістая, вертыкальная мабільнасць;
   г) групавая, вертыкальная мабільнасць.
4. Сярод жыццёвых стратэгій можна знайсці такія, як *«выйсці замуж за прынца...», «выйграць у латарэю мільён...»*. Сфармулюйце канструктыўныя жыццёвыя стратэгіі, звязаныя з працай, самарэалізацыяй, стварэннем сям'і, падарожжамі і да т. п. ■

Выканайце міні-праект «Сацыяльная мабільнасць па сямейных фотаздымках». Па здымках з сямейнага архіва прасачыце, як здзяйснялася гарызантальная і вертыкальная мабільнасць вашых сваякоў. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 4. Сацыяльная камунікацыя




**Паняцце сацыяльнай камунікацыі.** Тэрмін «камунікацыя» (лац. *communicatio* — паведамленне, перадача) даўно ўвайшоў у паўсядзённы ўжытак і шырока прымяняецца ў розных сферах жыцця. Напрыклад, калі гавораць пра сістэму транспартных зносін, выкарыстоўваюць словазлучэнне «транспартная камунікацыя»; калі гаворка ідзе пра сістэму вода- і цеплазабеспячэння — словазлучэнне «інжынерныя камунікацыі». Такіх прыкладаў можна прывесці вельмі многа, але ва ўсіх выпадках агульнай прыметай выступае пэўная сістэма зносін (транспартная, камунальная) або перадача (распаўсюджанне) чаго-небудзь (вады, цяпла, электрычнасці і да т. п.).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асаблівае значэнне ў грамадскім жыцці мае паняцце **сацыяльнай камунікацыі**, якая часцей за ўсё трактуецца як працэс узаемадзеяння паміж суб'ектамі (індывідамі, групамі, арганізацыямі і да т. п.) з мэтай перадачы ці абмену інфармацыяй. Такім чынам, можна вылучыць галоўныя асаблівасці сацыяльнай камунікацыі. Па-першае, гэта яе ўдзельнікі, якімі выступаюць сацыяльныя суб'екты. Па-другое, гэта сам змест камунікацыі, у якасці якой выступае інфармацыя.

Лічыцца, што самае галоўнае ў сацыяльнай камунікацыі — гэта перадача інфармацыі. Аднак часта сапраўдная мэта камунікацыі заключаецца не ў тым, каб падзяліцца якімі-небудзь звесткамі, а ў тым, каб пераканаць іншага чалавека ў справядлівасці сваёй пазіцыі і (або) заахвоціць яго да пэўнага ўчынку. На гэта, напрыклад, накіравана сучасная рэклама. З фармальнага боку, рэклама неабходна для таго, каб праінфармаваць спажыўца аб выпуску новай прадукцыі. Аднак у рэальнасці змест большасці рэкламных ролікаў мала падобны на простае інфармаванне спажыўцоў. Спецыялісты ў галіне рэкламы выкарыстоўваюць разнастайныя прыёмы, каб выклікаць у мэтавай аўдыторыі жаданне набыць тавар пэўнай маркі. Пры гэтым далёка не заўсёды асноўны змест рэкламы наогул звязаны з якімі-небудзь аб'ектыўнымі перавагамі прадукцыі.

У залежнасці ад мэты вылучаюць рэкламу, якая:

- інфармуе;
- пераконвае;
- нагадвае.




Вызначце, да якога віду рэкламы можна аднесці прапанаваны малюнак. Сфармулюйце, чаму ў вучэбным дапаможніку ў якасці прыкладу размешчана сацыяльная рэклама, а не камерцыйная. Знайдзіце прыклады камерцыйнай рэкламы розных відаў. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Структура сацыяльнай камунікацыі.

Адным з першых, хто заняўся пытаннем даследавання сацыяльнай камунікацыі, быў амерыканскі палітолаг Гаральд Ласуэл. У 1940-я гг. вучоны прадставіў мадэль камунікацыі.

У найбольш простым выглядзе ў любой сацыяльнай камунікацыі можна вылучыць пяць універсальных элементаў. Для гэтага неабходна адказаць на пяць пытанняў:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Хто? (перадае паведамленне) | Камунікатар |
| 2 | Што? (перадаецца) | Паведамленне (тэкст) |
| 3 | Як? (ажыццяўляецца перадача) | Канал |
| 4 | Каму? (накіравана паведамленне) | Аўдыторыя |
| 5 | З якім эфектам? | Зваротная сувязь |

Можна сказаць, што пяць пералічаных элементаў характарызуюць знешні бок сацыяльнай камунікацыі. Напрыклад, можна разгледзець камунікацыю на школьным уроку, на якім тлумачыцца новая тэма. У якасці камунікатара будзе выступаць настаўнік, а ў якасці аўдыторыі — вучні. Камунікатар перадае аўдыторыі паведамленне, інакш кажучы, змест новай тэмы. Перадача паведамлення ажыццяўляецца ў вуснай форме пры непасрэдным візуальным кантакце. Эфектыўнасць камунікацыі ў дадзеным выпадку можа вызначацца з дапамогай невялікага вуснага апытання аўдыторыі ці практычных заданняў па новай тэме.

Разам з тым пры аналізе сацыяльнай камунікацыі неабходна ўлічваць і ўнутраныя складнікі дадзенага працэсу, да якіх належаць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**матывацыя ўдзельнікаў камунікацыі, выкарыстанне ўсімі ўдзельнікамі працэсу адных і тых жа знакавых сістэм, разуменне кантэксту сацыяльнай камунікацыі. Адно і тое ж паведамленне можа мець рознае значэнне ў залежнасці ад кантэксту камунікацыі.**

Растлумачце з дапамогай схемы мадэлі камунікацыі, ці можа быць розным сэнс аднаго і таго ж паведамлення ў залежнасці ад яго адрасата (аўдыторыі). Напрыклад, параўнайце паведамленне «Немаўляты паспяхова нарадзіліся» — як SMS бабулі нованароджаных ад іх бацькі, як публікацыя ў прэсе аб нараджэнні блізнятак у сям'і знакамітасцей, як зашыфраванае паведамленне па сакрэтным урадавым канале. ■

**Віды сацыяльнай камунікацыі.** **У навуковай літаратуры вылучаецца мноства падыходаў да класіфікацыі сацыяльнай камунікацыі, што адлюстроўвае шматаспектнасць дадзенага працэсу.**

Паняцце «сацыяльная камунікацыя» часта разглядаецца як сінонім паняцця «зносіны». Успомніце, якія формы зносін вам ужо вядомы. ■

**Сацыяльная камунікацыя**

| Па суб'ектах | Па спосабе наладжвання кантакту | Па спосабе трансляцыі |
|---|---|---|
| **Міжасобасная** | **Непасрэдная** | **Вербальная** (выкарыстоўвае маўленне, мову): вусная і пісьмовая |
| **Міжгрупавая** | **Апасродкаваная** (з дапамогай сродкаў сувязі) | **Невербальная** (пастава, жэсты, міміка, інтанацыя) |
| **Масавая** | | |

Вызначце, да якіх відаў адносіцца ваша камунікацыя з настаўнікам і іншымі вучнямі ў класе на ўроку грамадазнаўства. ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Да якіх відаў належыць прадстаўленая на фотаздымку камунікацыя?

Сфармулюйце аргументы на карысць сцвярджэння, што сучасныя сродкі сувязі ў значнай ступені сціраюць межы паміж непасрэднай і апасродкаванай камунікацыяй. ■

**У залежнасці ад характарыстыкі суб'ектаў, як правіла, вылучаюць міжасобасную, міжгрупавую і масавую камунікацыю. Міжасобасная камунікацыя рэалізуецца паміж двума або некалькімі індывідамі. У межах міжгрупавой камунікацыі патокі інфармацыі цыркулююць паміж дзвюма або некалькімі сацыяльнымі групамі ці арганізацыямі з мэтай ажыццяўлення сумеснай дзейнасці альбо супрацьдзеяння адзін аднаму. Вялікае значэнне сёння мае масавая камунікацыя — працэс распаўсюджвання інфармацыі з дапамогай тэхнічных сродкаў на вялікія і разгрупаваныя аўдыторыі.**

**Масавая камунікацыя. Вучоныя лічаць, што вынаходства і распаўсюджванне пісьменнасці, кнігадрукавання, электронных прылад змянялі не толькі спосабы апрацоўкі і перадачы інфармацыі, але і сістэму каштоўнасцей, уклад жыцця людзей.**

Перыядызацыя гістарычнага працэсу, на думку канадскага філосафа другой паловы XX ст. Маршала Маклюэна, выглядае наступным чынам: першай была эпоха *чалавека, які слухае*, — племяннога індывіда з перавагай вуснага маўлення як сродку камунікацыі. Вынаходства алфавіта, а потым і кнігадрукавання стварыла *чалавека, які глядзіць*. Ён жыў у другую эпоху — эпоху індустрыяльнага індывіда з перавагай друкаванага слова над вусным маўленнем. Трэцюю (сучасную) эпоху прадстаўляе *чалавек, які слухае і глядзіць*, — індывід, што існуе ва ўмовах электроннай (аўдыёвізуальнай) камунікацыі. Сучасны свет уяўляе сабой «глабальную вёску», дзе магчыма імгненная перадача паведамленняў з адной часткі свету ў другую і дзе ўсе пра ўсіх усё ведаюць. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сродкі масавай камунікацыі інакш называюць *медыя* (ад лац. *media* — сродкі, пасрэднікі).

Што адносяць да медыя? Якія «старыя» і «новыя» медыя вы ведаеце? Чаму культуру сучаснага грамадства прынята называць медыякультурай? ■

Масавая камунікацыя адыгрывае значную ролю ў сучасным грамадстве, што звязана з яе ўплывам на фарміраванне грамадскай думкі. Пры гэтым для яе характэрны шэраг асаблівасцей камунікатара і аўдыторыі. Камунікатар у дадзеным выпадку набывае «калектыўны» характар, паколькі яго ролю выконвае не асобны індывід, а пэўная сацыяльная група. У падрыхтоўцы паведамленняў бярэ ўдзел мноства спецыялістаў (ад грымёра да эксперта ў галіне грамадскай думкі). У выніку «чалавек у кадры» часцей за ўсё толькі транслюе матэрыял, загадзя падрыхтаваны іншымі людзьмі.

**Навіна — факт ці фэйк?**

Навіной становіцца падзея, якая ўяўляе сабой актуальны факт, выклікае грамадскі інтарэс і можа зацікавіць шырокую аўдыторыю, інакш кажучы, тыповага спажыўца канкрэтнага медыя. Існуюць вядомыя правілы стварэння навін. ■

## Правілы стварэння навін

**Пытанні, на якія павінна адказваць навіна** **5W + H**

1. **Што?** (What?)
2. **Хто?** (Who?)
3. **Калі?** (When?)
4. **Дзе?** (Where?)
5. **Чаму?** (Why?)
6. **Як?** (How?)


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прачытайце (паглядзіце, паслухайце) навіну аб адной і той жа падзеі на розных каналах (радыё, тэлебачанне, друк, інтэрнэт-выданні, сацыяльныя сеткі). Параўнайце, чым адрозніваецца падача навін на розных каналах. Якія загалоўкі выкарыстоўваюцца? Які сэнс надаецца паведамленню? Запоўніце табліцу з пытаннямі, на якія адказвае навіна. ■

| Назва навіны | Што? | Хто? | Калі? | Дзе? | Чаму? | Як? |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |

**У рамках масавай камунікацыі роля мэтавай аўдыторыі даволі пасіўная. Атрымальнік інфармацыі разглядаецца яе стваральнікамі як аб'ект уздзеяння. Для таго каб не стаць ахвярай падману і маніпуляцый, неабходна крытычна адносіцца да інфармацыі ў медыя, умець аддзяляць факты ад думак і ацэнак, выяўляць фэйкі.**

1. На перапынку адзін вучань расказвае некалькім аднакласнікам пра хакейны матч, які ён наведаў учора ў якасці балельшчыка, і запрашае іх схадзіць разам з ім на наступны матч. Складзіце структурную схему сацыяльнай камунікацыі для апісання сітуацыі. Класіфікуйце, якія віды сацыяльнай камунікацыі прадстаўлены ў дадзенай сітуацыі.
2. Сфармулюйце асаблівасці масавай камунікацыі ў сучасным грамадстве.
3. Аргументуйце з прыцягненнем статыстычных даных, які сродак масавай камунікацыі з'яўляецца найбольш распаўсюджаным, займае галоўныя пазіцыі ў грамадстве.
4. Прааналізуйце актуальную навіну, якая выклікала шырокі грамадскі рэзананс. ■

Выканайце міні-праект «Лаві фэйк» па выяўленні фэйкаў у навінах у маладзёжных інтэрнэт-супольнасцях. Выкарыстайце памятку па выяўленні фэйкавай інфармацыі. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 5. Сацыяльныя працэсы і змяненне грамадства

## Ад чаго залежыць выбар шляху далейшага развіцця грамадства?



### Рэформа

- [ ] Гэта прадуманыя і эфектыўныя змены асобных сфер жыцця грамадства, выгадныя большасці людзей?
- [ ] Гэта мяккае паступовае ўздзеянне на грамадства?



### Рэвалюцыя

- [ ] Гэта кардынальнае абнаўленне грамадства і шанц для многіх людзей самарэалізавацца?
- [ ] Гэта ўзрушэнні і ахвяры, якія нельга нічым апраўдаць?

Так Не

Цяжка адказаць



### Сацыяльныя працэсы

**Накіраванасць**

- Узнаўленне
- Развіццё

**Характар**

- Стыхійныя
- Свядомыя

**Змест**

- Арганізацыя
- Дэзарганізацыя
- Рэарганізацыя

### Масавыя паводзіны

- Аднатыпнасць рэакцый
- Ананімнасць удзельнікаў
- Спантаннасць дзеянняў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сацыяльны працэс і яго віды. Сацыяльны працэс** — гэта сукупнасць аднанакіраваных і паўторных сацыяльных дзеянняў, якія захоўваюць або змяняюць бягучую сітуацыю. Часам пад сацыяльным працэсам разумеюць серыю сацыяльных змен і такім чынам апісваюць сацыяльнае развіццё.

Сукупнасць сацыяльных дзеянняў можа разглядацца як сацыяльны працэс, калі валодае наступнымі ўласцівасцямі: масавы характар; мэтанакіраванасць; паўтаральнасць у часе; устойлівасць (ёсць прычынна-выніковая сувязь этапаў); характар і змест (самадзейнасць і свядомасць удзельнікаў; сацыяльны характар дзеянняў, матываў і наступстваў). Пры канкрэтным вывучэнні грамадскіх працэсаў вылучаюць яшчэ ўмовы (знешнія і ўнутраныя) і тэмпы (эвалюцыйныя ці рэвалюцыйныя) працякання працэсу.

| Эвалюцыя | Рэвалюцыя |
| --- | --- |
| Паступовыя і разам з тым істотныя змены ў грамадскім жыцці, якія адбываюцца натуральным шляхам | Рэзкі, скачкападобны пераход да якасна новага стану грамадства |

Якія грамадскі працэс характарызуе рэформа? Прывядзіце гістарычныя і сучасныя прыклады. ■

Жыццё грамадства і чалавека характарызуецца шэрагам самых разнастайных сацыяльных працэсаў. Яны могуць быць накіраваны на ўзнаўленне (захаванне сістэмы праз паўтарэнне) ці развіццё (захаванне праз новую якасць: прагрэсіўныя ці рэгрэсіўныя, рэвалюцыйныя ці эвалюцыйныя працэсы). Па змесце яны могуць выступаць працэсамі арганізацыі (стварэнне новага, упарадкаванне), дэзарганізацыі (разбурэнне існуючых правіл, структур) ці рэарганізацыі (змяненне, паляпшэнне, перабудова). Па характары могуць быць стыхійнымі (незапланаванымі) і свядомымі (запланаванымі).

Працэсы адбываюцца на розных узроўнях сацыяльнай сістэмы: асобнага індывіда, сацыяльнай групы, грамадства, чалавецтва.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Урабанізацыя — працэс узмацнення ролі гарадоў і распаўсюджвання спецыфічнай гарадской культуры і ладу жыцця ў развіцці чалавецтва.



Веласіпедызацыя — шырокае выкарыстанне веласіпеда як транспартнага сродку, развіццё велатурызму, веласіпеднага спорту.

Вызначце, як названыя працэсы ўплываюць на сацыяльную сферу жыцця грамадства, узаемаадносіны паміж людзьмі.

У чым заключаюцца працэсы інфарматызацыі і інтэрнэтызацыі ў наш час? Як яны ўплываюць на ўзаемаадносіны паміж людзьмі? Якія яшчэ характэрныя для сучаснага грамадства працэсы вы можаце назваць? ■

Многія сацыяльныя працэсы знаходзяць сваё ўвасабленне ў масавых паводзінах і сацыяльных рухах.

**Сутнасць і віды масавых паводзінаў.** Для таго каб лепш зразумець масавыя паводзіны, неабходна спачатку разабрацца, якім чынам чалавек паводзіць сябе ў натоўпе.

**Натоўп** — гэта часовае скопішча людзей, якія пры непасрэдным фізічным кантакце спантанна рэагуюць на адзін і той жа раздражняльнік падобным чынам.

Да асноўных уласцівасцей натоўпу адносяць: адсутнасць арганізацыйных і маральных норм; эмацыйна-імпульсіўную сувязь членаў натоўпу; пераймальнасць і масавы псіхоз; дэіндывідуалізацыю асобы члена натоўпу і страту асабістай адказнасці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ад натоўпу адрозніваецца *публіка* — часовы сход людзей, якія маюць падобныя чаканні якога-небудзь перажывання або цікавяцца адным і тым жа прадметам. Публіка можа быць выпадковай (зборышча) або спецыяльна сабранай (гледачы ў кіно, наведвальнікі выставы). Публіка можа лёгка перайсці ў стан натоўпу, калі пры ўзнікненні моцнага раздражняльніка прынятыя нормы паводзінаў перастаюць дзейнічаць.




*Мемарыял «Хілсбара» ў Ліверпулі (Вялікабрытанія). Прысвечаны падзеям 15 красавіка 1989 г.*



*Мемарыял «Ружы» ў Мінску. Прысвечаны падзеям 30 мая 1999 г.*

Знайдзіце дадатковую інфармацыю пра дзве гістарычныя падзеі, якім прысвечаны мемарыялы. Як перайначыўся натоўп у дадзеных падзеях, да чаго гэта прывяло і якія ўрокі атрымала грамадства праз гэтыя падзеі? Выкарыстайце памятку для работы з фотаздымкам мемарыяла, помніка. ■

Вучоныя вылучаюць розныя віды натоўпу. Выпадковы натоўп фарміруецца стыхійна, а канвенцыянальны збіраецца ў сувязі з якой-небудзь падзеяй. Экспрэсіўны натоўп выказвае эмоцыі,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

агрэсіўным — рухае злосць, прагным — сквапнасць, панічны — ахоплівае страх і інш. Незалежна ад віду натоўпу яго асноўнай уласцівасцю з'яўляецца тое, што ён лёгка ператвараецца з аднаго віду ў другі.

Як паводзіць сябе ў натоўпе:

- трапіўшы ў перапоўненую прастору, загадзя вызначце месцы, якія ў выпадку надзвычайнай сітуацыі з'явяцца самымі небяспечнымі (праходы паміж сектарамі на стадыёне, сетка, шкляныя дзверы, агароджы, перагародкі і да т. п.), і адзначце для сябе шляхі адыходу на выпадак, калі што-небудзь здарыцца;
- знаходзячыся ў натоўпе, спакойна перамяшчайцеся па ходзе яго руху; ні ў якім разе не спрабуйце ісці ў процілеглым кірунку;
- ухіляйцеся ад усяго нерухомага на шляху, не падымайце рэчы, якія ўпалі, і не чапляйцеся ні за што рукамі.

Дапоўніце правілы паводзінаў у натоўпе. Абмяркуйце, што неабходна ўлічваць для прадухілення панікі. ■

У развіцці грамадства можна прасачыць тэндэнцыю распаўсюджвання масавых з'яў. Працэсы індустрыялізацыі і ўрбанізацыі прывялі да збірання людзей у гарадах. Стандартызацыя вытворчасці і спажыванне аднатыпных тавараў, распаўсюджванне сродкаў масавай камунікацыі і масавай культуры выклікалі з'яўленне ў другой палове XIX — пачатку XX ст. мас як суб'екта сацыяльнага дзеяння.

У гэтай сувязі часам пад масавымі паводзінамі разумеюць калектыўныя паводзіны, справакаваныя ўздзеяннем сродкаў масавай камунікацыі. Масмедыя садзейнічаюць таму, што масавыя паводзіны характарызуюцца стратай індывідуальных ацэнак, аднолькавымі рэакцыямі, неўсвядомленымі матывамі.

*Масавыя паводзіны* — гэта аднатыпныя, супадаючыя формы паводзінаў вялікай колькасці людзей як вынік іх рэакцыі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

на сацыяльна істотны раздражняльнік (часцей за ўсё замах на іх інтарэсы). Асаблівасцямі масавых паводзінаў выступаюць:

- супадзенне індывідуальных стратэгій паводзінаў раз'яднаных удзельнікаў;
- ананімнасць удзельнікаў (маса заўсёды безаблічная);
- неарганізаванасць і бесструктурнасць (масавыя паводзіны па сваёй прыродзе стыхійныя, хоць магчыма «ўтаймаваць» іх і кіраваць імі).

Вызначце, у чым падабенства і адрозненне паняццяў «маса» і «натоўп». Чым адрозніваецца натоўп балельшчыкаў на стадыёне ад масы тэлегледачоў матча па ўсім свеце? ■

Масавыя паводзіны рэалізуюцца праз мноства форм: гэта могуць быць як неарганізаваныя дзеянні (распаўсюджванне плётак, масавая істэрыя, паніка, пагром, бунт), так і арганізаваныя (правядзенне дэманстрацый, дзейнасць сацыяльных рухаў).

**Сацыяльныя рухі.** Найбольш распаўсюджанай формай масавых паводзінаў можна лічыць **сацыяльныя рухі** — масавыя дзеянні, якія спрыяюць або перашкаджаюць сацыяльным зменам. Сацыяльны рух мае няпэўны ў часе цыкл, ён нестабільны, пры некаторых умовах лёгка распадаецца — у гэтым яго асноўнае адрозненне ад сацыяльнага інстытута.

У любым сацыяльным руху пры ўсіх асаблівасцях, абумоўленых спецыфікай краіны, рэгіёна, вылучаюць некалькі стадый. Спачатку ўзнікае пачуццё турботы, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні, адбываецца ломка сістэмы каштоўнасцей і звыклых норм паводзінаў. Затым пачынаецца абмеркаванне існуючага становішча, фармуляванне асноўных праблем, вылучэнне лідараў. На наступных этапах адбываецца далейшае афармленне руху (пастаноўка яго асноўных мэт і задач, стварэнне сімволікі, ідэалогіі, магчымая афіцыйная рэгістрацыя арганізацыі).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сацыяльны рух можа быць: прагрэсіўным ці рэгрэсіўным; палітычным, прафесійным, пацыфісцкім, маладзёжным, феміністкім, рэлігійным, нацыянальным, праваахоўным, экалагічным і інш. Вылучаюць таксама ўтапічныя рухі, накіраваныя на стварэнне ідэальнага грамадства.

Вызначце, якія мэты ставяць перад сабой грамадскія рухі, чые лагатыпы прадстаўлены на ілюстрацыях. ■



*Кансьюмерызм*, спажывецтва (ад англ. *consumerism*) — з'ява, якая мае некалькі значэнняў:

- рух па абароне правоў спажыўцоў;
- апісанне працэсу спажывання, які стаў характэрнай рысай сучаснага грамадства.

Вызначце, якое значэнне паняцця «кансьюмерызм» — як сацыяльнага руху ці сацыяльнага працэсу — з'яўляецца больш актуальным для сучаснага грамадства. Сфармулюйце асноўныя праблемы, звязаныя з залішнім спажываннем. ■




Мноства рухаў распадаюцца пад уплывам знешніх умоў, унутраных хібаў. Сацыяльныя рухі, якія дасягнулі сваёй мэты, ператвараюцца ў сацыяльныя інстытуты ці арганізацыі. Напрыклад, працоўны рух прывёў да ўзнікнення сацыял-дэмакратычных партый, а рух за здаровы лад жыцця спрыяе замацаванню адпаведных норм і правіл у статутах розных арганізацый (абароны правоў спажыўцоў, медыцынскіх, спартыўных і інш.).

Асаблівая роля ў працэсах змены грамадства належыць моладзі. У 2017 г. словам года па версіі Оксфардскага слоўніка



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**англійскай мовы стала паняцце *youthquake*, якое па аналогіі з землетрасеннем перакладаецца як «моладзетрасенне». Яно азначае істотную культурную, палітычную ці сацыяльную змену, якая адбылася ў выніку дзеянняў ці ўплыву маладога пакалення.**



Як гэты фотаздымак характарызуе сучасную моладзь? ■

Падчас канцэрта на рок-фэсце пад Мінскам 2 жніўня 2017 г. фатограф стаў сведкам таго, як маладыя людзі паднялі над сабой хлопца ў інваліднай калясцы. Даведайцеся, які загаловак меў артыкул у газеце з гэтай фатаграфіяй і ці стаў гэты здымак папулярным. ■

**У сучасным свеце моладзь актыўна ўдзельнічае ў сацыяльных працэсах, рэалізуе ў розных сферах праекты, накіраваныя на паляпшэнне жыцця як асобных груп людзей, так і грамадства ў цэлым.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Канкрэтызуйце прыкладамі розныя тыпы сацыяльных працэсаў.
2. Сфармулюйце розніцу паміж натоўпам і публікай. Якія фактары могуць справакаваць ператварэнне публікі ў панічны натоўп? Знайдзіце прыклады ў крыніцах інфармацыі.
3. Ахарактарызуйце (на ўласны выбар) сацыяльны працэс па наступных пазіцыях: масавы характар; мэтанакіраванасць; паўтаральнасць у часе; устойлівасць; змест. ■

Выканайце міні-праект «Супрацьлеглая ацэнка падзеі ў медыя». На падставе рэпартажаў са сродкаў масавай інфармацыі за апошні час прывядзіце прыклады разнастайных форм масавых паводзінаў у розных краінах. Як асвятляліся дадзеныя падзеі ў медыя розных краін? Прывядзіце прыклады супрацьлеглай ацэнкі адной масавай падзеі ў медыя. Чым гэта можна растлумачыць? Выкарыстайце памятку «Як аддзяліць факты ад меркаванняў у медыя». ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Сацыяльная сфера грамадства»

1. **Дайце азначэнне наступным паняццям: *грамадства, моладзь, натоўп, сацыяльнае дзеянне, сацыяльная група, сацыяльная камунікацыя, сацыяльная мабільнасць, сацыяльная роля, сацыяльная страта, сацыяльная структура грамадства, сацыяльны інстытут, сацыяльны клас, сацыяльны працэс, сацыяльны рух, сацыяльны статус*.**
2. **Апішыце грамадства як сістэму, структуру і іерархію. Якія паняцці вы будзеце выкарыстоўваць для кожнага апісання?**
3. **Канкрэтызуйце прыкладамі супольнасці, пра якія гаворыцца ў артыкуле 14 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: «Дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў».**
4. **Прачытайце фрагмент з публічнай лекцыі сучаснага пісьменніка і філосафа Умберта Эка «Ад інтэрнэту да Гутэнберга: тэкст і гіпертэкст», прачытанай у 1998 г. Як вы думаеце, ці ілюструюць дадзеныя радкі змены ў масавай камунікацыі, якія адбыліся ў выніку з'яўлення камп'ютара і інтэрнэту? Якія сацыяльныя працэсы, акрамя камунікацыі, апісаны ў дадзеным тэксце? Ці можна згадзіцца з аўтарам праз 20 гадоў пасля напісання гэтых радкоў? Аргументуйце сваё меркаванне.**

«...Часта мне здаецца, што ў бліжэйшай будучыні наша грамадства расшчэпіцца — калі ўжо не расшчапілася — на два класы: тых, хто глядзіць толькі тэлебачанне, інакш кажучы, атрымлівае гатовыя вобразы і гатовае меркаванне пра свет, без права крытычнага адбору атрыманай інфармацыі, і тых, хто глядзіць на экран камп'ютара, інакш кажучы, тых, хто здольны вылучаць і перапрацоўваць інфармацыю. Тым самым пачынаецца падзел культур, які існаваў у час Сярэднявечча: паміж тымі, хто здольны чытаць рукапісы, а значыць,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

крытычна асэнсоўваць рэлігійныя, філасофскія і навуковыя пытанні, і тымі, хто выхоўваўся выключна дзякуючы вобразам у саборы — выбраным і апрацаваным іх творцамі. Тэма для фантаста! Будучае стагоддзе, у якім пралетарская большасць карыстаецца толькі зрокавай камунікацыяй, а плануецца гэтая камунікацыя камп'ютарнай літаратурнай элітай».

**5. Прааналізуйце сітуацыю, вызначце статусы, сацыяльныя ролі герояў і механізмы змянення сацыяльнага статусу, якімі яны збіраюцца скарыстацца.**

«Сяргей і Лена пазнаёміліся на фестывалі Viva Braslav. Яна вучыцца ў 9-м класе гімназіі, ён — у 10-м класе школы. У час размовы яны даведаліся, што маюць шмат агульнага: слухаюць аднолькавую музыку, мараць здзейсніць кругасветнае падарожжа, у абаіх ёсць старэйшыя браты. Сяргей расказаў, што ў будучым плануе паступіць у лінгвістычны ўніверсітэт і стаць прафесійным перакладчыкам, а Лена прызналася, што замежная мова для яе толькі хобі. Яна хоча атрымаць вышэйшую адукацыю і стаць вядомым журналістам».

**6. Якія асноўныя сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці ў моладзі як сацыяльнай групы?**

**7. Прасачыце змены магчымасцей сацыяльнай мабільнасці для чалавека ў розныя гістарычныя эпохі ў рабаўладальніцкіх, каставых, саслоўных, класавых грамадствах.**

**8. На падставе статыстычных даных прааналізуйце сацыяльную структуру сучаснага беларускага грамадства з пункту гледжання класавага і стратыфікацыйнага падыходаў.**

**9. Знайдзіце ў інтэрнэце блог папулярнай кнігі коміксаў «Heta Belarus Dzietka!» Марты Чарновай і Марыі Чараковай. Прааналізуйце коміксы «Супержанчыны» і «Кожны — праграміст». Адкажыце на пытанні.**

- **Які з коміксаў ілюструе ролевы канфлікт?**
- **Якія стэрэатыпы, звязаныя з сацыяльнымі статутамі, ролямі і мабільнасцю, ілюструюць коміксы?**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

10. Прааналізуйце карціну «Юнацтва» з цыкла карцін «Падарожжа жыцця» (The Voyage of Life) мастака XIX ст. Томаса Коўла, прысвечанага чатыром перыядам жыцця чалавека: дзяцінству, юнацтву, сталасці і старасці. Якія асноўныя ідэі прадстаўлены аўтарам у карціне? Параўнайце дадзеную карціну з трыма іншымі карцінамі з цыкла і вызначце, якія характэрныя рысы маладосці як жыццёвага этапу яна раскрывае.



Падбярыце карціны сучасных аўтараў, з дапамогай якіх можна праілюстраваць характэрныя рысы кожнага этапу жыцця чалавека ў залежнасці ад абранай жыццёвай стратэгіі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# II Палітычная сфера грамадства

## 1 Што такое палітыка?

- Улада
- Уплыў
- Кіраванне

## 2 Як функцыянуе?

- Палітычная сістэма
- Дзяржава
- Партыйная сістэма
- Выбарчая сістэма

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Прамая і прадстаўнічая дэмакратыя
- Рэспубліка і манархія
- Федэрацыя і канфедэрацыя

## 4 Як узаемазвязаны?

- Дэмакратыя і выбары
- Грамадзянскае грамадства і прававая дзяржава
- Лідар і масы

## 5 Якія бываюць?

- Ідэалогіі
- Партыі
- Лідары

**Якую ролю палітыка адыгрывае ў жыцці грамадства?**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 6. Палітыка і яе роля ў грамадскім жыцці

**Удзельнічаць у палітычным жыцці грамадства можа і павінен кожны чалавек?**

**Палітычная сістэма**
- Інстытуты
- Ідэі
- Нормы
- Узаемадзеянне

**Функцыі сістэмы**
- Мэтавызначэнне
- Інтэграцыя
- Камунікацыя
- Рэгламентацыя
- Кантроль




**Паняцце палітыкі.** Кожны чалавек так ці інакш сутыкаецца са светам палітыкі: калі працуе, вучыцца ў школе ці ўніверсітэце, галасуе на выбарах, прыходзіць у дзяржаўную ўстанову або звяртаецца ў грамадскую арганізацыю. Аднак на пытанне «Што ж такое палітыка?» людзі, як правіла, адказваюць па-рознаму.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Паняцце «палітыка» было ўведзена старажытнагрэчаскім філосафам Арыстоцелем (IV ст. да н. э.). Менавіта ад Арыстоцеля бярэ свой пачатак традыцыя вызначаць палітыку як дзяржаўныя ці грамадскія справы.

Арыстоцель лічыў, што сучаснае жыццё людзей развіваецца ад сям'і да абшчыны, а ад абшчыны да дзяржавы (у Старажытнай Грэцыі дзяржавы называліся полісамі). Дзяржава становіцца формай сумеснага жыцця людзей. Таму галоўная задача палітыкі ў тым, каб знайсці лепшыя спосабы кіравання дзяржавай.

У канцы XIX — пачатку XX ст. пачала складвацца асаблівая навука *палітапогія* (у перакладзе з грэч. *πολιτικός* — грамадскія справы і *λόγος* — слова, вучэнне). Дадзеная навука вылучыла веды пра палітыку ў асобны прадмет, стала глыбока вывучаць палітыку як асаблівую сферу дзейнасці ў грамадстве.

**Палітыка** — гэта сфера грамадскіх стасункаў і дзейнасць, накіраваная на заваяванне дзяржаўнай улады і яе рэальнае ажыццяўленне. Яна ўключае ў сябе барацьбу за ўладу паміж рознымі сацыяльнымі групамі, якія маюць уласныя мэты і інтарэсы, а таксама дзейнасць па арганізацыі і змене ўладных адносін у грамадстве і дзяржаве.

У агульным сэнсе *ўладу* можна вызначыць як здольнасць і магчымасць аднаго чалавека або групы асоб ажыццяўляць сваю волю, аказваць вызначальнае ўздзеянне на паводзіны і дзейнасць людзей.

Улада як грамадскія адносіны мае пэўныя агульныя прыметы: усеагульнасць, інакш кажучы, прысутнасць ва ўсіх сферах грамадскага жыцця; здольнасць пранікаць ва ўсе віды дзейнасці, грамадскія групы, аб'ядноўваючы ці раз'ядноўваючы людзей. Адносіны ўлады ёсць і ў сям'і, і ў працоўным калектыве, і ў дзяржаве.

Найважнейшай прыметай улады з'яўляецца падпарадкаванне. Без падпарадкавання няма ўлады.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Улада абавязкова мае сваіх носьбітаў. Іх называюць суб'ектамі ўлады. *Суб'екты ўлады* — гэта носьбіты ўлады, тыя, хто рэалізуе ўладныя адносіны, ад іх зыходзяць уплыў, уздзеянне, распараджэнні, указанні, загады. Носьбіты ўлады заўсёды імкнуцца падпарадкаваць сваёй волі аб'ект (таго, на каго накіравана іх уладнае ўздзеянне). Яны дабіваюцца падпарадкавання з дапамогай разнастайных сродкаў — пераканання, аўтарытэту, прымусу.




- Хто з'яўляецца суб'ектам, а хто аб'ектам улады ў сям'і, працоўным калектыве, дзяржаве?
- Чым адрозніваюцца адносіны ўлады ў сям'і, працоўным калектыве, дзяржаве? Якія сродкі ўплыву найбольш эфектыўныя ў кожным выпадку?
- Якую ўладу можна лічыць найвышэйшай формай палітычнай улады? Чаму? ■

*Палітычная ўлада* — гэта здольнасць праводзіць сваю волю ў грамадскім жыцці з апорай на сістэму ўстаноў, арганізацый, законаў. *Дзяржаўная ўлада* непарыўна звязана з прававымі нормамі, для яе рэалізацыі ствараюцца шматлікія органы, у тым ліку па прымусе да выканання прававых прадпісанняў.

Адной з найважнейшых функцый улады з'яўляецца кіраванне. *Кіраванне* — гэта дзейнасць, накіраваная на арганізацыю і ўпарадкаванне грамадскага жыцця, а таксама дасягненне пастаўленых мэт грамадскага развіцця. Для ажыццяўлення кіраўнічай дзейнасці суб'ектам улады неабходны пэўныя рэсурсы: эканамічныя, сілавыя, культурна-інфармацыйныя і інш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Нямецкі вучоны Макс Вебер лічыў, што палітыка — гэта «імкненне да ўдзелу ва ўладзе або аказання ўплыву на размеркаванне ўлады ці паміж дзяржавамі, ці ўнутры дзяржавы паміж групамі людзей... Хто займаецца палітыкай, той імкнецца да ўлады». ■

**У сучасным грамадстве паняцце «палітыка» выкарыстоўваецца ў некалькіх асноўных значэннях.**

| Палітыка | | |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| Сфера грамадскага жыцця, у цэнтры якой знаходзяцца адносіны ўлады | Дзейнасць, звязаная з барацьбой за ўладу і аказанне ўплыву на ўладу | Асноўныя накірункі дзейнасці дзяржавы |

У якім значэнні гавораць аб знешняй і ўнутранай палітыцы? Чым адрозніваецца дзейнасць палітыка ад дзейнасці палітолага? ■

**Палітычныя эліты і лідары.** Да суб'ектаў палітычнай улады адносяцца эліты і лідары. **Палітычная эліта** (у перакладзе з франц. *élite* — лепшы, адборны) — гэта група, якая валодае рэальнай палітычнай уладай, магчымасцю ўздзейнічаць на грамадства.

Ад дзейнасці і палітычных паводзінаў эліты ў значнай ступені залежаць напрамак і ход сацыяльнага развіцця, функцыянаванне грамадства і дзяржавы. Палітычная эліта вылучаецца згуртаванасцю, агульнай воляй да дзеяння, у яе ёсць кіраўнічы вопыт, гэта найбольш творчая і прадуктыўная частка грамадства, якая валодае выразнымі здольнасцямі да кіравання.

У паліталогіі існуюць розныя варыянты класіфікацыі эліт. Вылучаюць палітычную эліту, эканамічную і ваенную, дыплама-


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

тычную, навуковую, творчую, эліту маральнага аўтарытэту (святары, філосафы, настаўнікі).




*Тытульны аркуш рамана англійскага пісьменніка Уільяма Тэкерэя «Кірмаш пыхлівасці» (1847)*

У сусветна вядомым часопісе аб развіцці масавай культуры Vanity Fair штогод публікуюцца рэйтынгі «новай эліты», якая ўплывае на чалавецтва праз палітыку, культуру, модныя трэнды і тэхналогіі. Апошнім часам выразна праяўляецца наступная тэндэнцыя: у рэйтынгу з кожным годам усё менш людзей, якія прафесійна займаюцца палітычнай дзейнасцю.

Складзіце ТОП-5 персон, якія, на ваш погляд, сёння ўваходзяць у «новую эліту». Абгрунтуйце свой выбар. Колькі ў ім маладых людзей, мужчын і жанчын? ■

Параўнайце актуальны часопісны і ўласны ТОП-5, здзейсніўшы пошук і праверку дадзенай інфармацыі. ■

**У склад палітычнай эліты ўваходзяць палітычныя лідары. *Палітычны лідар* (ад англ. *leader* — вядучы) — гэта асоба, якая аказвае пастаянны і дамінуючы ўплыў на ўсё грамадства ці на арганізацыю пры прыняцці рашэнняў і вядзе за сабой паслядоўнікаў. У лідарстве выразна праяўляецца здольнасць асобы, якая валодае ўладай, уплываць і нават змяняць сацыяльныя паводзіны іншых людзей, сацыяльных слаёў ці ўсяго грамадства, калі гаворка ідзе пра агульнанацыянальнага лідара.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Тыпы палітычнага лідарства

| | |
|---|---|
| **Паводле крыніцы ўлады** | • **Традыцыйнае**<br>Атрымлівае ўладу па традыцыі, звычаі<br>• **Легальнае**<br>Атрымлівае ўладу па законе, афіцыйна ўсталяванай норме<br>• **Харызматычнае**<br>З'яўляецца на аснове веры людзей у незвычайныя, выдатныя якасці асобы (ад грэч. *χάρισμα* — дар, асаблівая адоранасць) |
| **Паводле мэт лідара** | • **Кансерватар**<br>Захаванне грамадства ў яго існуючым стане<br>• **Рэфарматар**<br>Пераўтварэнне грамадства шляхам рэформ<br>• **Рэвалюцыянер**<br>Пераход да прынцыпова іншай грамадскай сістэмы |
| **Паводле зместу дзейнасці і іміджу** | • **Лідар-«сцяганосец»**<br>Увасабляе ў жыццё «вялікую мару», вядзе за сабой<br>• **Лідар-«служыцель»**<br>Выказвае інтарэсы сваіх прыхільнікаў, выбаршчыкаў<br>• **Лідар-«гандляр»**<br>Умее ярка прадставіць і выгадна «прадаць» выбаршчыкам свае праграмы, планы ў абмен на іх падтрымку<br>• **Лідар-«пажарны»**<br>Аператыўна рэагуе на надзённыя праблемы і абставіны, іншымі словамі, займаецца «тушэннем пажараў» |

Прывядзіце прыклады палітычных лідараў розных тыпаў з гісторыі і сучаснасці. ■

Вызначце, хто з'яўляецца аўтарамі прапанаваных тыпалогій палітычнага лідарства. ■

**Ад таго, як узаемадзейнічаюць суб'екты палітычнай улады, якія прынцыпы і характар іх узаемаадносін, у грамадстве складваецца тая ці іншая палітычная сістэма.**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Палітычная сістэма і яе функцыі. Палітычная сістэма грамадства** — гэта сукупнасць палітычных інстытутаў і арганізацый, распаўсюджаных у грамадстве ідэй, поглядаў, каштоўнасцей, а таксама палітычных і прававых норм і спосабаў узаемадзеяння паміж інстытутамі ўлады і грамадствам. Палітычная сістэма грамадства выконвае шэраг важных функцый, якія вельмі цесна звязаны паміж сабой.

**Палітычная сістэма**

| Інстытуты | Ідэі і каштоўнасці | Нормы | Спосабы ўзаемадзеяння |
|---|---|---|---|
| (дзяржава, органы ўлады, партыі і інш.) | (ідэалогіі) | (законы, традыцыі, звычаі) | паміж уладай і грамадствам |

**Функцыі**

- **Мэтавызначэнне**
  Вызначэнне асноўных мэт грамадскага і палітычнага развіцця
- **Інтэграцыя**
  Аб’яднанне грамадства для рашэння найважнейшых задач
- **Камунікацыя**
  Зносіны, абмен інфармацыяй паміж усімі элементамі палітычнай сістэмы, паміж уладай і грамадствам
- **Рэгламентацыя**
  Устанаўленне законаў, якія кіруюць жыццём грамадства, забеспячэнне выканання законаў і звязаных з імі норм
- **Кантроль**
  Ацэнка выканання рознымі людзьмі і арганізацыямі ўстаноўленых норм, законаў

Узаемадзеянне элементаў палітычнай сістэмы паказвае, як ажыццяўляецца ўлада, які характар палітычных адносін, указвае на многія палітычныя характарыстыкі дадзенай дзяржавы, напрыклад стабільнасць, аўтарытэт улады, наяўнасць або адсутнасць пратэстных груп, дэмакратычнасць.

Месца чалавека ў сістэме палітычных адносін вызначае *палітычны статус асобы*. Ён азначае рэальную здольнасць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і магчымасць чалавека праяўляць сябе ў сферы палітыкі, выбіраць і быць абраным ва ўладныя структуры, удзельнічаць у абмеркаванні і вырашэнні грамадскіх праблем.

Палітычны статус асобы праяўляецца ў разнастайнасці яе палітычных роляў: выбаршчыка, дэпутата, члена партыі і грамадскай арганізацыі, лідара, прафесійнага палітыка і да т. п. *Палітычная роля* — гэта індывідуальныя паводзіны чалавека ў сферы палітыкі згодна са сваім статусам. У рэальным жыцці не ўсе людзі ўдзельнічаюць у палітыцы, не ўсе становяцца прафесійнымі палітыкамі. Тым не менш для развіцця грамадства важна, каб грамадзяне ўдзельнічалі ў вырашэнні наспелых праблем, у выбарах. З дапамогай выбараў забяспечваецца ўдзел грамадзян у фарміраванні прадстаўнічых органаў дзяржавы.

1. Што такое палітыка? Чым адрозніваецца палітычная ўлада ад эканамічнай, ідэалагічнай і рэлігійнай?
2. Назавіце суб'ектаў палітычнага жыцця і ахарактарызуйце магчымасці ўплыву на палітыку кожнага з іх. Кім з'яўляюцца грамадзяне краіны, калі яны галасуюць на рэферэндуме, ці на выбарах у парламент, ці на выбарах прэзідэнта, — суб'ектамі ці аб'ектамі ўлады?
3. Ахарактарызуйце тып палітычнага лідарства наступных гістарычных асоб: Гедзімін, Іосіф Сталін, Эрнэста Чэ Гевара, Лізавета II, Пётр Машэраў, Марцін Лютэр Кінг. Абгрунтуйце сваю думку. ■

Стварыце плакат ці інфаграфіку на тэму «Палітычны статус і ролі асобы». ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 7. Дзяржава ў палітычнай сістэме

## Дзяржава — галоўны інстытут палітычнай сістэмы?

**Асаблівы апарат улады**

**Вяршэнства дзяржаўнай улады**

**Выданне законаў**

**Прымус (міліцыя, суд, турмы)**

**Спагнанне падаткаў і збораў**

**Форма дзяржавы**

**Тэрытарыяльнае ўладкаванне**: Унітарнае, Федэрацыя, Канфедэрацыя

**Праўленне**: Рэспубліка, Манархія

**Палітычны рэжым**: Дэмакратыя, Аўтарытарызм, Таталітарызм

**Функцыі дзяржавы**

**Эканоміка**

**Культура**

**Правапарадак**

**Абарона**

**Міжнароднае супрацоўніцтва**

**Дзяржава — асноўны палітычны інстытут.** *Палітычныя інстытуты* — гэта ўстановы або арганізацыі, якія абслугоўваюць працэс ажыццяўлення палітычнай улады, надаюць устойлівасць палітычнай сістэме. Да палітычных інстытутаў належаць дзяржава, палітычныя партыі, прафсаюзы і да т. п.

Цэнтральным інстытутам палітычнай сістэмы, яе галоўным кампанентам з’яўляецца дзяржава. Невыпадкова яе вывучэннем займаюцца некалькі гуманітарных навук — ад гісторыі і філасофіі да правазнаўства, сацыялогіі, паліталогіі, эканамічнай тэорыі. Так, у курсе гісторыі дзяржава разглядаецца ў яе канкрэтна-гістарычных праявах, а ў курсе правазнаўства — ва ўзаемасувязі з правам.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Дзяржава ўзнікла з-за неабходнасці рэгуляваць сумеснае жыццё і дзейнасць людзей.**

## Прыметы дзяржавы

**Тэрыторыя** | **Насельніцтва** | **Улада** | **Права** | **Суверэнітэт**

Успомніце азначэнні прымет дзяржавы. Ці можна лічыць іх характарыстыкай дзяржавы як палітычнага інстытута? Чаму? ■

**Дзяржава — гэта адмысловая арганізацыя ўлады, якая вылучылася з грамадства, сістэма спецыяльных органаў і службовых асоб.**

У 1651 г. выйшла кніга аб паходжанні і сутнасці дзяржавы англійскага мысліцеля Томаса Гобса пад назвай «Левіяфан, або Матэрыя, форма і ўлада дзяржавы царкоўнай і грамадзянскай». Гобс лічыў, што спыніць непазбежны стан грамадства як «вайны ўсіх супраць усіх» можа толькі грамадскі дагавор аб стварэнні дзяржавы. Грамадзяне добраахвотна абмяжоўваюць сваю свабоду, але ўзамен атрымліваюць ахову з боку дзяржавы.

Левіяфан — гэта імя міфічнай біблейскай істоты, марской пачвары. ■




Правядзіце пошук інфармацыі па запыце «Левіяфан». Які вобраз дзяржавы-Левіяфана склаўся ў сучасным грамадстве? Чым гэта можна растлумачыць? ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Як асаблівы апарат улады дзяржава характарызуецца перш за ўсё *вяршэнствам дзяржаўнай улады*. Гэта азначае, што толькі дзяржава праз свае органы выдае такія нормы, якія з'яўляюцца абавязковымі для ўсяго насельніцтва краіны. Ніякія арганізацыі ці людзі ўнутры дадзенай дзяржавы не могуць скасаваць рашэнні дзяржаўных органаў, і ніякія іншыя арганізацыі ці асобы не могуць падтрымліваць стасункі з іншымі дзяржавамі ці арганізацыямі ад імя дзяржавы, калі такое права не нададзена адмыслова. Вяршэнства дзяржаўнай улады распаўсюджваецца толькі на тэрыторыю дзяржавы і дзейнічае толькі ў яе межах.

Дзяржава як апарат улады валодае цэлым шэрагам паўнамоцтваў, якіх пазбаўлены іншыя арганізацыі на яе тэрыторыі. Таму такія правы і паўнамоцтвы называюцца *манапольнымі*.

Сярод іх:

- *права на выданне законаў* і іншых прававых актаў, абавязковых для ўсяго насельніцтва;
- *права на прымяненне прымусу*. Толькі дзяржава валодае выключным правам на яго прымяненне, і гэта права ўстаноўлена законам, інакш кажучы, з'яўляецца легальным. Для здзяйснення дадзеных паўнамоцтваў дзяржава валодае спецыяльнымі органамі і сродкамі (міліцыя, суд, турмы і да т. п.);
- *права на спагнанне падаткаў і збораў з насельніцтва*. Падаткі неабходны для забеспячэння дзяржаўнай дзейнасці, утрымання кіраўнічага апарату, выплаты пенсій, дапамог, падтрымкі бальніц, школ і да т. п. Дзяржава стварае армію, службу бяспекі і да т. п.

Такім чынам, **дзяржава** — гэта асаблівая форма арганізацыі палітычнай улады, якая валодае спецыяльным апаратам кіравання грамадствам для забеспячэння яго цэласнасці, арганізаванасці і пэўнага парадку ў ім.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Функцыі дзяржавы.** Функцыі дзяржавы найбольш часта вызначаюць як асноўныя напрамкі яе дзейнасці.

Унутраныя функцыі дзяржавы вылучаюцца згодна са сферамі жыццядзейнасці грамадства, а знешнія характарызуюць асноўныя напрамкі дзейнасці дзяржавы на міжнароднай арэне.

## Функцыі дзяржавы

| Унутраныя | Знешнія |
|---|---|
| • **Праваабарончая** Забеспячэнне законнасці і правапарадку на тэрыторыі дзяржавы<br>• **Сацыяльная** Развіццё аховы здароўя, пенсійнае забеспячэнне, вырашэнне экалагічных праблем<br>• **Эканамічная** Рэгуляванне эканамічных адносін, фарміраванне дзяржаўнага бюджэту<br>• **Культурная** Развіццё навукі і культуры, сістэмы адукацыі, ахова помнікаў, арганізацыя вольнага часу і інш. | • Забеспячэнне абароны краіны<br>• Падтрымка адносін з іншымі дзяржавамі (дыпламатыя)<br>• Супрацьдзеянне злачыннасці, гарантаванне міжнароднай бяспекі<br>• Удзел у вырашэнні глабальных праблем (экалагічных, энергетычных і інш.)<br>• Эканамічнае супрацоўніцтва з іншымі краінамі<br>• Навуковае і культурнае супрацоўніцтва з іншымі краінамі |

Хто вызначае асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы?

**Форма дзяржавы.** Для вызначэння сутнасці дзяржавы вялікае значэнне мае такое паняцце, як форма дзяржавы. *Форма дзяржавы* вызначаецца як адзінства форм кіравання, тэрытарыяльнага ўладкавання і палітычнага рэжыму.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Форма дзяржавы**

| Форма кіравання | Форма тэрытарыяльнага ўладкавання | Палітычны рэжым |
|---|---|---|
| **Манархія**<br>• Абсалютная<br>• Канстытуцыйная | **Унітарнае** | **Дэмакратычны** |
| **Рэспубліка**<br>• Прэзідэнцкая<br>• Парламенцкая<br>• Змешаная | **Федэрацыя** | **Аўтарытарны** |
| | **Канфедэрацыя** | **Таталітарны** |

Форма праўлення характарызуе арганізацыю дзяржаўнай улады, структуру і парадак узаемаадносін вышэйшых дзяржаўных органаў, службовых асоб і грамадзян. Вылучаюць дзве асноўныя формы праўлення — манархію і рэспубліку.

**Манархія** (ад грэч. *μοναρχία* — адзінаўладдзе) — гэта форма кіравання, пры якой улада засяроджана ў руках аднаасобнага кіраўніка дзяржавы. Улада манарха (караля, імператара, шаха, цара і да т. п.), як правіла, доўжыцца пажыццёва і перадаецца нашчадкам. Манархіі бываюць *неабмежаваныя (абсалютныя)* і *абмежаваныя (канстытуцыйныя)*.

Першыя ў гісторыі манархіі былі *неабмежаваныя*: улада манарха нічым і нікім не была абмежаванай, яна была абсалютнай. Манарх выступаў адзіным носьбітам суверэнітэту, валодаў шырокімі паўнамоцтвамі ў заканадаўчай, выканаўчай і судовай сферах.

У *канстытуцыйных манархіях* улада манарха абмежаваная, і гэтыя абмежаванні, як правіла, устаноўлены канстытуцыяй. Доўгі час манархіі былі асноўнай формай праўлення ў большасці дзяржаў, сёння манархія характэрна для кожнай пятай дзяржавы свету.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



*Японская імператарская сям'я, 1900 г.*



*Вяселле Кейт Мідлтан і прынца Уільяма. Вялікабрытанія, 2011 г.*

Ці можна сёння лічыць манархію перажыткам мінулага? З апорай на прапанаваныя ілюстрацыі і гістарычныя веды абмяркуйце змены, якія адбыліся з манархіямі за апошнія сто гадоў.

**Рэспубліка** (ад лац. *res* — справа і *publicus* — грамадскі) — гэта форма праўлення, пры якой вышэйшыя органы дзяржаўнай улады абіраюцца насельніцтвам. Вылучаюць тры асноўныя разнавіднасці рэспублікі — прэзідэнцкую, парламенцкую і змешаную.

*Прэзідэнцкая рэспубліка* характарызуецца значнай роляй прэзідэнта ў сістэме дзяржаўных органаў. Прэзідэнт з'яўляецца адначасова і кіраўніком дзяржавы, і кіраўніком выканаўчай улады. Ён абіраецца незалежна ад парламента або прамым галасаваннем выбаршчыкаў, або калегіяй выбаршчыкаў. Прэзідэнт сам фарміруе ўрад, які адказны перад ім.

У *парламенцкай рэспубліцы* ўрад фарміруецца парламентам і адказны перад парламентам. Кіраўнік урада (прэм'ер-міністр, канцлер) адыгрывае галоўную ролю ў дзяржаве. Прэзідэнт ажыццяўляе пераважна прадстаўнічыя і цырыманіяльныя функцыі.

У *змешанай рэспубліцы* ўрад фарміруецца прэзідэнтам і парламентам і адказны перад імі.

Дзяржавы адрозніваюцца паміж сабой і па формах тэрытарыяльнага ўладкавання. Дзяржавы бываюць *унітарныя*, *федэратыўныя*, *канфедэратыўныя*.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Унітарная дзяржава** — гэта адзіная дзяржава, якая складаецца з адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, што не валодаюць прыметамі дзяржаўнай самастойнасці ці якой-небудзь уласнай аўтаноміяй.

**Федэрацыя** — гэта саюзная дзяржава, што складаецца з суб'ектаў, якія валодаюць пэўнымі прыметамі дзяржаўнай самастойнасці. Для федэрацыі характэрна наяўнасць дзвюх сістэм дзяржаўнай улады — федэральнай і суб'ектаў федэрацыі (у розных дзяржавах яны называюцца па-рознаму: штаты, кантоны, рэспублікі, землі). Члены федэрацыі могуць мець уласныя канстытуцыі, законы.

**Канфедэрацыя** — гэта саюз юрыдычна і палітычна самастойных дзяржаўных утварэнняў, які ствараецца для дасягнення адзіных мэт і вырашэння агульных праблем.

Параўнайце формы праўлення і тэрытарыяльнага ўладкавання Беларусі і суседніх дзяржаў (Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны). Якія фактары, на ваш погляд, аказваюць уплыў на форму дзяржавы? Абгрунтуйце свой адказ. ■

*Палітычны рэжым* — гэта спосаб функцыянавання і ўзаемасувязі асноўных элементаў палітычнай сістэмы грамадства. Характарыстыка палітычнага рэжыму ў асобна ўзятай краіне паказвае прынцыпы арганізацыі палітычнага жыцця грамадства. Метады і сродкі ажыццяўлення ўлады могуць быць дэмакратычнымі ці недэмакратычнымі. Крайняй формай недэмакратычнага рэжыму з'яўляецца таталітарны рэжым, які характарызуецца ўсёабдымным кантролем за грамадскім і прыватным жыццём, ліквідацыяй правоў і свабод грамадзян і рэпрэсіямі.

Аўтарытарны рэжым з'яўляецца пераходным палітычным рэжымам: ад таталітарызму да дэмакратыі ці ад дэмакратыі да таталітарызму. Пры аўтарытарным рэжыме палітычная ўлада сканцэнтравана ў руках асобнага чалавека ці групы людзей,

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

аднак па-за сферай палітыкі захоўваецца адносная свабода. Галоўным арыенцірам для палітычнага развіцця ў сучасным свеце з'яўляецца дэмакратычны рэжым. Асноўныя характарыстыкі дэмакратыі разгледзім у наступным параграфе.

1. Якое з двух прыведзеных ніжэй палажэнняў адлюстроўвае ўнітарны дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь?
   - Прэзідэнт з'яўляецца кіраўніком выканаўчай улады.
   - Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі не валодаюць прыметамі дзяржаўнага суверэнітэту.
2. Вызначце форму праўлення і форму тэрытарыяльнага ўладкавання наступных пар дзяржаў. Што паміж імі агульнае? У чым адрозненне?
   - Рэч Паспалітая абодвух народаў (Rzeczpospolita Obojga Narodów) і Рэспубліка Польшча (Rzeczpospolita Polska).
   - СССР і ЕС.
3. Ці згодны вы з наступнымі сцвярджэннямі? Абгрунтуйце сваю думку.
   - Дзяржава існавала заўсёды.
   - Дзяржава з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком усяго грамадства.
   - Форма праўлення характарызуе метады і сродкі ажыццяўлення ўлады. ■

Выканайце міні-праект «Канфедэрацыі ў гісторыі і сучаснасці». Прывядзіце прыклады канфедэрацый з гісторыі і сучаснасці і растлумачце, чаму канфедэрацыя — самая рэдкая форма дзяржаўнага ўладкавання. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 8. Дэмакратыя

## Дэмакратыя — гэта найлепшы спосаб вырашэння праблем?

**Формы дэмакратыі**

**Прамая**

- **Выбары**
- **Рэферэндумы**
- **Абмеркаванне праектаў законаў**
- **Сходы**
- **Звароты грамадзян**

**Прадстаўнічая**

- **Прэзідэнт**
- **Парламент**
- **Мясцовыя саветы**

**Прынцыпы дэмакратыі**




**Паняцце дэмаратыі.** *Дэмакратыя* (ад грэч. *δῆμος* — народ і *κράτος* — улада) літаральна азначае «народаўладдзе». У антычнасці дэмакратыю разглядалі як асаблівую разнавіднасць арганізацыі дзяржавы, у якой улада належыць не адной асобе ці групе асоб, а ўсім свабодным грамадзянам (у той час толькі мужчынам), якія карыстаюцца роўнымі правамі на ўдзел у кіраванні дзяржавай. Антычная дэмакратыя па сваёй форме была дэмакратыяй прамой, яна была заснавана на непасрэдным удзеле грамадзян у кіраванні грамадскім жыццём.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дзе і калі ў Беларусі з’явіліся першыя дэмакратычныя формы палітычнага жыцця? ■

**У сучасных умовах дэмакратыя набыла новыя формы, але пры гэтым яна захавала сваю галоўную сутнасць — народаўладдзе.**

У наш час распаўсюджана азначэнне дэмакратыі, якое прапанаваў амерыканскі дзяржаўны дзеяч, прэзідэнт ЗША ў 1861—1865 гг. Аўраам Лінкальн: «Дэмакратыя — гэта праўленне народа, з дапамогай народа і для народа». ■

Пры **дэмакратыі** ўлада ажыццяўляецца народам або праз асабісты ўдзел (выбары, рэферэндумы), або праз сваіх прадстаўнікоў, абраных у органы дзяржаўнай улады.

**Формы дэмакратыі.** *Прамая дэмакратыя* азначае, што ўлада ажыццяўляецца самім народам без палітычных пасрэднікаў. Як? Праз выбары на аснове ўсеагульнага выбарчага права, удзел у абмеркаванні праектаў законаў, рэферэндумы, сходы грамадзян, шляхам звароту ў органы ўлады.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 37.** Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права ўдзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных спраў як непасрэдна, так і праз свабодна абраных прадстаўнікоў.

Непасрэдны ўдзел грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы забяспечваецца правядзеннем рэферэндумаў, абмеркаваннем праектаў законаў і пытанняў рэспубліканскага і мясцовага значэння, іншымі вызначанымі законам спосабамі.

У парадку, устаноўленым заканадаўствам, грамадзяне Рэспублікі Беларусь прымаюць удзел у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця на рэспубліканскіх і мясцовых сходах.

Колькі рэспубліканскіх рэферэндумаў было праведзена ў Рэспубліцы Беларусь? Якія важныя пытанні выносіліся на галасаванне? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Прамая дэмакратыя не толькі захоўвае сваё значэнне ў сучасным свеце, але і ўмацоўвае свае пазіцыі дзякуючы электронным сэрвісам зваротнай сувязі.**

Зайдзіце на сайт e-gov.by. Азнаёмцеся з ідэямі электроннага ўрада для Беларусі. Даведайцеся, якім чынам адбываецца павышэнне ступені ўдзелу ўсіх грамадзян у працэсах кіравання краінай з дапамогай электронных сэрвісаў. ■

***Прадстаўнічая дэмакратыя*** **заснавана на тым, што народ абірае сваіх прадстаўнікоў у органы ўлады і тым самым надзяляе іх правам прымаць рашэнні ад яго імя, інакш кажучы, дэлегуе ім пэўныя паўнамоцтвы. У сучасным грамадстве дадзеная форма дэмакратыі з'яўляецца найбольш распаўсюджанай.**

**Парламент**

| **Вышэйшы выбарны орган** | **Вышэйшы заканадаўчы орган** |
|---|---|
| Ажыццяўленне прадстаўніцтва асноўных сацыяльна-палітычных інтарэсаў розных слаёў грамадства | Галоўнай функцыяй з'яўляецца прыняцце законаў |

Чаму парламент з'яўляецца галоўным элементам прадстаўнічай дэмакратыі? Як называецца парламент Рэспублікі Беларусь? ■

**Віды выбарчых сістэм.** **Выбары рэгулююцца выбарчым правам.** ***Выбарчае права*** **— гэта сукупнасць юрыдычных норм, якія рэгулююць удзел грамадзян у выбарах прадстаўнічых органаў улады.**

**У вузкім сэнсе выбарчае права азначае права грамадзян абіраць і быць абранымі.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Вывучыце інфаграфіку ўвядзення выбарчага права для жанчын. Дзе жанчыны атрымалі выбарчыя правы раней, дзе — пазней? Чым гэта можна растлумачыць? ■

Высветліце, колькі жанчын у складзе дзеючага беларускага парламента. Даведайцеся, якое месца займае наша краіна па колькасці жанчын у парламенце. ■

Прынята вылучаць актыўнае і пасіўнае выбарчае права. *Актыўнае выбарчае права* — гэта права грамадзяніна выбіраць, браць асабісты ўдзел у выбарах. *Пасіўнае выбарчае права* — гэта права быць абраным у прадстаўнічыя органы ці на выбарную пасаду.

У аснову сучаснага выбарчага права закладзены прынцып *усеагульных, свабодных, роўных, прамых* і *тайных выбараў*.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гэта азначае, што ўсе паўналетнія грамадзяне дзяржавы, якія маюць права голасу па законе (электарат), незалежна ад полу, расы, нацыянальнасці, рэлігіі, месца жыхарства могуць выбіраць прадстаўнікоў у органы ўлады. Галасаванне ажыццяўляецца таемна, ніхто не можа кантраляваць працэс галасавання. Прынцып роўнасці азначае, што ўсе выбаршчыкі ўдзельнічаюць у выбарах на роўных падставах. Выбары з'яўляюцца свабоднымі: выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах і за каго галасаваць (хоць у некаторых краінах удзел у выбарах з'яўляецца абавязковым).

Усеагульнае выбарчае права мае пэўныя абмежаванні (*выбарчы цэнз* — устаноўленыя канстытуцыяй ці выбарчым законам умовы для ажыццяўлення грамадзянінам выбарчага права). Так, правы ўдзельнічаць у выбарах, абірацца прэзідэнтам ці дэпутатам парламента прадастаўляюцца па дасягненні пэўнага ўзросту. Ёсць і іншыя абмежаванні, якія ў кожнай краіне ўстанаўліваюцца заканадаўствам.

**Ці выключае абавязковае галасаванне правядзенне свабодных выбараў?**

- У шэрагу краін дзейнічае абавязковае галасаванне — прынцып выбарчага права, згодна з якім удзел у выбарах разглядаецца як абавязак ці грамадская функцыя выбаршчыка. Абавязковым з'яўляецца толькі ўдзел у галасаванні — выбаршчык можа аддаць незапоўнены бюлетэнь.
- Парушэнне абавязку ўдзельнічаць у выбарах без паважлівай прычыны, як правіла, цягне прымяненне санкцый (штрафу, выключэння з выбарчых спісаў, абмежавання магчымасцей паступіць на дзяржаўную службу).

  Як вы думаеце, у сувязі з чым была ўведзена такая норма?

Выбары таксама могуць быць *прамымі* і *ўскоснымі*. Прамыя выбары азначаюць, што грамадзяне самі абіраюць прадстаўнікоў у парламент ці іншы орган або самі галасуюць за прэзідэнта. Пры ўскосных выбарах грамадзяне абіраюць які-небудзь орган, які потым і завяршае выбары сваім галасаваннем.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Напрыклад, у Рэспубліцы Беларусь праз ускосныя выбары фарміруецца адна з палат парламента — Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Яго члены абіраюцца дэпутатамі мясцовых саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска.

У кожнай краіне складваецца свая выбарчая сістэма. **Выбарчая сістэма** — гэта сукупнасць устаноўленых законам правіл, прынцыпаў і прыёмаў, з дапамогай якіх вызначаюцца вынікі галасавання ў прадстаўнічыя органы ўлады і на дзяржаўныя пасады. Асноўнымі тыпамі выбарчых сістэм з'яўляюцца: *мажарытарная*, *прапарцыянальная*, *змешаная*.

## Тыпы выбарчых сістэм

**Мажарытарная сістэма**
(франц. *majoirité* — большасць)
выкарыстоўваецца на прэзідэнцкіх, парламенцкіх і мясцовых выбарах

- **Абсалютнай большасці**
  Абраным лічыцца кандыдат, які атрымаў больш за 50 % галасоў ад колькасці грамадзян, што з'явіліся на выбары
- **Адноснай большасці**
  Абраным лічыцца кандыдат, які атрымаў больш галасоў, чым які-небудзь з яго канкурэнтаў (не абавязкова больш за палову галасоў выбаршчыкаў)

**Прапарцыянальная сістэма**
выкарыстоўваецца толькі на выбарах ў парламенты ці іншыя (мясцовыя) прадстаўнічыя органы

- Выбаршчыкі галасуюць не за асобных кандыдатаў, а за партыйныя спісы
- Месцы ў парламенце размяркоўваюцца прапарцыянальна атрыманым галасам
- Дэпутатамі становяцца члены партый згодна з колькасцю пададзеных за іх галасоў

**Змешаная сістэма**
адна частка парламента абіраецца па мажарытарнай сістэме, а другая — па прапарцыянальнай

Даведайцеся імёны палітыкаў, якія прадстаўляюць вашу выбарчую акругу ў парламеце, у мясцовым Савеце дэпутатаў. ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Прынцыпы дэмакратыі.** У наш час дэмакратыю разглядаюць як асаблівы тып палітычнай сістэмы (палітычнага рэжыму), у якой рэалізаваны наступныя асноўныя прынцыпы.

| Прынцыпы дэмакратыі | |
|---|---|
| **Суверэнітэт народа як крыніца ўлады** | Крыніцай улады з'яўляецца народ, грамадзяне дзяржавы |
| **Выбары і ўсеагульнае выбарчае права** | Права свабодна выбіраць і быць абраным у дзяржаўныя органы ўлады (у дэмакратычных сістэмах выбарчае права з'яўляецца ўсеагульным) |
| **Прынцып падзелу ўлад** | Падзел дзяржаўнай улады на заканадаўчую, выканаўчую, судовую і ўзаемадзеянне ў сістэме «стрымлівання і процівагі», каб выключыць злоўжыванне ўладай |
| **Палітычны і ідэалагічны плюралізм** | Існаванне мноства партый, палітычных аб'яднанняў, рухаў і да т. п., якія выказваюць інтарэсы розных груп насельніцтва, а таксама розныя ідэалогіі і меркаванні (ні адна ідэалогія не можа ўстанаўлівацца як абавязковая) |
| **Магчымасць грамадства кантраляваць уладу** | Інструметамі кантролю з'яўляюцца сродкі масавай інфармацыі, партыі і грамадскія арганізацыі, выбары як механізм перадачы ўлады мірным законным шляхам |

Асаблівае значэнне пры ажыццяўленні палітычных інтарэсаў мае раўнапраўе грамадзян, захаванне свабоды слова, думкі, сходаў і іншых палітычных правоў і свабод. Непарушным правілам з'яўляецца прынцып «дазволена ўсё, што не забаронена законам».

Дэмакратыя — гэта ўлада большасці, пры якой частцы грамадства, што засталася ў меншасці, гарантавана абарона ад ганенняў за несупадзенне поглядаў з меркаваннем большай часткі насельніцтва.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Што з'яўляецца самым важным элементам дэмакратыі? Патлумачце свой адказ.
2. Запоўніце табліцу «Прынцыпы дэмакратычных выбараў».

| Прынцып | Характарыстыка |
|---|---|
| | |

3. Ахарактарызуйце палітычны статус асобы ў залежнасці ад сацыяльнай ролі, якую яна выконвае (выбаршчык, дэпутат).
4. Некаторыя палітыкі лічаць, што ў дзяржаве павінны існаваць больш строгія нормы выбарчага цэнзу, і прапануюць увесці не толькі ўзроставы, але і маёмасны, адукацыйны, гендарны, расавы, службовы, моўны і цэнз аселасці. Якія з іх носяць дыскрымінацыйны характар і з'яўляюцца несумяшчальнымі з сучаснымі дэмакратычнымі прынцыпамі выбарчага права? Аргументуйце сваю думку. ■

Выканайце міні-праект «Электронныя звароты і петыцыі як сродкі дэмакратыі». Знайдзіце і вывучыце інфармацыю аб электронных зваротах і петыцыях. Як працуюць з электроннымі зваротамі грамадзян сайты дзяржаўных органаў і сэрвісы для стварэння петыцый для вырашэння персанальных, лакальных, рэгіянальных праблем і агульнадзяржаўных пытанняў? ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 9. Прававая дзяржава і грамадзянскае грамадства




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Прынцыпы прававой дзяржавы.** Станаўленне і развіццё прававой дзяржавы неаддзельнае ад станаўлення і развіцця сферы правоў чалавека, якія, у рэшце рэшт, сталі тым цэнтральным элементам, вакол якога і з'явілася ўся канцэпцыя прававой дзяржавы.

Якія правы чалавека вы ведаеце? Ці звязаны асабістыя (грамадзянскія) правы з грамадзянствам пэўнай дзяржавы? ■

На працягу стагоддзяў ідэя ўсеагульных правоў чалавека развівалася з апорай на паняцці годнасці і павагі асобы. Аднак спатрэбіліся намаганні многіх пакаленняў, каб ідэя шанавання правоў была замацавана ў законах. У 1215 г. англійская знаць і прадстаўнікі духавенства, прыняўшы Вялікую хартыю вольнасцей (Magna Carta), вымусілі караля Англіі надалей кіраваць згодна з законам. У Статуце ВКЛ 1588 г. знайшла адлюстраванне ідэя падзелу ўлады на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі).

Англійскі філосаф XVII ст. Джон Лок распрацаваў тэорыю, згодна з якой кожны чалавек мае пэўныя правы ад нараджэння і яны не дорацца яму дзяржавай. Пры гэтым адносіны да дзяржавы залежаць ад таго, наколькі яна выконвае дадзеныя натуральныя правы. Ідэя, згодна з якой з натуральных правоў чалавека павінны вынікаць пэўныя прававыя гарантыі, атрымлівала ўсё большае прызнанне і стала знаходзіць адлюстраванне ў канстытуцыях шэрагу краін. ■

**Прававая дзяржава** — гэта форма арганізацыі палітычнай улады ў краіне, заснаваная на вяршэнстве права, падзеле ўлад, захаванні правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Свае асноўныя рысы і прыметы канцэпцыя прававой дзяржавы набыла ў канцы XIX — пачатку XX ст. Правы і свабоды чалавека былі прызнаныя


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

неадчужальнымі, а іх павага, захаванне і абарона з боку дзяржавы — абавязковымі. У прававой дзяржаве «не закон ляжыць у аснове правоў людзей, а правы чалавека — у аснове закону». Мэтай з'яўляецца забеспячэнне правоў чалавека, недапушчэнне парушэння яго свабоды. Гэтаму галоўнаму палажэнню падпарадкаваны ўсе іншыя прынцыпы прававой дзяржавы.

## Прынцыпы прававой дзяржавы

| | |
|---|---|
| **Вяршэнства права** | Закон вышэйшы за ўсё, роўнасць усіх грамадзян перад законам і судом, рэальнасць іх правоў і свабод, эфектыўны судовы механізм абароны гэтых правоў |
| **Падзел улад** | Падзел дзяржаўнай улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую, дзеянне сістэмы «стрымлівання і процівагі» |
| **Узаемная адказнасць дзяржавы і асобы** | Грамадзяне, арганізацыі і ўстановы нясуць адказнасць перад дзяржавай за выкананне сваіх абавязкаў, а дзяржава, яе службовыя асобы адказныя за свае дзеянні перад грамадзянамі |

У якіх артыкулах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваны асноўныя прынцыпы прававой дзяржавы? Падмацуйце цытатамі з дакумента. ■

Найважнейшай умовай пабудовы прававой дзяржавы з'яўляецца не проста абвяшчэнне дадзеных прынцыпаў, а іх гарантаванасць, ператварэнне ў рэальную практыку адносін дзяржавы і грамадства, дзяржавы і чалавека.

**Грамадзянскае грамадства і яго асноўныя інстытуты.** У кожнай краіне суіснуюць у непарыўным адзінстве дзяржава як апарат улады і грамадзянскае грамадства як сукупнасць людзей, якія маюць свае ўласныя мэты і інтарэсы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Грамадзянскае грамадства** — гэта асаблівая сфера грамадскіх адносін, сістэма самастойных і параўнаўча незалежных ад дзяржавы інстытутаў, грамадскіх інтарэсаў, адносін.

Грамадзянскае грамадства мае складаную структуру. Яно ўключае ў сябе не толькі інтарэсы грамадзян і адносіны паміж імі, але і шматлікія арганізацыі, закліканыя абараняць правы грамадзян і рэалізоўваць іх разнастайныя інтарэсы. Палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі і рухі, прафесійныя і творчыя аб'яднанні, царква з'яўляюцца найважнейшымі інстытутамі грамадзянскага грамадства.

Без дзяржавы грамадзянскае грамадства існаваць не можа, а дзяржава без развітога грамадзянскага грамадства не здольна паспяхова развівацца па шляху дэмакратыі і захавання правоў і свабод чалавека.

Чаму дзяржава павінна быць максімальна зацікаўлена ў наяўнасці развітога грамадзянскага грамадства, а грамадства — у існаванні прававой дзяржавы? ■

**Сродкі масавай інфармацыі і іх роля ў палітыцы.** Роля СМІ ў сучасным грамадстве пастаянна ўзрастае. Усё больш людзей разумеюць, што без адкрытасці палітычнай сферы, якую забяспечваюць СМІ, дэмакратыя немагчыма. Абавязковай умовай існавання прававой дзяржавы з'яўляецца атрыманне, захаванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб эканамічным, культурным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя

*СМІ* — гэта перыядычнае друкаванае выданне, сеткавае выданне, тэлеканал, тэлепраграма, радыёканал, радыёпраграма, відэапраграма, іншая форма перыядычнага распаўсюджвання масавай інфармацыі пад пастаянным найменнем, якое мае дзяржаўную рэгістрацыю.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Роля СМІ заключаецца ў інфармаванні насельніцтва аб падзеях, якія адбываюцца ў краіне і свеце. Сёння СМІ таксама маюць вялікае значэнне ў фарміраванні грамадскай думкі, уплываюць на палітычныя паводзіны грамадзян.**



*Тэорыя парадку дня* абвяшчае, што сродкі масавай інфармацыі аказваюць значны ўплыў на грамадскасць непасрэдна самім падборам таго, што канкрэтна яны асвятляюць у навінах.

Правядзіце апытанне і абмяркуйце вынікі.

- Адкуль вы звычайна атрымліваеце навіны: мясцовыя, рэгіянальныя, агульнанацыянальныя, глабальныя?
- Якія радыё- і тэлепраграмы вы слухаеце і гледзіце, якія часопісы і газеты чытаеце?
- Пералічыце тры галоўныя навіны бягучага тыдня. Пра што яны?

**СМІ не проста адлюстроўваюць навакольную рэчаіснасць, аб'ектыўна фіксуючы падзеі, якія адбываюцца, а непасрэдна ці апасродкавана, у адкрытай ці прыхаванай форме ўплываюць на ўсе палітычныя працэсы. Найбольш актуальнымі для сучаснага этапу з'яўляюцца праблемы скажэння інфармацыі, інфармацыйныя войны паміж рознымі палітычнымі сіламі ўнутры краін і паміж дзяржавамі.**

**Палітыкі ўсё часцей выкарыстоўваюць СМІ, каб мабілізаваць грамадзян на тыя ці іншыя дзеянні, прапагандаваць свае палітычныя мэты, прыцягваць прыхільнікаў. Акрамя гэтых функцый, сродкі масавай інфармацыі забяспечваюць працэс камунікацыі паміж палітычнымі, эканамічнымі, сацыяльнымі інстытутамі і грамадствам. Сучасныя СМІ — гэта асаблівы суб'ект палітыкі, вельмі актыўны і ўплывовы, з пэўнай пазіцыяй,**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сур'ёзным эканамічным патэнцыялам. Паколькі яны з'яўляюцца таксама інструментамі кантролю дзяржаўнай улады — заканадаўчай, выканаўчай і судовай, іх часам называюць «чацвёртай уладай». Такім чынам падкрэсліваецца той вялікі ўплыў, якім валодаюць СМІ ў грамадстве і дзяржаве.

1. Назавіце прынцыпы прававой дзяржавы і грамадзянскага грамадства. У чым праяўляецца іх узаемасувязь?
2. Назавіце не менш за пяць суб'ектаў грамадзянскага грамадства. Ахарактарызуйце аднаго з іх.
3. Запоўніце табліцу. Якія характарыстыкі дзейнасці СМІ вы аднесяце да дэмакратычнай палітычнай сістэмы, а якія да таталітарнай: усе СМІ падпарадкоўваюцца закону і дзейнічаюць у прававым полі; улада пастаянна ўздзейнічае на грамадства сродкамі прапаганды; СМІ ствараюць вобраз ворага, распальваюць варожасць і нецярпімасць; СМІ мабілізуюць грамадскую думку на абмеркаванне і вырашэнне праблем грамадства; усе СМІ знаходзяцца пад поўным кантролем дзяржавы (незалежных не існуе); СМІ ажыццяўляюць грамадскі кантроль за дзейнасцю ўлады? ■

| СМІ ў дэмакратычнай дзяржаве | СМІ ў таталітарнай дзяржаве |
|---|---|
| | |

Выканайце міні-праект «Парадак сённяшняга дня». Выберыце 10 паведамленняў інфармацыйных агенцтваў за сённяшні дзень, праранжыруйце іх па ступені важнасці. Прасачыце, ці сталі яны галоўнымі навінамі ў медыя. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. Палітычныя ідэалогіі

## Ідэалогіі сёння перажываюць заняпад ці адраджэнне?




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Тэрмін «ідэалогія» ўвёў у канцы XVIII ст. французскі філосаф Антуан Дэсцют дэ Трасі для абазначэння навукі аб агульных прынцыпах фарміравання ідэй. ■

**Паняцце і функцыі палітычнай ідэалогіі.** Палітычная сфера жыцця грамадства ўключае не толькі палітычныя адносіны і дзейнасць, але і палітычную свядомасць. Тэарэтычныя і жыццёвыя веды аб палітыцы, каштоўнасныя арыенціры людзей, палітычныя стэрэатыпы і настроі істотна ўплываюць на палітыку. У палітычнай свядомасці ўтрымліваюцца як навуковыя веды, так і звычайныя ўяўленні аб палітыцы, ацэначныя меркаванні і эмацыйныя адносіны да палітычных з'яў.

**Палітычная ідэалогія** — гэта сукупнасць ідэй, ідэалаў, каштоўнасцей, у якіх адлюстроўваюцца значныя, істотныя інтарэсы пэўных сацыяльных слаёў, што імкнуцца рэалізаваць гэтыя інтарэсы з дапамогай дзяржаўнай улады. Палітычныя ідэалогіі арыентаваны або на захаванне існуючых грамадскіх адносін, або на іх змену.

Галоўным у ідэалогіі з'яўляецца тое, што яна выражае пэўныя сацыяльныя інтарэсы і фарміруе «чалавека палітычнага» з пэўнымі перакананнямі. Палітычная ідэалогія складае светапоглядную аснову палітыкі.

Вылучаюць тры ўзроўні функцыянавання ідэалогіі. На *тэарэтычным* узроўні распрацоўваюцца палітычныя тэорыі, абгрунтоўваюцца прынцыпы дзейнасці дзяржавы і іншых палітычных інстытутаў, фармулююцца грамадскія ідэалы.

На *праграмна-палітычным* узроўні тэорыі і ідэйныя прынцыпы канкрэтызуюцца ў праграмах палітычных партый, перадвыбарных платформах, заявах палітычных лідараў, лозунгах.

На *жыццёвым (паводзінскім)* узроўні адбываецца ператварэнне ідэалагічных тэорый, ідэй, ідэалаў у перакананні людзей. Менавіта на гэтым узроўні правяраецца, наколькі


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ідэалагічныя палажэнні прымаюцца канкрэтнымі людзьмі, падтрымліваюцца вялікімі сацыяльнымі групамі. Звычная, жыццёвая палітычная свядомасць непасрэдна ўплывае на палітычны ўдзел і падтрымку пэўных палітычных партый, лідараў, дзяржаўных інстытутаў.

### Асноўныя віды палітычнай ідэалогіі.

Прыгадайце, дзе ўзніклі першыя палітычныя ідэалогіі. З чым звязана іх узнікненне?

| Лібералізм | Кансерватызм | Сацыялізм |
|---|---|---|
| (ад лац. *liberalis* — свабодны) — узнікае ў XVII—XVIII стст. у перыяд буржуазных рэвалюцый | (ад лац. *conservo* — захоўваю, берагу) — узнікае ў канцы XVIII ст. як рэакцыя на рэвалюцыі і лібералізм | (ад лац. *socialis* — грамадскі) — узнікае ў пачатку XIX ст. як ідэалогія рабочага класа |

Да асноўных палітычных ідэалогій належаць лібералізм, кансерватызм і сацыялізм, якія называюць суперідэалогіямі. Яны захоўваюць сваё значэнне і сёння, нягледзячы на істотныя змены з часу свайго ўзнікнення.

Для таго каб высветліць уласныя ідэалагічныя перакананні, з дапамогай воблака паняццяў з уступнай інфаграфікі адкажыце на пытанні:

1. Якія тры паняцці характарызуюць вашы асноўныя палітычныя погляды і інтарэсы?
2. Як вы думаеце, ці ёсць межы ў свабоды асобы?
3. Якім чынам павінны вырашацца сацыяльныя супярэчнасці?

Даведайцеся з табліцы на с. 86, якім ідэалогіям адпавядаюць вашы адказы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

<table>
<tr><th>Класічны</th><th>Сучасны</th></tr>
<tr><td colspan="2">Лібералізм</td></tr>
<tr><td>Індывідуалізм, свабода асобы<br>• Індывідуальная свабода, самацэннасць чалавечай асобы, правы і свабоды чалавека<br>• Абарона прыватнай уласнасці і рыначнай эканомікі, неўмяшанне дзяржавы ў сферу эканомікі</td><td>• Дзяржава павінна рэгуляваць рынак і надаваць эканоміцы сацыяльную накіраванасць, абараняць разнастайнасць форм уласнасці, праводзіць эканамічныя і сацыяльныя рэформы, паслядоўна рэалізоўваць правы і свабоды чалавека, якія ўсё больш пашыраюцца</td></tr>
<tr><td colspan="2">Кансерватызм</td></tr>
<tr><td>Традыцыяналізм<br>• Традыцыйныя каштоўнасці (сямейныя, манархічныя, рэлігійныя і інш.)<br>• Прыватная ўласнасць свяшчэнная і недатыкальная<br>• Супраць рэвалюцыйных пераўтварэнняў</td><td>• Пераемнасць і стабільнасць — неабходныя ўмовы захавання цэласнасці грамадства і традыцыйных каштоўнасцей у перыяд глабальных змен<br>• Прызнанне неабходнасці рэформ, якія павінны абапірацца на традыцыйныя асновы<br>• Неабходна аўтарытэтная і моцная дзяржава</td></tr>
<tr><td colspan="2">Сацыялізм</td></tr>
<tr><td>Калектывізм<br>• Прыярытэт інтарэсаў сацыяльнай супольнасці і агульнай карысці над інтарэсамі асобы<br>• Справядлівае грамадства на аснове грамадскай уласнасці і сацыяльнай роўнасці<br>• Правядзенне пераўтварэнняў (шляхам рэвалюцый — камунізм, рэформ — сацыял-рэфармізм)</td><td>• Пашырэнне ўдзелу грамадзян у кіраванні дзяржавай пры захаванні і ўдасканаленні сучасных дэмакратычных інстытутаў<br>• Узмацненне сацыяльнай накіраванасці эканамічнай сферы, функцыянаванне змешанай эканомікі<br>• Арыентацыя на высокую якасць жыцця для ўсіх слаёў насельніцтва, барацьбу з беднасцю</td></tr>
</table>



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У чым падабенства і адрозненне сучасных разнавіднасцей лібаралізму, кансерватызму, сацыялізму? Вылучыце найбольш важныя, на ваш погляд, прынцыпы кожнай ідэалогіі. Абгрунтуйце сваю думку. ■

Традыцыйна ідэалогіі падзяляюцца на «правыя» і «левыя».

Левыя ідэалогіі арыентаваны на абарону інтарэсаў працоўных, сацыяльную справядлівасць і роўнасць. Да іх належаць сацыялізм, сацыял-дэмакратызм, камунізм, анархізм.

Правыя ідэалогіі вылучаюцца большай неаднароднасцю па змесце, ідэях і каштоўнасцях. Да правых ідэалогій належаць лібералізм, кансерватызм, нацыяналізм, расізм, фашызм, рэлігійны фундаменталізм.

І правыя, і левыя ідэалогіі могуць прымаць радыкальны характар. *Радыкалізм* (ад лац. *radicalis* — карэнны) — ідэалагічная і практычная арыентацыя на карэнную і хуткую змену грамадства і дзяржавы, часцей за ўсё шляхам гвалтоўных дзеянняў. Практыка радыкальных рухаў часта заснавана на экстрэмізме і тэрарыстычных дзеяннях.

**Ідэалагічная разнастайнасць сучаснасці.** Ідэалагічная сфера ў сучасным грамадстве вылучаецца вялікай разнастайнасцю. Адбываецца драбленне суперідэалогій (лібералізму, кансерватызму, сацыялізму), узмацняецца ўплыў нацыяналізму, фемінізму, ідэалогіі «зялёных», рэлігійнага фундаменталізму. Шырока выкарыстоўваюцца ідэалагічныя запазычанні. Так, ідэі правоў і свабод чалавека, дэмакратыі, гендарнай роўнасці, аховы прыроды характэрныя для сучаснага лібералізму, кансерватызму, сацыял-дэмакратызму і ўваходзяць у праграмы камуністычных партый. Гэтыя запазычанні дазваляюць палітычным сілам пашыраць сваю сацыяльную базу.

*Папулізм* (ад лац. *popŭlus* — народ) — гэта вылучэнне нерэальных, але папулярных у канкрэтнай сітуацыі лозунгаў для набыцця падтрымкі народа, абяцанне лёгкага вырашэння вострых сацыяльных праблем.

Ці можна лічыць папулізм ідэалогіяй? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ва ўмовах ідэалагічнай разнастайнасці ўзмацняецца значэнне ідэалогіі дзяржавы, якая адлюстроўвае нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы ў цэлым.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 4.** Дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і поглядаў.

Ідэалогія палітычных партый, рэлігійных або іншых грамадскіх аб'яднанняў, сацыяльных груп не можа ўстанаўлівацца ў якасці абавязковай для грамадзян.

**Артыкул 33.** Кожнаму гарантуецца свабода поглядаў, перакананняў і іх свабоднае выказванне.

Ніхто не можа быць прымушаны да выказвання сваіх перакананняў або адмовы ад іх.

Манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі або асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца.

Захаванне грамадзянскага міру і ўмоў для стабільнага развіцця грамадства патрабуе забароны дзейнасці тых палітычных сіл, якія вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці, ставяць сваёй мэтай гвалтоўную змену канстытуцыйнага ладу. Радыкальныя ідэалогіі: фашызм, расізм, рэлігійны экстрэмізм, шавінізм (крайняя правая нацыяналізму) — разбураюць адзінства грамадства, прыводзяць да палітычных крызісаў, росту тэрарызму і грамадзянскіх войнаў, вядуць да ўзрастання напружання ў міжнародных адносінах.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. На аснове тэксту параграфа складзіце схему «Узроўні палітычнай ідэалогіі».
2. Растлумачце і канкрэтызуйце прыкладамі ролю ідэалогіі ў палітыцы.
3. Выкажыце сваё меркаванне аб тым, якую ідэалогію можна назваць цэнтрысцкай. Чаму лічыцца, што правыя і левыя радыкалы значна бліжэйшыя адзін да аднаго, чым да палітычнага цэнтра? ■

Выканайце міні-праект «Візуалізацыя перадвыбарнай праграмы». Вывучыце праграмы палітыкаў — кандыдатаў на актуальных выбарах (прэзідэнцкіх, парламенцкіх ці мясцовых Саветаў). Складзіце на падставе праграм «аблокі слоў» — «ТОП-10 слоў з праграм кандыдатаў» (выкарыстоўвайце толькі назоўнікі, вылучыце большым шрыфтам словы, што ў праграме сустракаюцца часцей, меншым — радзей). Параўнайце «аблокі слоў». Якія ідэалогіі з'яўляюцца асновай для праграм? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 11. Палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні




**Паняцце палітычнай партыі і яе функцыі.** Важнае месца ў сістэме адносін улады і грамадства займаюць разнастайныя грамадскія аб’яднанні грамадзян — палітычныя партыі, прафсаюзныя, маладзёжныя, антываенныя арганізацыі, масавыя рухі, асацыяцыі, фонды. У аснове такіх аб’яднанняў ляжыць усведамленне грамадзянамі краіны сваіх інтарэсаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Уздзейнічаючы праз пэўныя палітычныя механізмы на дзяржаву, грамадскія аб’яднанні садзейнічаюць задавальненню дадзеных інтарэсаў шляхам выкарыстання дзяржаўнай улады. Права на аб’яднанне з’яўляецца фундаментальным правам чалавека і грамадзяніна і азначае права на свабодны і самастойны выбар грамадзянамі любых форм недзяржаўнай дзейнасці.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 36.** Кожны мае права на свабоду аб’яднанняў.

Суддзі, пракурорскія работнікі, супрацоўнікі органаў унутраных спраў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, органаў бяспекі, ваеннаслужачыя не могуць быць членамі палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія дамагаюцца палітычных мэт.

Чым, на ваш погляд, абумоўлены абмежаванні палітычнай дзейнасці для асобных катэгорый грамадзян? ■

Для характарыстыкі шырокага кола арганізацыйных форм грамадскай актыўнасці выкарыстоўваецца паняцце «грамадскае аб’яднанне». *Грамадскае аб’яднанне* — гэта добраахвотнае аб’яднанне грамадзян, якое ўзнікла ў выніку іх свабоднага волевыяўлення на аснове агульнасці інтарэсаў.

Сярод грамадскіх аб’яднанняў вылучаюць такія асноўныя фарміраванні, як палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі і грамадскія рухі. Яны адрозніваюцца паміж сабой мэтамі, задачамі, арганізацыйнай структурай.

Важная роля ў палітычным жыцці належыць палітычным партыям. Яны ўяўляюць сабой прадукт працяглага гістарычнага развіцця. Паняцце «партыя» (ад лац. *pars* — частка, група) з’явілася яшчэ ў антычнасці і выкарыстоўвалася для абазначэння груп палітычных саюзнікаў, якія імкнуліся да агульнай мэты. Сучасныя палітычныя партыі пачалі фарміравацца ў другой палове XIX ст. у выніку пашырэння выбарчага права, развіцця

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

парламентарызму. У сучаснай палітыцы існуюць розныя падыходы да азначэння партыі. Але часцей за ўсё яе вызначаюць так: **палітычная партыя** — гэта арганізаваная група людзей з агульнымі палітычнымі поглядамі, якая выказвае інтарэсы пэўнай часткі грамадства і мае на мэце заваяванне дзяржаўнай улады ці ўдзел у яе ажыццяўленні.

**Палітычная партыя**

- **Наяўнасць ідэалогіі і адпаведнай праграмы**
- **Арганізацыйная структура** (лідар, партыйны апарат, радавыя члены партыі, электарат — сацыяльная база)
- **Устаноўка на заваяванне дзяржаўнай улады ці ўдзел у ёй**

Гэтым палітычныя партыі адрозніваюцца ад усіх іншых грамадскіх аб'яднанняў (грамадскіх арганізацый, рухаў, фондаў). Кожная партыя імкнецца ўладкаваць жыццё дзяржавы і грамадства згодна са сваімі палітычнымі поглядамі і прынцыпамі.

Функцыі партый адлюстроўваюць асноўныя задачы і напрамкі іх дзейнасці ў грамадстве. Найважнейшай задачай палітычнай партыі з'яўляецца барацьба за заваяванне і выкарыстанне дзяржаўнай улады ў інтарэсах груп насельніцтва, якія яе падтрымліваюць, інакш кажучы, *палітычная функцыя*.

*Функцыя прадстаўніцтва інтарэсаў* розных груп грамадства праяўляецца ў тым, што праз палітычныя партыі грамадзяне выказваюць свае групавыя патрабаванні да дзяржавы. Партыі з'яўляюцца сувязным звяном паміж органамі дзяржаўнай улады і грамадзянамі.

*Ідэалагічная функцыя* палітычных партый звязана з выпрацоўкай праграмных установак, палітычнага курсу, стратэгіі


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і тактыкі партый. Ідэалогія выступае ў якасці тэарэтычнай асновы дзейнасці партыі, інструкцыяй да дзеяння. Партыі імкнуцца да шырокага распаўсюджвання сваіх ідэй у грамадстве.

*Выхаваўчая функцыя* праяўляецца ў палітычнай асвеце і адукацыі сваіх членаў і прыхільнікаў, іх выхаванні на аснове пэўных каштоўнасцей і традыцый, далучэнні да палітычнага жыцця. Партыі з’яўляюцца інстытутамі, у межах якіх выхоўваюцца палітычныя лідары і дзяржаўныя дзеячы. Тыя слаі грамадства, сярод якіх партыя карыстаецца найбольшым уплывам, складаюць яе сацыяльную базу (электарат).

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 5.** Палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнічаючы ў межах Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, садзейнічаюць выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян, удзельнічаюць у выбарах.

Палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб’яднанні маюць права карыстацца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

Забараняецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, а таксама іншых грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу ці вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці.

Праява якіх функцый палітычных партый зафіксавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? Дакажыце, што партыя з’яўляецца палітычным інстытутам. ■

Асноўным спосабам дасягнення ўлады з’яўляюцца выбары. У працэсе выбарчых кампаній афармляюцца міжпартыйныя блокі, вызначаюцца партыі-лідары, якія далей і складаюць партыйную сістэму краіны.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Палітычныя партыі і партыйныя сістэмы.** Палітолагі вылучаюць розныя тыпы палітычных партый. У аснову класіфікацыі палітычных партый могуць быць пакладзены розныя крытэрыі.

## Тыпы палітычных партый

### У адносінах да існуючага ладу

| | |
|---|---|
| **Кансерватыўныя**<br>Захаванне існуючага ладу з нязначнымі зменамі | **Рэвалюцыйныя**<br>Радыкальнае, істотнае пераўтварэнне грамадства |
| **Рэфармісцкія**<br>Паляпшэнне існуючых грамадскіх адносін | **Рэакцыйныя**<br>Частковае або поўнае вяртанне да мінулага |

### Па характары членства і прынцыпах арганізацыі

| | |
|---|---|
| **Масавыя**<br>Імкнуцца ўцягнуць у свае рады як мага большую колькасць членаў, бо асноўнай крыніцай фінансавання партыі з’яўляюцца членскія ўзносы (фіксаванае членства) | **Кадравыя**<br>У сваёй дзейнасці абапіраюцца на партыйны актыў і партыйных актывістаў, існуюць дзякуючы добраахвотным ахвяраванням і фінансавай падтрымцы ўплывовых колаў грамадства |

### Па месцы ў сістэме дзяржаўнай улады

| | |
|---|---|
| **Кіруючыя**<br>Перамаглі на выбарах і маюць большасць у парламенце | **Апазіцыйныя**<br>Выступаюць супраць праграм кіруючай або кіруючых партый і вядуць з імі барацьбу за дзяржаўную ўладу |

### У адносінах да палітычнага цэнтра

| | | |
|---|---|---|
| **Левыя**<br>Прыхільнікі ідэй сацыяльнай роўнасці і справядлівасці, актыўнай рэгулюючай ролі дзяржавы | **Цэнтрысцкія**<br>Прытрымліваюцца памяркоўных поглядаў, садзейнічаюць умацаванню стабільнасці ў грамадстве | **Правыя**<br>Пераважаюць індывідуалізм, свабода, прыватная ўласнасць, канкурэнцыя |


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па сваёй ідэйна-палітычнай арыентацыі палітычныя партыі падзяляюцца на камуністычныя, сацыял-дэмакратычныя, сацыялістычныя, ліберальныя (ліберальна-дэмакратычныя), кансерватыўныя, а таксама партыі, якія абапіраюцца на розныя рэлігійныя і нацыянальныя дактрыны.

Устанавіце па інфармацыі на сайце Міністэрства юстыцыі, якім палітычным партыям у Беларусі належыць сімволіка з інфаграфікі. Параўнайце зарэгістраваныя партыі па наступных крытэрыях:
- ідэалагічная накіраванасць;
- адносіны да палітычнага цэнтра.

Партыі могуць супрацоўнічаць, выступаць разам для дасягнення тых або іншых мэт, могуць супрацьстаяць адна адной, знаходзіцца ў барацьбе. Колькасць партый у грамадстве адлюстроўвае ступень эканамічнай, ідэалагічнай і іншай неаднароднасці інтарэсаў. Чым вышэйшая ступень неаднароднасці, тым большая колькасць партый у палітычнай сістэме грамадства. У залежнасці ад таго, колькі палітычных партый у краіне, у якіх яны адносінах адна з адной, складваюцца пэўныя тыпы партыйных сістэм. *Партыйная сістэма* — гэта сукупнасць партый, якія ўзаемадзейнічаюць ці сапернічаюць у барацьбе за ўладу і яе ажыццяўленне.

З пункту гледжання колькаснага крытэрыю партыйныя сістэмы падзяляюць на шматпартыйныя і аднапартыйныя. А з пазіцыі таго, як партыі ўзаемадзейнічаюць паміж сабой у барацьбе за ўладу, вылучаюць сістэмы аднапартыйныя, двухпартыйныя, шматпартыйныя.

*Шматпартыйная сістэма* характарызуецца наяўнасцю ў краіне некалькіх палітычных партый, якія спаборнічаюць у барацьбе за ўладу. Шматпартыйныя сістэмы таксама могуць быць рознымі. Шматпартыйныя сістэмы трэба адрозніваць ад шматпартыйнасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Наяўнасць мноства палітычных партый яшчэ не азначае, што паміж імі склалася пэўная сістэма адносін у барацьбе за ўладу і за ўплыў у грамадстве. Шматпартыйнасць часцей за ўсё папярэднічае станаўленню той або іншай шматпартыйнай сістэмы. У такіх краінах, як Данія, Бельгія, Аўстрыя, Італія, існуе мноства палітычных партый, але пры гэтым ні адна з іх не можа заваяваць большасць месцаў у парламенце і самастойна ажыццяўляць уладу. Такую разнавіднасць шматпартыйнай сістэмы часта вызначаюць як класічную.

Існуе шматпартыйная сістэма з дамінуючай партыяй. Такая сістэма характарызуецца працяглым знаходжаннем ва ўладзе адной партыі, але пры наяўнасці шматлікіх іншых палітычных партый. Напрыклад, у Швецыі ў якасці дамінуючай партыі выступае Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя, у Японіі доўгі час улада знаходзілася ў Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

Асаблівасць *двухпартыйнай сістэмы* заключаецца ў тым, што ў краіне існуюць дзве моцныя партыі, кожная з якіх здольная да самастойнага заваявання ўлады і яе ажыццяўлення. Калі адна з партый перамагае на выбарах, другая сыходзіць у апазіцыю, і так перыядычна яны змяняюць адна адну ў кіраванні дзяржвай. Двухпартыйная сістэма не выключае існавання ў краіне і іншых, менш уплывовых партый. Яны таксама ўдзельнічаюць у палітычным працэсе, але рэальна прэтэндаваць на перамогу не могуць. Класічная мадэль двухпартыйнай сістэмы склалася ў ЗША, дзе адна адной супрацьстаяць Дэмакратычная і Рэспубліканская партыі.

*Аднапартыйная сістэма* характарызуецца тым, што ў краіне дзейнічае толькі адна палітычная партыя. Яе роля замацавана ў канстытуцыі і іншых законах краіны. Аднапартыйная сістэма існавала у СССР, у большасці краін сусветнай сістэмы сацыялізму.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Аднапартыйная сістэма | Двухпартыйная сістэма | Шматпартыйная сістэма |
|---|---|---|
| **Добрыя якасці** | | |
| • Аб’яднанне сацыяльных груп, спалучэнне іх інтарэсаў<br>• Канцэнтрацыя рэсурсаў для вырашэння праблем | • Стабільны ўрад<br>• Правядзенне глыбокіх пераўтварэнняў | • Адлюстраванне шырокага спектра інтарэсаў<br>• Пошук кампрамісаў |
| **Недахопы** | | |
| • Застой<br>• Бюракратызацыя<br>• Адрыў ад мас | • Магчымасць змены палітычнага курсу на чарговых выбарах | • Працягласць прыняцця рашэнняў<br>• Пастаянная палітычная нестабільнасць |

Прывядзіце прыклады дзяржаў з дадзенымі партыйнымі сістэмамі.

Якая партыйная сістэма — двухпартыйная ці шматпартыйная — у большай ступені садзейнічае ўстойлівасці:

- прэзідэнцкай рэспубліцы?
- парламенцкай рэспубліцы?

**Грамадскія арганізацыі і рухі.** Значная роля ў грамадска-палітычным жыцці, разам з палітычнымі партыямі, належыць грамадскім арганізацыям і рухам. *Грамадская арганізацыя* — гэта добраахвотнае аб’яднанне грамадзян на аснове агульнасці інтарэсаў, якое мае фіксаванае (афармленае) індывідуальнае ці калектыўнае членства. У адрозненне ад партый грамадскія арганізацыі не прэтэндуюць на непасрэдны ўдзел у ажыццяўленні ўлады. Аднак яны рашаюць мноства важных задач грамадскага жыцця, іх наяўнасць і дзейнасць з’яўляюцца важным паказчыкам дэмакратычнасці дзяржавы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Колькі грамадскіх аб'яднанняў зарэгістравана ў нашай краіне? Якія маладзёжныя грамадскія аб'яднанні вам вядомы? Членам якіх грамадскіх аб'яднанняў вы з'яўляецеся? ■

Да грамадскіх аб'яднанняў адносяць прафесійныя саюзы, саюзы прадпрымальнікаў, маладзёжныя, экалагічныя, спартыўныя, ветэранскія арганізацыі, творчыя саюзы, такія як саюзы пісьменнікаў, кампазітараў, тэатральных дзеячаў. Існуюць таксама разнастайныя добраахвотныя таварыствы (навуковыя, тэхнічныя, культурна-асветніцкія, адукацыйныя і інш.). З улікам тэрыторый, на якіх ажыццяўляецца іх дзейнасць, вылучаюць мясцовыя, рэгіянальныя, агульнадзяржаўныя, міжнародныя грамадскія арганізацыі.

Як называецца беларуская грамадская арганізацыя, якая належыць да міжнароднага руху і выкарыстоўвае ў розных краінах прадстаўленыя эмблемы? Што азначаюць дадзеныя эмблемы і чаму яны выкарыстоўваюцца ў розных краінах? ■



Пад *грамадскім рухам* разумеецца сумесная дзейнасць грамадзян, якія імкнуцца да здзяйснення пэўных агульных мэт, але пры гэтым не маюць выразнай арганізаванай структуры і фіксаванага членства. Грамадскія рухі вылучаюцца масавасцю, шырокай сацыяльнай базай. Часта ўзнікаюць як рэакцыя грамадства на наяўнасць тых або іншых праблем, могуць мець кароткачасовы характар. Грамадскія рухі нярэдка становяцца асновай для ўтварэння грамадскіх арганізацый і нават палітычных партый. Так, развіццё экалагічнага руху абумовіла стварэнне разнастайных экалагічных саюзаў і асацыяцый, а затым і партый «зялёных» у многіх краінах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. На аснове тэксту параграфа складзіце схему «Функцыі палітычных партый». Якую функцыю палітычнай партыі вы лічыце самай важнай? Чаму?
2. На прыкладзе грамадскіх аб'яднанняў экалагічнай накіраванасці растлумачце, што агульнае паміж палітычнымі партыямі, грамадскімі арганізацыямі і рухамі і ў чым іх адрозненне.
3. У ФРГ склалася партыйная сістэма, асаблівасць якой заключаецца ў барацьбе за ўладу дзвюх буйных партый. Ні адна з іх не можа заваяваць большасць у парламенце, таму кожная ўваходзіць у кааліцыю (саюз) з трэцяй партыяй. Гэта трэцяя партыя выконвае ролю балансу, яе падтрымка забяспечвае перавагу адной з вядучых партый. Растлумачце, чаму сістэму называюць не трохпартыйнай, а «двух з паловай партыйнай».
4. Уявіце сітуацыю: вы размаўляеце з сябрам, і ён сцвярджае, што арганізацыя, у якой знаходзіцца яго старэйшы брат, з'яўляецца новай палітычнай партыяй. Якія пытанні пра грамадскія аб'яднанні вы задалі б свайму сябру, каб упэўніцца ў праўдзівасці яго слоў? ■

Выканайце міні-праект «Сімволіка палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў Беларусі». Стварыце плакат, у якім будзе адлюстравана разнастайнасць палітычных партый і арганізацый. Стварыце падборку сімволікі левых, правых і цэнтрысцкіх партый розных краін. Ці магчыма вылучыць агульныя рысы? У чым заключаюцца адрозненні? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Палітычная сфера грамадства»

1. Дайце азначэнні наступным паняццям: *выбарчая сістэма, грамадзянскае грамадства, дзяржава, дэмакратыя, канфедэрацыя, манархія, палітыка, палітычная ідэалогія, палітычная партыя, палітычная сістэма, прававая дзяржава, рэспубліка, унітарная дзяржава, фэдэрацыя.*
2. Як узаемазвязаны паняцці «ўлада», «дзяржава» і «палітыка»?
3. З апорай на тэкст артыкула 1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: «Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава» — вызначце, якая форма праўлення, форма дзяржаўнага ладу і палітычны рэжым замацаваны ў Асноўным Законе нашай дзяржавы.
4. Англійскаму палітычнаму дзеячу Уінстану Чэрчылю належыць выказванне: «Дэмакратыя — найгоршая форма праўлення, калі не лічыць усе астатнія». Як вы разумееце дадзенае выказванне? Ці азначае яно, што палітык адмоўна ставіўся да дэмакратыі?
5. *Тэорыя грамадскага дагавора* з'яўляецца адной з асноўных канцэпцый паходжання дзяржавы. Сутнасць дадзенай тэорыі ў тым, што людзі дамовіліся прыняць пагадненне аб ператварэнні свайго «натуральнага стану» ў «стан грамадзянскі». Грамадскі дагавор азначае пагадненне, якое дасягаецца грамадзянамі па пытаннях правіл і прынцыпаў дзяржаўнага кіравання з адпаведным ім прававым афармленнем. Знайдзіце ў тэкстах параграфаў пацвярджэнне дадзеным ідэям і вызначце, хто з мысліцеляў распрацоўваў тэорыю грамадскага дагавора.
6. Падзяліцеся на групы. У групах стварыце прэзентацыю іміджу ўмоўнага кандыдата ў дэпутаты, падрыхтуйце перадвыбарны зварот кандыдата. Правядзіце перадвыбарныя дэбаты.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. **Палітычная партыя, якая атрымала на выбарах падтрымку большасці выбаршчыкаў, праводзіць праз парламент закон аб забароне другой партыі, што ўдзельнічала ў выбарах і апынулася ў парламенцкай меншасці. Ацаніце дзейнасць кіруючай партыі з пазіцый прынцыпаў дэмакратыі. Патлумачце адказ.**
8. **Ці згодныя вы з наступным меркаваннем: «СМІ з'яўляюцца чацвёртай уладай»? Абгрунтуйце сваю думку.**
9. **У XVI ст. быў выдадзены трактат фларэнційскага мысліцеля і дзяржаўнага дзеяча Нікало Макіявелі пад назвай «Гасудар», у якім апісваюцца метады кіравання і ўменні, неабходныя для ідэальнага правіцеля. Азнаёмцеся з вытрымкай з дадзенага твора.**

«Дык вось, князь не павінен баяцца, што яго зняславяць бязлітасным, калі яму трэба ўтрымаць сваіх падданых у адзінстве і вернасці. Бо, паказаўшы ў крайнасці некалькі страшэнных прыкладаў, ён будзе больш літасцівы да тых, хто праз сваю празмерную паблажлівасць дапускае развіццё беспарадкаў, якія выклікаюць забойствы і рабаванні; гэта звычайна скаланае цэлую абшчыну, а пакаранні, якія накладаюцца князем, падаюць на асобнага чалавека.

Бо той, хто хацеў бы заўсёды верыць у дабро, немінуча загіне сярод мноства людзей, якія цураюцца дабра. Таму князю, які жадае ўтрымацца, неабходна навучыцца ўменню быць недабрадзейным і карыстацца або не карыстацца гэтым.

Зыходзячы з неабходнасці князь павінен быць настолькі мудрым, каб умець пазбягаць бясслаўя тых заганаў, якія пазбаўлялі б яго дзяржавы, іншых жа заганаў, якія не пагражаюць яго панаванню, ён павінен сцерагчыся, калі гэта магчыма; калі ж ён не здольны гэтага зрабіць, то можа даць сабе волю без асаблівых ваганняў».

**З імем Нікало Макіявелі звязваюць крылатую фразу «Мэта апраўдвае сродкі». Выкажыце свае адносіны да поглядаў Н. Макіявелі.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

10. У праграме палітычнай партыі Z адзначаецца: «Партыя і далей будзе паслядоўна выступаць за ажыццяўленне прынцыпу сацыяльнай справядлівасці, годны заробак для людзей працы, дзяржаўную падтрымку адукацыі і аховы здароўя»; у праграмнай заяве партыі X адзначаецца, што яе галоўнай мэтай з'яўляецца «стымуляванне эканамічнай актыўнасці насельніцтва, развіццё свабоднага прадпрымальніцтва за кошт зніжэння падаткаў і змяншэнне ўмяшання дзяржавы ў эканоміку». Вызначце, да якіх тыпаў партый адносяцца партыі Z і X.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Эканамічная сфера грамадства

## III

## 1 Што такое эканоміка?

- Што вырабляць?
- Як вырабляць?
- Для каго вырабляць?

## 2 Як функцыянуе?

- Банк
- Рынак
- Эканамічная сістэма

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Валоданне і карыстанне
- Акцыя і аблігацыя
- Прамыя і ўскосныя падаткі

## 4 Як узаемазвязаны?

- Патрэбы і рэсурсы
- Попыт і прапанова
- Канкурэнцыя і манаполія
- Інфляцыя і беспрацоўе

## 5 Якія бываюць?

- Грошы
- Даходы
- Падаткі
- Крэдыты

**?** **Вытворца або спажывец — ключавая постаць у сучаснай эканоміцы?**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 12. Эканоміка і яе роля ў жыцці чалавека і грамадства

## Чалавек — галоўны фактар вытворчасці і суб’ект эканомікі?




**Паняцце эканомікі.** Пачынаючы вывучэнне эканомікі, перш за ўсё неабходна высветліць, які сэнс укладваецца ў гэта паняцце. Само слова «эканоміка» прыйшло да нас са Старажытнай Грэцыі і ў літаральным перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы значыць «кіраванне асабістай гаспадаркай», або дамаводства.

Старажытнагрэчаскі мысліцель і палітычны дзеяч Ксенафонт упершыню выкарыстоўвае паняцце «эканоміка» ў працы «Дамастрой», што перакладаецца як «Эканоміка». ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У сучаснай мове паняцце «эканоміка» больш мнагазначнае і мае, па меншай меры, два асноўныя значэнні. Па-першае, **эканоміка** — гэта спосаб арганізацыі дзейнасці людзей па стварэнні даброт, неабходных для задавальнення патрэб. Па-другое, **эканоміка** абазначае навуку, якая даследуе, як выкарыстоўваюцца наяўныя абмежаваныя рэсурсы для задавальнення неабмежаваных патрэб. Паколькі эканамічная навука вывучае дзейнасць людзей, то яна належыць да катэгорыі грамадскіх навук разам з сацыялогіяй і паліталогіяй.

Эканоміка вельмі важная для чалавека, паколькі менавіта ў гэтай сферы ствараюцца даброты, неабходныя для жыцця і задавальнення патрэб. З развіццём чалавечага грамадства патрэбы змяняюцца — як па аб'ёме, так і па структуры.

Задавальненне якіх патрэб адбываецца ў наступных сітуацыях: паездка ў грамадскім транспарце, дамашні абед, урок грамадазнаўства ў школе, размова па тэлефоне, прымерка адзення ў магазіне, візіт да стаматолага, прагулка ў парку, прагляд спектакля ў тэатры? ■

**Даброты, рэсурсы, вытворчасць.** Для таго каб чалавек мог задаволіць свае патрэбы, неабходны даброты. *Даброты* — гэта ўсё, што можа задавальняць патрэбы людзей, прыносіць людзям карысць і задавальненне. На заранку гісторыі чалавецтва людзі задавальнялі ўсе свае патрэбы за кошт прыродных даброт. У далейшым абсалютная большасць патрэб стала задавальняцца дзякуючы іх вытворчасці. Створаныя даброты (харчаванне, адзенне, жыллё, дарогі, медыцына і г. д.) прынята называць эканамічнымі. **Вытворчасць** — гэта працэс стварэння эканамічных даброт, а **спажыванне** — працэс непасрэднага задавальнення патрэб. Для таго каб выраблены прадукт трапіў да спажыўца, неабходна яго *размеркаванне* — устанаўленне долі, колькасці, прапорцыі ўдзелу кожнага ў выробленым прадукце, а таксама *абмен* — атрыманне жаданага прадукту з прапановай чагосьці ўзамен.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Працэс вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання даброт называецца *грамадскім узнаўленнем*.

**Грамадскае ўзнаўленне**



**Вытворчасць**



**Размеркаванне**



**Абмен**



**Спажыванне**

Апішыце, што адбываецца з такім таварам, як хлеб, на кожным этапе грамадскага ўзнаўлення. ■

Эканамічныя даброты, выраблены не для ўласнага спажывання, а для абмену, — гэта *тавары*. Асаблівую групу даброт, неабходных чалавеку, складаюць *паслугі*. Яны прапануюцца ў форме мэтанакіраванага карыснага дзеяння (транспартныя, фінансавыя, ахоўныя, медыцынскія, інфармацыйныя, паліграфічныя, навуковыя і інш.). У адрозненне ад тавараў паслугі нельга захоўваць, яны спажываюцца непасрэдна ў момант аказання (напрыклад, стрыжка, уборка, мабільная сувязь).

Для арганізацыі вытворчай дзейнасці па стварэнні эканамічных даброт неабходна мець адпаведныя эканамічныя рэсурсы. *Эканамічныя рэсурсы* ахопліваюць усе віды прыродных і чалавечых магчымасцей, якімі валодае грамадства і якія выкарыстоўваюцца для стварэння эканамічных даброт з мэтай задавальнення чалавечых патрэб. І калі патрэбы чалавека з'яўляюцца неабмежаванымі, то рэсурсы заўсёды абмежаваныя. Эканамічныя рэсурсы можна падзяліць на чатыры групы: працоўныя, прыродныя, фінансавыя і матэрыяльныя.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Эканамічныя рэсурсы

| | |
|---|---|
| **Працоўныя** | Працаздольнае насельніцтва (людзі з рознай прафесійнай падрыхтоўкай, узроўнем кваліфікацыі, прадпрымальніцкімі здольнасцямі і да т. п.) |
| **Прыродныя** | Разведаныя запасы карысных выкапняў, зямля і яе нетры, лясныя і водныя рэсурсы, прыродна-кліматычныя ўмовы |
| **Фінансавыя** | Грашовыя сродкі, якія грамадства гатова выдаткаваць на арганізацыю вытворчасці |
| **Матэрыяльныя** | Сукупнасць сродкаў вытворчасці (сыравіна, матэрыялы, паліва, абсталяванне) |

**Эканамічныя суб'екты і іх узаемасувязі.** Аднак толькі валодаць эканамічнымі рэсурсамі недастаткова. Іх трэба ўключыць у вытворчасць і забяспечыць іх рацыянальнае выкарыстанне. Тая частка эканамічных рэсурсаў, што непасрэдна ўключаецца ў працэс вытворчасці або выкарыстоўваецца ў якасці яе ўмоў, называецца **фактарам вытворчасці** (ад лац. *factor* — які робіць, стварае штонебудзь). Традыцыйна вылучаюць наступныя фактары вытворчасці: зямля, капітал, праца. Большасць эканамістаў дадаюць у гэты пералік інфармацыю і прадпрымальніцкую здольнасць.

*Зямля* як фактар вытворчасці ўяўляе сабой прыродныя рэсурсы, уключаныя ў гаспадарчае абарачэнне. Гэта ворныя землі, лясы, радовішчы мінералаў, крыніцы вады і да т. п. Да дадзенага фактару адносяць не толькі карысныя выкапні, але і сілу ветру, энергію сонца і клімат.

Кажучы пра *капітал*, мы маем на ўвазе створаныя чалавекам рэсурсы, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці. Гэта сродкі вытворчасці і фінансавыя рэсурсы. Адно з самых распаўсюджаных азначэнняў капіталу — выраблены раней даброты, якія выкарыстоўваюцца для вытворчасці іншых эканамічных даброт.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Накіраванне капіталу (маёмасці і грошай) у сферу вытворчасці ці аказання паслуг з мэтай атрымання прыбытку называюць капіталаўкладаннямі, або *інвестыцыямі*.**

Шатландскі эканаміст Адам Сміт, адзін з заснавальнікаў эканамічнай тэорыі, яшчэ ў канцы XVIII ст. адзначаў, што капітал — гэта не рэч, а спосаб выкарыстання рэчы. ■





Выкарыстоўваючы прыведзеныя выявы, вызначце, у якім выпадку аўтамабіль выступае як звычайная даброта, а ў якім — як капітал. ■

Кажучы аб *працы* як фактары вытворчасці, мы маем на ўвазе ўсвядомленую мэтанакіраваную дзейнасць людзей па стварэнні даброт, неабходных для жыцця. Разумовыя і фізічныя здольнасці людзей, іх навыкі і вопыт выкарыстоўваюцца для вытворчасці матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Сярод фактараў вытворчасці асабліва вылучаюць *прадпрымальніцкія здольнасці* — здольнасці чалавека (прадпрымальніка, бізнесмена) праяўляць ініцыятыву па арганізацыі і кіраванні вытворчасцю. Прадпрымальнік рызыкуе і прымае рашэнні, якія не заўсёды гарантуюць прыбытак. Для паспяховага прадпрымальніцтва патрэбны глыбокія прафесійныя веды, уменні ўводзіць у працэс вытворчасці новую тэхніку і тэхналогію.

Відавочна, што ў наш час адным з найважнейшых фактараў вытворчасці таксама з'яўляецца *інфармацыя* — веды,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

навуковыя дасягненні і тэхналогіі, патэнты на выкарыстанне вынаходстваў.

## Фактары вытворчасці




Размяркуйце фактары вытворчасці кампаніі X па катэгорыях «праца», «зямля», «капітал», «прадпрымальніцкая здольнасць», «інфармацыя»: праграмісты, якія пішуць праграмы; заснавальнік кампаніі; месца, дзе размяшчаюцца офісы кампаніі; будаўнікі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі кампаніі; самалёт, што належыць кампаніі; праграмнае забеспячэнне. ■

**У працэсе эканамічнай дзейнасці асноўныя фактары вытворчасці не функцыянуюць самі па сабе, а выкарыстоўваюцца *эканамічнымі суб'ектамі*. Эканамічныя суб'екты падзяляюцца на тры вялікія групы: дамашнія гаспадаркі (домагаспадаркі), прадпрыемствы, дзяржава.**

## Эканамічныя суб'екты

| Дамашнія гаспадаркі (домагаспадаркі) | Прадпрыемствы | Дзяржава |
|---|---|---|

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Галоўная з дзеючых асоб эканомікі — чалавек, сям’я, або, як вызначаюць эканамісты, дамашняя гаспадарка. *Домагаспадарка* — гэта суб’ект эканомікі, які складаецца з аднаго чалавека, які вядзе самастойную гаспадарку, ці групы людзей (сям’і), якія пражываюць сумесна, вядуць агульную гаспадарку з выкарыстаннем наяўных рэсурсаў. Домагаспадаркі з’яўляюцца ўласнікамі асобных фактараў вытворчасці і імкнуцца да максімальнага задавальнення сваіх патрэб.

*Прадпрыемства* з’яўляецца эканамічным суб’ектам, які выкарыстоўвае фактары вытворчасці для стварэння даброт і імкнецца да атрымання максімальнага прыбытку.

*Дзяржава* — гэта эканамічны суб’ект, які ўстанаўлівае правілы эканамічнай дзейнасці і з’яўляецца яе рэгулятарам, пераразмяркоўвае частку рэсурсаў у інтарэсах усяго грамадства ў цэлым, стварае грамадскія даброты, якія спажываюцца ўсімі грамадзянамі краіны (ахова навакольнага асяроддзя, правапарадку, нацыянальная абарона і інш.).

Асноўнымі пытаннямі эканомікі з’яўляюцца: што, як і для каго выраблядь ва ўмовах абмежаванасці рэсурсаў?

*Што вырабляць?* Прадпрыемствы, дзяржава прымаюць рашэнні, якія тавары і паслугі павінны быць выраблены з выкарыстаннем наяўных рэсурсаў і прапанаваны спажыўцу.

*Як вырабляць?* Вырашэнне гэтага пытання звязана з выбарам эканамічных рэсурсаў, тэхналогіі, месца размяшчэння прадпрыемства, арганізацыі вытворчасці. Вытворца, вырашаючы праблему «выдаткі — выпуск», імкнецца знайсці найлепшыя спосабы камбінацыі рэсурсаў і арганізацыі сваёй вытворчасці. У той жа час дзяржава выступае рэгулятарам у пытаннях размяшчэння небяспечных, шкодных вытворчасцей, выканання экалагічных норм.

*Для каго вырабляецца прадукт?* Грамадства павінна вырашыць, што яно лічыць справядлівым размеркаваннем, і затым выбраць



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

спосаб дасягнення такога размеркавання выраблених тавараў і паслуг паміж спажыўцамі.

**Паняцце эканамічнай сістэмы.** Развіццё грамадства паказала магчымасць існавання некалькіх варыянтаў арганізацыі эканамічнага жыцця. Яны атрымалі назву эканамічных сістэм. *Эканамічная сістэма* ўяўляе сабой сістэму па арганізацыі і кіраванні адносінамі паміж эканамічнымі суб'ектамі ў працэсе вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання эканамічных даброт.

Для вызначэння эканамічных сістэм выкарыстоўваюць два асноўныя крытэрыі:

1) хто валодае фактарамі вытворчасці;

2) спосаб каардынацыі і кіравання эканамічнай дзейнасцю.

Вылучаюць наступныя асноўныя эканамічныя сістэмы: традыцыйная эканоміка, рыначная эканоміка, планавая эканоміка, змешаная эканоміка.

### Эканамічныя сістэмы

| Традыцыйная эканоміка | Рыначная эканоміка | Планавая эканоміка |
|---|---|---|
| • Заснавана на звычаях і традыцыях<br>• Калектыўная ўласнасць племя ці абшчыны | • Свабода прадпрымальніцкага выбару<br>• Дзеянне рыначных механізмаў<br>• Прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці | • Рашэнні прымаюцца дзяржавай (цэнтралізаванае планаванне)<br>• Дырэктыўнае размеркаванне<br>• Дзяржаўная ўласнасць на сродкі вытворчасці |

**Змешаная эканоміка**

Спалучэнне рэгулюючай ролі дзяржавы і эканамічнай свабоды вытворцаў, дзе прыватная ўласнасць і дзяржаўная ўласнасць узаемадзейнічаюць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ці існуюць у наш час краіны з традыцыйнай эканомікай?

Што такое Вялікая дэпрэсія? Які ўплыў яна аказала на развіццё рыначнай эканомікі?

Якія станоўчыя і адмоўныя рысы планавай эканомікі? ■

Кожная з эканамічных сістэм шукае свае падыходы да вырашэння галоўных эканамічных пытанняў і размеркавання абмежаваных рэсурсаў. У самым агульным выглядзе можна назваць тры шляхі вырашэння грамадствам галоўных пытанняў эканомікі: згодна з заведзенымі здаўна звычаямі (па традыцыі); шляхам аддачы распараджэнняў і загадаў «зверху ўніз» (каманднымі метадамі); з дапамогай рыначных механізмаў.

У чыстым выглядзе пералічаныя эканамічныя сістэмы сёння не існуюць. Для большасці развітых краін характэрна змешаная эканоміка.

Для таго каб зразумець, як функцыянуе любая эканамічная сістэма, неабходна высветліць, як складваюцца ў грамадстве адносіны паміж разнастайнымі эканамічнымі суб'ектамі ў сувязі з размеркаваннем і прысваеннем эканамічных даброт.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Як суадносяцца паняцці «эканамічныя рэсурсы» і «фактары вытворчасці»?
2. Ахарактарызуйце працэс грамадскага ўзнаўлення. Ці ёсць адрозненні ў розных эканамічных сістэмах?
3. Чаму сучасная эканоміка з'яўляецца змешанай?
4. Разгледзьце схему працэсу вырошчвання і перапрацоўкі льну.



**Пасевы льну**
- Вырошчванне
- Уборка



**Перапрацоўка льну**
- Вымочванне
- Сушка
- Трапанне
- Прасаванне



**Вынікі льно-перапрацоўкі**

Тканіна, пакулле, ільняны алей, ільняное насенне, вяроўка, паліўныя пелеты, папера для грошай

Якія фактары вытворчасці задзейнічаны на кожным этапе? Складзіце і запоўніце табліцу. ■

| Праца | Зямля | Капітал | Прадпрымальніцкая здольнасць | Інфармацыя |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Выканайце міні-праект «Інфармацыя як фактар вытворчасці». Прывядзіце прыклады таго, як выкарыстанне інфармацыі як фактару вытворчасці выклікала рэвалюцыйныя змены ў вытворчасці тавараў і паслуг. Афарміце свой праект у выглядзе рэкламнага медыятэксту. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 13. Уласнасць і даходы

## Чым больш уласнасці — тым вышэйшыя даходы?




**Адносіны ўласнасці.** У паўсядзённым жыцці пра ўласнасць кажуць, калі неабходна вызначыць, каму належыць рэч. Напрыклад, «гэта мой дом» або «гэта мой аўтамабіль». Але ўласнасць — гэта не проста стаўленне асобнага чалавека ці групы людзей да пэўнай рэчы як да сваёй. З эканамічнага пункту погляду ўласнасць складаюць адносіны з нагоды прыналежнасці рэчаў, пэўных эканамічных даброт.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Уласнасць** — гэта прызнаныя грамадствам стасункі ў сувязі з размеркаваннем і прысваеннем эканамічных даброт паміж разнастайнымі суб’ектамі эканамічных адносін. Катэгорыя «ўласнасць» — гэта вынік факта абмежаванасці рэсурсаў і магчымасці іх альтэрнатыўнага прымянення. Паколькі пытанні ўласнасці закранаюць непасрэдна інтарэсы людзей, узнікае неабходнасць іх прававога рэгулявання — права ўласнасці замацоўваецца законам.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 44.** Дзяржава гарантуе кожнаму права ўласнасці і садзейнічае яе набыццю.

Уласнік мае права валодаць, карыстацца і распараджацца маёмасцю як аднаасобна, так і сумесна з іншымі асобамі. Недатыкальнасць уласнасці, права атрымання яе ў спадчыну ахоўваюцца законам.

Уласнасць, набытая законным спосабам, абараняецца дзяржавай.

Суб’ект уласнасці (уласнік) — асоба ці група асоб, якія валодаюць якой-небудзь маёмасцю, распараджаюцца і карыстаюцца ёй. Уласнікамі могуць быць асобныя людзі (фізічныя асобы), арганізацыі і прадпрыемствы (юрыдычныя асобы), у тым ліку замежныя. Аб’екты ўласнасці могуць быць матэрыяльныя (дом, адзенне), нематэрыяльныя (аўтарскія правы на выраб, патэнты на вынаходствы).

Адносіны ўласнасці ўяўляюць сабой адносіны валодання, карыстання, распараджэння. *Валоданне* — гэта юрыдычна замацаваны факт, які азначае рэальнае ўладанне аб’ектам уласнасці. *Карыстанне* — гэта выкарыстанне аб’екта ўласнасці ў адпаведнасці з яго прызначэннем па жаданні карыстальніка, які прысвойвае карысныя вынікі. *Распараджэнне* — гэта кіраванне ўласнасцю (продаж, дарэнне, перадача ў арэнду і інш.).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Валоданне



Карыстанне



Распараджэнне

Ці можна карыстацца рэччу, не валодаючы ёй? Ці можа быць так, што чалавек валодае рэччу, але не мае права карыстацца ёй?

**Уласнік мае права здзяйсняць у адносінах да маёмасці, што належыць яму, любыя дзеянні, якія не супярэчаць законам, безумоўна, калі гэтыя дзеянні не парушаюць правоў іншых суб'ектаў. Пры гэтым уласнік нясе адказнасць за сваю маёмасць. *Адказнасць* мае на ўвазе забеспячэнне належнага выкарыстання аб'екта ўласнасці. У тых выпадках, калі гэта патрабаванне не выконваецца, уласнік павінен кампенсаваць нанесены ўрон, напрыклад калі гэта звязана з невыкананнем эканамічных абавязацельстваў, забруджваннем навакольнага асяроддзя, парушэннем правоў іншых суб'ектаў.**

Прааналізуйце наступныя артыкулы Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь:

- Артыкул 211. Цяжар утрымання маёмасці.
- Артыкул 212. Рызыка выпадковай гібелі маёмасці.

Растлумачце на прыкладах, што канкрэтна мае на ўвазе цяжар утрымання маёмасці. На каго ўскладзены гэты цяжар і рызыкі гібелі і пашкоджання маёмасці?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Існуюць розныя спосабы набыцця права ўласнасці. Першасныя маюць на ўвазе ўзнікненне права ўласнасці ў выніку стварэння рэчы, знаходжання і збору агульнадаступных рэчаў (грыбоў, ягад і інш.), а другасныя (вытворныя) — пераход ужо існуючага права да другога ўласніка ў выніку продажу, дарэння, абмену, атрымання ў спадчыну.

**Асноўныя формы ўласнасці.** Форма ўласнасці залежыць ад таго, хто з'яўляецца суб'ектам яе прысваення. У заканадаўстве Рэспублікі Беларусь зафіксаваны дзве формы ўласнасці: дзяржаўная і прыватная. *Прыватная ўласнасць* мае на ўвазе прысваенне даброт (ці правоў уласнасці) адзінкавай асобай або групай асоб. Яна прадстаўлена асабістай і індывідуальнай прыватнай уласнасцю, а таксама калектыўнай (акцыянернай і кааператыўнай) уласнасцю.

| Прыватная ўласнасць | |
|---|---|
| **Асабістая** | Аб'екты ўласнасці, што не прыносяць даходу, выкарыстоўваюцца і спажываюцца самім уласнікам (прадметы ўжытку) |
| **Індывідуальная** | Аб'екты, што прыносяць даход (сродкі вытворчасці) |
| **Калектыўная** | • **Акцыянерная ўласнасць (долевая)**<br>Ствараецца шляхам выпуску і продажу каштоўных папер — акцый. Уладальнік акцыі становіцца адным з уласнікаў прадпрыемства і мае права на атрыманне дывідэндаў — часткі прыбытку прадпрыемства<br>• **Кааператыўная ўласнасць (сумесная)**<br>Ствараецца шляхам аб'яднання маёмасных або грашовых узносаў, мае на ўвазе сумеснае выкарыстанне ўласнасці |

Пры якіх умовах прадмет асабістага карыстання можа стаць фактарам вытворчасці? Напрыклад, смартфон, веласіпед, камп'ютар, аўтамабіль. ■

Паводле характару накаплення прыватная ўласнасць можа быць працоўнай і непрацоўнай. Працоўная ўласнасць фарміруецца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

за кошт заработнай платы наёмных работнікаў, даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці. Непрацоўная ўласнасць ствараецца за кошт атрымання маёмасці ў спадчыну ці ў выніку дарэння, даходаў ад каштоўных папер, укладаў у банку і г. д.

Разам з прыватнай уласнасцю існуе *дзяржаўная ўласнасць* — гэта ўласнасць грамадства (народа) у цэлым, якой валодае і распараджаецца дзяржава, а вынікі выкарыстоўваюць усе людзі. Дзяржаўная ўласнасць распаўсюджваецца на асноўныя прыродныя багацці, а таксама на тыя аб’екты, якія служаць здзяйсненню мэт, што стаяць перад дзяржавай. Яна пераважае ў галінах, якія маюць агульнаэканамічнае значэнне, паколькі неабходны грамадству ў цэлым і, у тым ліку, патрабуюць вялікіх затрат.

Акрамя таго, магчыма аб’яднанне маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці розных эканамічных суб’ектаў, і ўтварэнне на гэтай аснове *змешаных формаў* уласнасці, у тым ліку ўласнасці сумесных прадпрыемстваў — прадпрыемстваў з замежным капіталам.

У дзяржавах, якія маюць федэратыўнае ўладкаванне, існуе федэральная ўласнасць і ўласнасць суб’ектаў федэрацыі. Ва ўнітарных дзяржавах існуе агульнадзяржаўная ўласнасць і ўласнасць камунальная, якой распараджаюцца органы мясцовага кіравання і самакіравання адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (такіх як вобласці, раёны, гарады, сельсаветы і пасёлкі гарадскога тыпу).

Назавіце некалькі прадпрыемстваў вашага раёна і вызначце, у якой уласнасці яны знаходзяцца (дзяржаўнай ці прыватнай). ■

Разнастайнасць форм уласнасці фарміруецца ў ходзе працэсаў раздзяржаўлення і прыватызацыі. *Раздзяржаўленне эканомікі* — гэта працэс змяншэння ролі дзяржавы ў непасрэдным кіраванні эканамічнымі аб’ектамі. Ён ажыццяўляецца пры дапамозе разнастайных механізмаў, у тым ліку шляхам прыватызацыі. *Прыватызацыя* ўяўляе сабой перадачу аб’ектаў дзяржаўнай уласнасці (у выніку продажу або бязвыплатна) у прыватную


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ўласнасць. Напрыклад, дзяржаўныя прадпрыемствы могуць быць прададзены на аўкцыёне, удзельнікамі якога могуць стаць прыватныя асобы ці іх аб'яднанні, у тым ліку замежныя інвестары.

Прыгадайце, як называецца працэс пераводу прыватнай уласнасці (шляхам бязвыплатнага адчужэння ці праз выкуп) у дзяржаўную. ■

**Віды даходаў.** Даходы — канчатковая мэта дзеянняў кожнага актыўнага ўдзельніка эканамічнай дзейнасці, аб'ектыўны і магутны стымул у паўсядзённым жыцці. У шырокім сэнсе **даход** абазначае любое паступленне грашовых сродкаў ці атрыманне матэрыяльных даброт. Першаснымі называюцца даходы, атрыманыя ў выніку ажыццяўлення якой-небудзь дзейнасці ў сферы вытворчасці (напрыклад, уладальнік прадпрыемства атрымлівае прыбытак, а наёмны работнік — заработную плату). Другаснымі называюцца даходы, якія фарміруюцца ў выніку пераразмеркавання першасных даходаў, у асноўным праз дзяржаўныя падаткі (напрыклад, *трансферты* (выплаты) насельніцтву — пенсіі, стыпендыі, грашовыя дапамогі).

Выкарыстанне кожнага фактару вытворчасці дае пэўны прыбытак. Уласнікі працы атрымліваюць даход у выглядзе заработнай платы. Вылучаюць дзве асноўныя формы заработнай платы — *пагадзінную* і *здзельную*.

**Формы аплаты працы**

| Пагадзінная | Здзельная |
|---|---|
| Аплата працы ўстанаўліваецца на аснове фактычна адпрацаванага часу па пэўных стаўках, у залежнасці ад кваліфікацыі работніка, складанасці, якасці і ўмоў яго працы | Заработная плата разлічваецца на аснове колькасці выраблены прадукцыі пэўнай якасці або аказаных паслуг |

Якая форма заработнай платы, на ваш погляд, робіцца больш распаўсюджанай у нашы дні? Чаму? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Таксама існуе паняцце *мінімальнай заработнай платы*. Гэта самы нізкі дапушчальны памер аплаты працы для ўсіх без выключэння сфер эканамічнай дзейнасці. Плаціць ніжэй за яе за работу ў нармальных умовах пры ўсталяванай працягласці працоўнага часу наймальнік не мае права.

Уладальнік зямельнага ўчастка ці іншага прыроднага рэсурсу, які сам выкарыстоўвае яго з гаспадарчымі мэтамі або дае гэтую магчымасць іншым, атрымлівае даход, які называецца *рэнтай* (ад лац. *reddita* — выплачанае). Уладальнік капіталу (матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў) атрымлівае даход у форме платы за іх выкарыстанне — працэнта. *Прыбытак* — розніца паміж выручкай і выдаткамі на вытворчасць — з'яўляецца ўзнагародай за новыя ідэі і рызыкі. *Роялці* — гэта даход аўтара твора, плата за аўтарскія правы. Структура даходаў з'яўляецца важным паказчыкам дабрабыту грамадства.

Сям'я Іваноўскіх складаецца з шасці чалавек. Сяргей Іваноўскі (45 гадоў) працуе эканамістам у банку і з'яўляецца адным з яго акцыянераў. Яго жонка Ірына (40 гадоў) працуе настаўніцай у школе, аднак у дадзены момант знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе двухгадовай дачкі Стэфаніі. Старэйшы сын Раман ужо студэнт-другакурснік, а сярэдняя дачка Ульяна — вучаніца 5-га класа. З імі пражывае бабуля Алена Казіміраўна (70 гадоў), якая здае ў наём кватэру, што знаходзіцца ў яе ўласнасці.

Ахарактарызуйце магчымыя даходы гэтай сям'і. ■

**Пражытачны мінімум.** Важным паказчыкам і вынікам эканамічнага жыцця грамадства з'яўляецца *ўзровень жыцця* яго членаў. Гэты паказчык характарызуе ступень забяспечанасці людзей матэрыяльнымі дабротамі і задавальнення іх патрэб. Для вызначэння ўзроўню жыцця насельніцтва выкарыстоўваюцца розныя паказчыкі: памеры даходу на душу насельніцтва (сярэднестатыстычны даход, што атрымліваецца асобна ўзятым чалавекам у краіне за год), доля расходаў


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**на харчаванне ў сямейным бюджэце, спажыванне тавараў працяглага карыстання, колькасць жылой плошчы на аднаго чалавека і інш.**

Існуе эканамічны закон, згодна з якім доля расходаў, выдаткаваных на харчаванне, тым большая, чым ніжэйшыя даходы. Напрыклад, багаты чалавек расходуе на харчаванне 10 % свайго даходу, а бедны 60—70 % і больш. З ростам даходаў удзельная вага расходаў на харчаванне зніжаецца, доля расходаў на адзенне, жыллё і камунальныя паслугі крыху павялічваецца, значна ўзрастае доля расходаў на задавальненне культурных і іншых нематэрыяльных патрэб (падарожжы, спорт і г. д.), а таксама на зберажэнні.

Праілюструйце дзеянне гэтага закону канкрэтнымі жыццёвымі прыкладамі. ■

**У нашай краіне для ацэнкі ўзроўню матэрыяльнай забяспечанасці звычайна выкарыстоўваюць такі паказчык, як *бюджэт пражытачнага мінімуму* (БПМ) — кошт мінімальнага набору матэрыяльных даброт і паслуг, неабходных для забеспячэння жыццядзейнасці чалавека і захавання яго здароўя. Ён улічвае таксама абавязковыя плацяжы і ўзносы. Бюджэт пражытачнага мінімуму штоквартальна зацвярджаецца пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.**

Даведайцеся, колькі зараз складае БПМ для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп (працаздольнае насельніцтва, пенсіянеры, студэнты, дзеці ва ўзросце да 3 гадоў, ад 3 да 6 гадоў, ад 6 да 18 гадоў) і ў сярэднім на душу насельніцтва. ■

**Даходы ўплываюць на якасць жыцця, паводзіны і свядомасць людзей. Маючы дастатковыя сродкі, чалавек можа набыць сродкі вытворчасці і стаць уласнікам, прадпрымальнікам. У сваю чаргу даходы (дабрабыт) людзей залежаць ад гатоўнасці атрымліваць**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адукацыю, мяняць адну працу на іншую, рабіць прафесійную кар’еру. Непасрэдны ўплыў на ўзровень даходаў насельніцтва аказваюць эфектыўнасць эканамічнай сістэмы і сацыяльная палітыка, якая праводзіцца дзяржавай.

1. Прывядзіце прыклады адносін валодання, карыстання, распараджэння ўласнасцю.
2. Што такое пражытачны мінімум? Чаму ў розных краінах ён вымяраецца па-рознаму?
3. Даведайцеся ў сваіх бацькоў, што з’яўляецца аб’ектам уласнасці вашай сям’і. Спытайце, як яны разумеюць свае правы ў якасці ўладальнікаў уласнасці. Супастаўце інфармацыю з тым, што вы даведаліся з тэксту параграфа. ■

Правядзіце міні-даследаванне на тэму «Знаходка: удача ці праблема?», прааналізаваўшы палажэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь:

- артыкулы 228 (Знаходка), 229 (Набыццё права ўласнасці на знаходку), 234 (Скарб) Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь;
- артыкул 10.6 (Прысваенне знойдзенай маёмасці) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь;
- артыкул 215 (Прысваенне знойдзенай маёмасці) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 14. Грашова-крэдытная сістэма




**Грошы, іх функцыі і формы.** Грошы з'яўляюцца адным з найвялікшых вынаходстваў чалавецтва.

У эканоміцы грошы забяспечваюць рух рэсурсаў і тавараў ад прадаўцоў да спажыўцоў і з'яўляюцца яе значнай састаўной часткай. Зладжанае функцыянаванне грашовай сістэмы спрыяе

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

паспяховаму развіццю эканомікі, а разбалансаванне грашовага абарачэння можа нанесці ёй цяжкі ўрон.

**Грошы** — гэта ўсеагульны эквівалент (мера) кошту, сродак абарачэння, плацяжу і зберажэння.

Сутнасць і эвалюцыя грошай праяўляецца ў іх функцыях, якія адлюстроўваюць магчымасці і прынцыпы іх выкарыстання. У эканоміцы грошы маюць наступныя функцыі.

| Функцыі грошай | |
|---|---|
| **Мера кошту** | Грошы выражаюць кошт тавару. Грошы з'яўляюцца сродкам вымярэння і выражэння цаны на тавар ці паслугу |
| **Сродак абарачэння** | Грошы выконваюць ролю пасрэдніка. Калі тавар пераходзіць ад прадаўца да пакупніка, грошы пераходзяць ад пакупніка да прадаўца. Адбываецца абарачэнне тавараў і абарачэнне грошай |
| **Сродак плацяжу** | Грошы абслугоўваюць пагашэнне разнастайных пазыковых абавязацельстваў паміж суб'ектамі эканамічных адносін. Напрыклад, купля-продаж тавару ў крэдыт (з адтэрміноўкай плацяжу), выплата ганарару аўтару за раней выдадзеную працу і г. д. |
| **Сродак зберажэння і накаплення** | Грошы з'яўляюцца ўвасабленнем багацця. Яны выкарыстоўваюцца ў якасці фінансавага рэзерву і спосабу набыцця дарагіх тавараў |
| **Сусветныя грошы** | Грошы выкарыстоўваюцца як мера абмену адной валюты на другую. На працягу многіх стагоддзяў функцыю сусветных грошай выконвала золата. У сучаснасці сусветнымі грашыма з'яўляюцца валюты вядучых развітых краін (долары ЗША, еўра, брытанскія фунты, японскія іены) |

Якая функцыя грошай выяўляецца пры адкрыцці бацькамі ўкладу ў банку пасля нараджэння дзіцяці? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Першапачаткова ролю грошай выконваў тавар, які быў найбольш значным і ходкім у пэўнай мясцовасці. Паступова гэтая роля замацавалася за высакароднымі металамі — золатам і срэбрам. У далейшым развіццё вытворчасці і павелічэнне аб'ёму выробленых тавараў прывяло да замены залатых і срэбных манет папяровымі грашыма і манетамі з некаштоўных металаў. Такім чынам, на змену паўнацэнным грашам (таварным і металічным з каштоўных металаў) прыйшлі грошы непаўнацэнныя, або *сімвалічныя*, паколькі іх пакупніцкая здольнасць у якасці грошай (напрыклад, папяровыя банкноты) значна пераўзыходзіць выдаткі на іх вытворчасць.

Грашовае абарачэнне складаецца з наяўных і безнаяўных грошай. Пад *наяўнымі* грашыма разумеюцца металічныя (манеты) і папяровыя (банкноты) грошы.



*Вішчынскі манетна-рэчавы скарб быў знойдзены на тэрыторыі Рагачоўскага раёна ў 1979 г. У ім прадстаўлены рэчы і грашовыя зліткі са срэбра*



Абапіраючыся на веды па гісторыі, назавіце асноўныя тавары, якія выкарыстоўваліся ў якасці грошай на тэрыторыі Беларусі і Еўропы ў цэлым. Прыгадайце, якія грошы з высакародных металаў былі ў абарачэнні на тэрыторыі Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі. ■

Актуальнай задачай у абарачэнні папяровых грошай з'яўляецца іх абарона ад падробкі. Як адрозніць сапраўдныя грошы ад фальшывых? Якія спецыяльныя меткі для слабавідушчых людзей ёсць на банкнотах беларускага рубля? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Безнаяўныя грошы* ўяўляюць сабой запісы на рахунках у банку. Уладальнік рахунку мае права распараджацца гэтымі грашыма. Напрыклад, выпісаць банкаўскі чэк на пэўную суму або выкарыстоўваць плацежную банкаўскую картку. З яе дапамогай безнаяўным шляхам можна разлічвацца за тавары і паслугі, весці разлікі ў розных валютах. Безнаяўныя грошы маюць важнае значэнне ў сучасных эканамічных адносінах, пры гэтым выкарыстанне наяўных грошай паступова зніжаецца.

## Як купляць з кэшбэкам




З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі вызначце, што такое кэшбэк. Сфармулюйце ролю дадзенага механізма ў стымуляванні безнаяўных плацяжоў. ■

Прывядзіце аргументы «за» і «супраць» безнаяўнай аплаты тавараў і паслуг. ■

З функцыянаваннем грошай у эканоміцы шчыльна звязана верагоднасць інфляцыі. **Інфляцыя** (лац. *inflatio* — уздуцце) — гэта абясцэньванне грошай, выклікане перавышэннем колькасці грошай, што знаходзяцца ў абарачэнні, над іх таварным пакрыццём. Інфляцыя можа прывесці да парушэння грашовага


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

абарачэння ў эканоміцы, пра што пойдзе гаворка ў наступных параграфах.

Наяўнасць дастатковай колькасці грошай неабходна як прадпрыемствам для арганізацыі вытворчасці, так і спажыўцам для набыцця тавараў і паслуг. Калі ў каго-небудзь з іх недастаткова сродкаў для нармальнага функцыянавання, неабходна звяртацца да магчымасцей *крэдытнай сістэмы*. Гэта сукупнасць установ і арганізацый, якія накапліваюць грашовыя сродкі і займаюцца крэдытаваннем. Ключавую ролю ў гэтай сістэме адыгрываюць банкі.

**Банкі і іх функцыі. Банк** (італ. *banco* — лава, крама мянялы) — фінансавая ўстанова (а па сутнасці прадпрыемства), якая спецыялізуецца на накапленні грашовых сродкаў, крэдытаванні, пасрэдніцтве ў грашовых разліках і аперацыях з каштоўнымі паперамі. Для таго каб атрымаць прыбытак, банку неабходна прыцягнуць як мага больш укладчыкаў, якія дадуць яму права часова карыстацца іх грашовымі сродкамі за пэўную плату, і за яшчэ большую плату перадаць у часовае карыстанне прыцягнутыя грашовыя сродкі пазычальнікам (тым, каму патрэбны грошы). Розніца паміж платай пазычальніка банку і платай банка ўкладчыку складае даход банка (банкаўскі працэнт).

Банкі могуць быць як універсальнымі, так і спецыялізаванымі. *Універсальныя* банкі выконваюць усе банкаўскія аперацыі (па некаторых ацэнках, ад 100 да 300 відаў) для сваіх кліентаў. *Спецыялізаваныя* банкі могуць абслугоўваць пэўную галіну, сферу гаспадарання або групу кліентаў ці выконваць невялікую колькасць аперацый. Напрыклад, іпатэчныя банкі ажыццяўляюць крэдытныя аперацыі па прыцягненні і размяшчэнні сродкаў на доўгатэрміновай аснове пад заклад нерухомай маёмасці.

Асаблівае месца ў банкаўскай сістэме любой краіны займае цэнтральны банк, які працуе ў інтарэсах грамадства ў цэлым. У нашай краіне цэнтральным банкам з'яўляецца Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны банк ажыццяўляе захоўванне афіцыйных золатавалютных рэзерваў і мае выключнае

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

права грашовай *эмісіі* — выпуску грошай у абарачэнне (друкаванне банкнот, чаканка манет). На аснове спецыяльных разлікаў цэнтральны банк дзяржавы вырашае, колькі грошай у цэлым (наяўных і безнаяўных) патрабуецца эканоміцы краіны. Калі грошай не хапае, то цэнтральны банк пазычае іх банкам, а калі зашмат — пазычае ў іх. Такім чынам, грошы або трапляюць у абарачэнне, або вымаюцца з яго, і тым самым падтрымліваецца дастатковая колькасць грошай у абарачэнні.

**Уклады і крэдытаванне.** Калі ў чалавека ёсць свабодныя грошы, то найбольш распаўсюджаным спосабам зарабіць на іх з'яўляецца размяшчэнне ў банк на дэпазіт. *Дэпазіт* (банкаўскі ўклад) уяўляе сабой суму грошай, размешчаную ўкладчыкам у банку на пэўны тэрмін або да запатрабавання. За выкарыстанне ўкладзеных сродкаў банк выплачвае ўкладчыку прэмію ў выглядзе працэнтаў. Гарантыі вяртання ўкладаў зафіксаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: «Дзяржава заахвочвае і ахоўвае зберажэнні грамадзян, стварае гарантыі вяртання ўкладаў».





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Што неабходна ўлічваць пры выбары банка для размяшчэння сваіх зберажэнняў? З якога ўзросту грамадзяне Рэспублікі Беларусь могуць самастойна адкрываць у банку ўклад (дэпазіт)? ■

Калі ў адных грамадзян ёсць свабодныя грошы, якія яны маюць магчымасць размясціць на дэпазіт, то другім іх нестае для набыцця якога-небудзь тавару, напрыклад кватэры ці жылога дома, аўтамабіля і г. д. У такім выпадку яны могуць звярнуцца ў банк па крэдыт. **Крэдыт** (ад лац. *creditum* — пазыка, доўг) — гэта грашовыя сродкі, выдзеленыя банкам іншай асобе (атрымальніку крэдыту) у памеры і на ўмовах, прадугледжаных крэдытным дагаворам.

## Асноўныя прынцыпы крэдытавання

| Прынцып зваротнасці | Прынцып платнасці | Прынцып тэрміновасці |
| --- | --- | --- |
| Уся сума крэдыту павінна быць вернута поўнасцю ў вызначаны дагаворам тэрмін | Плата за часовую пазыку ў банку грашовых сродкаў (працэнты за карыстанне крэдытам) | Крэдыт выдаецца на пэўны тэрмін, прадугледжаны дагаворам крэдыту |

Выкарыстоўваючы Адзіны інтэрнэт-партал фінансавай граматнасці насельніцтва (http://fingramota.by), стварыце памятку «Выбіраем крэдыт». Напішыце ў ёй рэкамендацыі, на што варта звяртаць увагу пры афармленні крэдыту. ■




Крэдыты заўсёды выдаюцца на строга вызначаны тэрмін. Калі пазычальнік не вяртае грошы да вызначанай у крэдытным дагаворы даты, то банк пачынае браць штраф за пратэрміноўку пагашэння крэдыту, а далей спаганяе грошы ці маёмасць праз суд. Перад тым як выдаць крэдыт, банк ацэньвае крэдытаздольнасць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**пазычальніка. У якасці забеспячэння крэдыту, як правіла, выступае маёмасны заклад або паручыцельства трэціх асоб. У выпадку невяртання грошай банку перадаецца маёмасць пазычальніка або крэдыт выплачвае паручыцель.**

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь вядзе крэдытны рэгістр — інфармацыйную сістэму, якая захоўвае звесткі пра крэдытную гісторыю пазычальнікаў — як яны выконвалі свае абавязацельствы перад банкамі. З якой мэтай, на ваш погляд, быў створаны дадзены крэдытны рэгістр? ■

У навінах часта сустракаецца інфармацыя пра змяненне Нацыянальным банкам *стаўкі рэфінансавання* — велічыні працэнтаў, якія выплачваюць цэнтральнаму банку камерцыйныя банкі за карыстанне выдзеленымі ім крэдытамі. Як уплывае змяненне стаўкі рэфінансавання на інтарэсы чалавека, які робіць уклад у банк або бярэ крэдыт у банку? ■

**Найбольш распаўсюджанымі крэдытамі для насельніцтва з боку банкаў выступаюць: спажывецкі крэдыт, аўтакрэдыт, *іпатэчны* (мэтавы крэдыт, пры якім набытая нерухомасць выступае ў якасці закладу).**



Высветліце, пра што ідзе гаворка ў дадзеным рэкламным паведамленні: «Наш банк прапануе вам карту з *авердрафтам* з *грэйс-перыядам* 45 дзён». Што гэта значыць для спажыўца? На якіх умовах у выпадку неабходнасці можна атрымаць грошы на пакупкі? ■

**Існуе і такая форма крэдытавання, як лізінг. *Лізінг* уяўляе сабой доўгатэрміновую арэнду маёмасці (абсталявання, нерухомасці, аўтамабіля) з наступным правам яго выкупу. Лізінгавая кампанія прапануе пакупніку тавар, але захоўвае права ўласнасці на яго за сабой да той пары, пакуль сума за яго не будзе выплачана поўнасцю. Тады права ўласнасці пераходзіць да пакупніка.**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сфармулюйце, у чым будзе заключацца розніца ў праве ўласнасці на аўтамабіль, куплены ў крэдыт і куплены ў лізінг. Як гэта паўплывае на памеры працэнтнай стаўкі? Яна будзе вышэйшай пры куплі тавару ў крэдыт ці ў лізінг? ■

**Калі пазычальнікам выступае дзяржава, а крэдыторамі — банкі і насельніцтва, прадпрыемствы і арганізацыі, мае месца дзяржаўны крэдыт. Для запазычання неабходных грашовых сродкаў дзяржава выпускае і прадае каштоўныя паперы: *казначэйскія вэксалі* (грашовае абавязацельства, згодна з якім прад'яўніку выплачваецца ўказаная сума грашовых сродкаў у вызначаны дакументам тэрмін), *аблігацыі* (каштоўная папера, у якой указваецца абавязацельства вярнуць праз пэўны тэрмін выплачаныя за яе грошы і выплаціць даход у выглядзе фіксаванага працэнта). Купляючы іх, эканамічныя суб'екты выступаюць крэдыторамі ў адносінах да дзяржавы.**

1. Якія функцыі выконваюць грошы ў эканоміцы?
2. Растлумачце, чаму стаўкі па крэдытах вышэйшыя, чым па ўкладах.
3. Якія паслугі аказваюць банкі, акрамя розных відаў крэдытаў? Назавіце галоўнае адрозненне цэнтральнага банка ад камерцыйных банкаў. ■

Выканайце міні-праект «Што такое блокчэйн?». Падрыхтуйце відэападкаст па асноўных пытаннях. Якія сферы выкарыстання існуюць для тэхналогіі блокчэйн? Як ствараюцца крыптавалюты пры дапамозе блокчэйна? У чым заключаюцца рызыкі выкарыстання крыптавалют? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 15. Рынак: попыт, прапанова, цана




**Паняцце і функцыі рынку.** У побытавым, звычайным сэнсе, рынак — гэта месца, дзе сустракаюцца прадаўцы і пакупнікі і здзяйсняюцца здзелкі (кірмаш, базар, аўкцыён і інш.). З навуковага пункту погляду **рынак** — гэта сістэма адносін абмену паміж пакупнікамі і прадаўцамі пры пасрэдніцтве грошай. Рынак пачынае фарміравацца адначасова са станаўленнем таварнай вытворчасці і з'яўляецца сувязным звяном паміж вытворцамі і спажыўцамі. Рынак паказвае вытворцам, што варта вырабляць і ў якой колькасці. Праз рынак спажыўцы ўздзейнічаюць на вытворчасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У кнізе «Даследаванне аб прыродзе і прычынах багацця народаў» (1776) шатландскі эканаміст Адам Сміт выкарыстаў метафару «нябачная рука». Ён пісаў, што вытворцы ў першую чаргу кіруюцца ўласнымі інтарэсамі (напрыклад, прадаць больш тавару і атрымаць прыбытак). Аднак пры гэтым яны нябачнай рукой накіроўваюцца да мэты, якая магла не ўваходзіць у гэтыя інтарэсы, і такім чынам служаць усяму грамадству (напрыклад, паляпшаюць вытворчасць, зніжаюць цэны, каб прыцягнуць пакупнікоў). ■

Як сёння мы называем тыя эканамічныя сілы, якія разумеў пад «нябачнай рукой» А. Сміт? ■

**Для нармальнай дзейнасці рынку неабходны пэўныя ўмовы. Адзначым найбольш важныя з іх: свабоднае цэнаўтварэнне, канкурэнцыя, свабода прадпрымальніцкай дзейнасці. Сутнасць рынку знаходзіць сваё выяўленне ў яго эканамічных функцыях.**

| Функцыі рынку | |
|---|---|
| **Цэнаўтварэнне** | Рынак фарміруе раўнаважную цану, якая адлюстроўвае карыснасць тавару для пакупніка, а таксама выдаткі на яго вытворчасць |
| **Стымуляванне** | Заахвочванне вытворцаў да стварэння новай прадукцыі з найменшымі затратамі і атрыманнем дастатковага прыбытку |
| **Інфармаванне** | Рыначныя сігналы (галоўным з якіх з'яўляецца цана) дазваляюць атрымаць даныя пра сітуацыю з тым ці іншым таварам або паслугай |
| **Пасрэдніцтва** | Рынак дапамагае вытворцам і спажыўцам знайсці найбольш выгадны варыянт здзелкі па куплі-продажу тавару |
| **Аздараўленне (саніраванне)** | Ачышчэнне эканомікі ад неэфектыўных прадпрыемстваў, «натуральны адбор» удзельнікаў эканамічнай дзейнасці |
| **Рэгуляванне** | Попыт і прапанова рэгулююцца пры дапамозе цаны |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Попыт, прапанова і рыначная цана.** На рынку маецца заканамерная ўзаемасувязь паміж цаной і попытам, а таксама паміж цаной і прапановай. **Цаной** называецца колькасць грошай, за якую прадаецца або купляецца эканамічная даброта. Разгледзім узаемадзеянне прадаўцоў і пакупнікоў тавару на рынку.

## Рыначнае ўзаемадзеянне

| Пакупнікі | Прадаўцы |
|---|---|
| **Попыт**<br>Гатоўнасць спажыўцоў набыць тавар па розных цэнах | **Прапанова**<br>Гатоўнасць прадаўцоў прадаць тавар па розных цэнах |
| **Велічыня попыту**<br>Колькасць тавару, якую пакупнікі гатовы купіць па пэўнай цане | **Велічыня прапановы**<br>Колькасць тавару, якую прадаўцы гатовы прадаць за пэўную цану |

Галоўны фактар, які ўплывае на змяненне попыту, — гэта цана. Згодна з законам попыту, велічыня попыту змяншаецца па меры павелічэння цаны на тавар. І наадварот, па больш нізкай цане спажыўцы гатовы набыць большую колькасць тавару. Нездарма правядзенне магазінамі разнастайных акцый і зніжак павялічвае продажы. У дні буйных распродажаў (напрыклад, «чорная пятніца») можа нават назірацца *ажыятажны* (павышаны) попыт на тавары.

Выключэнне складае *парадаксальны попыт* — павышэнне велічыні попыту з ростам цаны. Прыкладам з'яўляецца марнатраўнае спажыванне з мэтай прадэманстраваць багацце (купля ювелірных упрыгажэнняў, дарагога аўтамабіля і г. д.).

Ужо ў канцы XIX ст. са станаўленнем масавай вытворчасці тавараў і паслуг у эканамічную навуку было ўведзена паняцце *conspicuous consumption*, што азначае дэманстрацыйнае, прэстыжнае, паказное, статуснае спажыванне. Гэта выдаткі на тавары ці паслугі з галоўнай мэтай прадэманстраваць уласны дабрабыт.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Такія паводзіны служаць сродкам дасягнення або падтрымання пэўнага сацыяльнага статусу, прычым далёка не заўсёды чалавек па даходах рэальна можа такое сабе дазволіць.**

Ці актуальныя ідэі пра паказное спажыванне ў нашы дні? Якія тавары часцей за ўсё робяцца мерай дастатку і статуснасці? ■

**Цана — найважнейшы, але не адзіны фактар, які ўплывае на змяненне попыту на тавар. На попыт уздзейнічае таксама шэраг іншых фактараў: даходы пакупнікоў, іх густы і перавагі, мода і сезоннасць тавару, колькасць спажыўцоў на рынку, цэны на ўзаемазамяняльныя або ўзаемадапаўняльныя тавары. Калі модныя тавары карыстаюцца павышаным попытам, то тавары, што выйшлі з моды, часта бывае цяжка рэалізаваць нават па зніжаных цэнах. Рост колькасці пакупнікоў, павелічэнне іх даходаў павышае попыт на тавар, і наадварот.**



*Узаемазамяняльныя* тавары і паслугі маюць на ўвазе, што калі расце цана на адзін тавар, дык спажыўцы купляюць больш другога тавару (прыклады: масла — маргарын, торт — піражнае).

*Узаемадапаўняльныя* тавары ці паслугі дапаўняюць адзін аднаго і спажываюцца адначасова. Калі купляюць больш аднаго тавару, продажы другога таксама павялічваюцца (прыклады: аўтамабіль і бензін, падушка і коўдра, зубная шчотка і зубная паста).

Працягніце шэраг прыкладаў узаемазамяняльных і ўзаемадапаўняльных тавараў. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Як відаць, пакупнікі хочуць набыць больш тавараў па ніжэйшай цане. У сваю чаргу вытворцы гатовы прапанаваць большую колькасць тавару па вышэйшых цэнах. Пры гэтым на прапанову аказваюць уплыў не толькі цэны. Яна таксама залежыць ад росту ці падзення выдаткаў на выпуск прадукцыі. Калі выдаткі прадпрымальніка, напрыклад, на заработную плату супрацоўнікам ці сыравіну будуць узрастаць, то вытворчасць прадукцыі гэтак сама, як і яе прапанова, па дадзенай цане скароціцца. Выкарыстанне больш эфектыўнай тэхналогіі вытворчасці дазволіць павялічыць колькасць прадукцыі пры тым самым аб'ёме рэсурсаў і адпаведна павялічыць прапанову.

Суадносіны попыту і прапановы на рынку характарызуюць *рыначную кан'юнктуру* (сукупнасць умоў, пры якіх у дадзены момант працякае дзейнасць на рынку). Калі цэны растуць — яна спрыяльная для прадаўца, калі падаюць — для пакупніка. Раўнавага настае тады, калі ў прадаўцоў і пакупнікоў няма стымулаў да змянення існуючага становішча, іншымі словамі, калі тавары на рынку прадаюцца і купляюцца па такой цане, па якой прадаўцы прапануюць да продажу якраз такую колькасць тавару, якую пакупнікі хочуць і могуць купіць. *Рыначная цана* (цана раўнавагі) — гэта цана, пры якой велічыня прапановы тавараў на рынку роўная велічыні попыту на іх.

Раўнавага няўстойлівая і пад уплывам разнастайных фактараў попыту і прапановы можа парушацца. Аднак механізм узаемадзеяння попыту і прапановы выпраўляе парушаную раўнавагу. Якім чынам? Калі цана тавару будзе вышэйшай за раўнаважную, то лішак тавару нельга будзе прадаць, і прадаўцы будуць вымушаны зніжаць цану да ўзроўню раўнаважнай цаны. Калі цана будзе ніжэйшай за раўнаважную, то тавар адразу ж будзе распрададзены, але попыт застанецца незадаволеным, і, адпаведна, цана на дадзены тавар будзе расці да раўнаважнага ўзроўню.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прааналізуйце графікі попыту і прапановы, прадстаўленыя ў агульным выглядзе. Вызначце на графіках пункты, якія будуць адпавядаць наступным сітуацыям:
а) раўнавага попыту і прапановы;
б) цана высокая, і спажыўцы гатовы купіць невялікую колькасць тавару;
в) цана нізкая, і вытворца гатовы прапанаваць нязначную колькасць тавару па гэтай цэне.
Якія яшчэ сітуацыі магчымы?




**Попыт і прапанова дазваляюць паспяхова адказваць на пытанні, што, як і для каго выраблять, незалежна ад таго, які тавар прапануецца на рынку.**

**Віды рынкаў.** **Рынкі адрозніваюць па характары тавару, што прадаецца, па геаграфічным становішчы, па адпаведнасці заканадаўству, па характары продажаў (буйныя партыі тавару або адзінкавыя экзэмпляры) і інш. Існуе некалькі крытэрыяў, па якіх можна выявіць асноўныя віды рынкаў.**

## Віды рынкаў

| Па аб'екце | Па тэрыторыі | Па законнасці |
|---|---|---|
| Рынак:<br>• сыравіны<br>• нерухомасці<br>• каштоўных папер<br>• працы і да т. п. | • Мясцовы<br>• Рэгіянальны<br>• Нацыянальны<br>• Міжнародны | • Легальны<br>• Нелегальны (ценявы) |

Назавіце яшчэ некалькі відаў рынку па аб'екце, які на ім прадаецца. Зрабіце вывад, ці магчыма скласці вычарпальны спіс відаў рынку па характары тавару, што прадаецца.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Біржа* — гэта форма аптовага рынку, што функцыянуе рэгулярна. Сфармулюйце, у чым заключаецца спецыфіка аптовага рынку ў параўнанні з рознічным. Азнаёмцеся з сайтамі біржаў, лагатыпы якіх прадстаўлены на ілюстрацыях, і вызначце, якія таргі на іх адбываюцца. ■

На розных рынках асноўныя эканамічныя суб'екты выступаюць або як спажыўцы, або як прадаўцы. Напрыклад, дамагаспадарка спажывае тавары і паслугі і ў той жа час з'яўляецца пастаўшчыком рэсурсаў, перш за ўсё працоўных.

Так, на рынку працы прадаюць і купляюць працоўныя паслугі, звязаныя з выкарыстаннем разумовых і фізічных здольнасцей людзей, а таксама іх навыкаў і вопыту для вытворчасці эканамічных даброт. Асноўныя ўдзельнікі рынку працы — наёмныя работнікі (гэта людзі, якія здольны да працы і адпавядаюць пэўным патрабаванням, сярод якіх можа быць адукацыя, кваліфікацыя, стаж працы, узрост) і працадаўцы (уладальнікі рабочых месцаў: прадпрымальнікі, дзяржава). Яны ажыццяўляюць узаемадзеянне дзякуючы абмену на аснове попыту і прапановы.

Такім чынам, існуе вялізнае мноства разнастайных рынкаў. Усе разам яны складаюць велізарны рынак з мноствам унутраных узаемасувязей.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назавіце асноўныя прыметы рынку.
2. Значная частка чалавецтва аддае перавагу рыначнаму спосабу гаспадарання. Сфармулюйце аргументы на карысць гэтага выбару.
3. Вывучыце даныя табліцы, дзе прадстаўлены сем узроўняў цаны, якім адпавядаюць сем велічынь попыту і сем велічынь прапановы. Пры якой цане настае раўнавага? Запоўніце ў сшытку даныя табліцы, якіх нестае. Растлумачце, як можна вызначыць лішак ці недахоп тавару. Дакажыце, што лішкі зніжаюць цэны, а недахоп іх павышае. ■

| Велічыня прапановы, адзінкі тавару | Цана, р. | Велічыня попыту, адзінкі тавару | Лішак (+) ці недахоп (-) тавару, адзінкі |
|---|---|---|---|
| 2 | 10 | 50 | -48 |
| 10 | 15 | 40 | -30 |
|  | 20 | 30 | -10 |
| 25 | 25 | 25 | 0 |
| 30 | 30 | 20 |  |
| 35 | 35 | 15 | +20 |
| 40 | 40 |  | +30 |

Выканайце міні-праект. На аснове гістарычных ведаў зрабіце прагноз наступстваў умяшання дзяржавы ў сітуацыю, што склалася на рынку з мэтай:
- устанаўлення максімальных цэн («паталок цэн») для абароны спажыўцоў;
- устанаўлення мінімальных цэн («падлога цэн») для абароны вытворцаў.

Вынікі афарміце ў выглядзе плаката. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 16. Канкурэнцыя і яе роля ў эканоміцы

**Канкурэнцыя перашкаджае ці спрыяе ўтварэнню манаполій?**




**Паняцце канкурэнцыі.** Важную ролю ва ўсталяванні балансу інтарэсаў вытворцаў і пакупнікоў на рынку адыгрывае канкурэнцыя. **Канкурэнцыя** — гэта спаборніцтва, саперніцтва паміж эканамічнымі суб'ектамі за найлепшыя ўмовы вытворчасці і/ці рэалізацыі тавараў і паслуг, за выжыванне і эканамічны росквіт.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Рыначнае саперніцтва прыводзіць да поспеху не заўсёды. Але калі вытворца клапоціцца пра пашырэнне сваёй вытворчасці, удасканальвае матэрыяльна-тэхнічную базу і тэхналогію вытворчасці, павышае якасць тавараў, зніжае выдаткі на выраб адзінкі прадукцыі (без пагаршэння якасці і спажывецкіх уласцівасцей) і ў выніку мае магчымасць знізіць цэны, пашырыць асартымент і прапанаваць пакупнікам больш выгадныя ўмовы куплі — поспех яму гарантаваны.

Канкурэнцыю называюць рухавіком рыначнай эканомікі. Яна падахвочвае да стварэння новых і больш танных тавараў і спосабаў іх вытворчасці, укаранення больш дасканалых тэхналогій.

**Віды канкурэнцыі.** Вылучаюць розныя віды канкурэнцыі.

**Канкурэнцыя**

| Па метадах ажыццяўлення | Па галіновай прыналежнасці | Па ступені свабоды |
|---|---|---|
| • Цэнавая<br>• Няцэнавая | • Унутрыгаліновая<br>• Міжгаліновая | • Свабодная (дасканалая)<br>• Недасканалая |

*Цэнавая* канкурэнцыя мае на ўвазе саперніцтва вытворцаў за кошт прымальнай для пакупніка цаны, а *няцэнавая* — за кошт дасягнення больш высокай якасці, афармлення, упакоўкі і рэкламы тавару, пасляпродажнага тэхнічнага абслугоўвання і да т. п.

*Унутрыгаліновая* канкурэнцыя разгортваецца паміж прадпрыемствамі адной галіны (напрыклад, вытворцамі аўтамабіляў), а *міжгаліновая* мае на ўвазе саперніцтва паміж прадпрыемствамі розных галін (напрыклад, паміж чыгуначнымі і авіякампаніямі за пасажыраў).

Па ступені свабоды вылучаюць дзве асноўныя мадэлі сучаснага рынку — рынак *дасканалай* і *недасканалай* канкурэнцыі. Існуе шэраг ключавых фактараў, паводле якіх іх адрозніваюць:

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

колькасць фірм і іх памеры; тып прадукту; умовы ўваходжання на рынак; спецыфіка фарміравання цаны; даступнасць інфармацыі, тэхналогій.

*Дасканалая канкурэнцыя* — гэта сітуацыя на рынку, дзе дзейнічае вялікая колькасць прадаўцоў, якія прапануюць аднародную прадукцыю і не маюць магчымасці ўплываць на рыначную цану. Бар'еры для ўваходжання на рынак дадзенай прадукцыі адсутнічаюць. У выніку рыначныя паводзіны прадаўцоў і пакупнікоў заключаюцца ў прыстасаванні да існуючых рыначных умоў. Аднак у рэальнасці знайсці дасканалую канкурэнцыю ў чыстым выглядзе даволі цяжка. Да такіх звычайна адносяць рынкі сельскагаспадарчых прадуктаў, некаторых паслуг.

Выканаць усе ўмовы для існавання дасканалай канкурэнцыі даволі складана, таму найбольш распаўсюджанай формай канкурэнцыі з'яўляецца недасканалая, якая праяўляецца ў наступных відах: манапалістычная канкурэнцыя, алігаполія, манаполія.

## Віды недасканалай канкурэнцыі

| | |
|---|---|
| **Манапалістычная канкурэнцыя** | Мноства прадаўцоў дыферэнцыраванай прадукцыі (напрыклад, вытворчасць адзення, абутку, парфумерыі розных брэндаў і да т. п.) |
| **Алігаполія** | Невялікая колькасць прадаўцоў на рынку (аўтамабілі, мабільная сувязь) |
| **Манаполія** | Адзін прадавец тавару на рынку (напрыклад, рынак электраэнергіі, газазабеспячэння) |

На рынку манапалістычнай канкурэнцыі, дзе дзейнічае мноства прадаўцоў падобнай прадукцыі, вельмі важная роля рэкламы, гандлёвых марак і знакаў. На такім рынку кожны з прадаўцоў імкнецца пераканаць пакупніка ва ўнікальнасці і непераўзыдзенай якасці свайго тавару, актыўна выкарыстоўваючы метады няцэнавай канкурэнцыі. Для пакупніка тавар нават



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

адной гандлёвай маркі можа быць дыферэнцыраваным, паколькі гэта залежыць ад размяшчэння магазіна, ветлівасці і прывабнасці прадаўца.

Што значаць прыведзеныя сімвалы? Чаму патэнты, аўтарскія правы і таварныя знакі можна разглядаць як сродкі манапалізацыі? ■

© ® TM

*Алігаполія* (ад грэч. *ὀλίγος* — нямногі, нешматлікі і *πωλέω* — прадаю) — гэта такі рынак, на якім пануюць некалькі (звычайна ад 2 да 5) буйных вядомых фірм. Уваходжанне новых вытворцаў вельмі ўскладнена. У якасці бар'ераў выступаюць або заканадаўчыя абмежаванні, або неабходнасць у пачатковым капітале вялікіх памераў. Часцей за ўсё алігаполіі можна назіраць у такіх галінах, як металургічная, нафтавая і газавая прамысловасць, авіябудаўніцтва, аўтамабілебудаўніцтва, сферы высокіх тэхналогій.

**Манаполія** — гэта выключнае права вытворчасці, гандлю і іншых відаў дзейнасці, якое належыць адной фізічнай асобе, пэўнай групе асоб, кампаніі, арганізацыі ці дзяржаве. Манапольнае права дазваляе навязваць пакупнікам выгадныя для манапаліста ўмовы ўзаемаадносін. Пры манаполіі на рынку існуе толькі адзін прадавец тавару, які ўстанаўлівае сваю цану. У чыстым выглядзе манаполія сустракаецца рэдка. Гэта адбываецца таму, што ў большасці краін утварэнню манаполій перашкаджае антыманапольнае заканадаўства.

Вызначце на аснове выявы і Дзяржаўнага рэестра натуральных манаполій, прадстаўленага на сайце https://mart.gov.by, што ўяўляе сабой натуральная манаполія. У якіх галінах яе існаванне апраўдана? ■

**Менеджмент.** Цэнтральнай праблемай у эканоміцы з'яўляецца праблема эфектыўнага размеркавання і выкарыстання абмежаваных рэсурсаў з мэтай максімальнага задавальнення патрэб людзей, іншымі словамі, праблема эканамічнай эфектыўнасці. *Эканамічная эфектыўнасць* — гэта суадносіны атрыманага выніку з затрачанымі выдаткамі. Большая колькасць прадуктаў, выпрацаваных дзякуючы дадзенаму аб'ёму рэсурсаў і, як вынік, рост прыбытку значаць і большую эфектыўнасць. Сутнасць эканамічнай арганізацыі вытворчасці якраз і заключаецца ў тым, каб гэта арганізацыя была эфектыўнай.

Сукупнасць сучасных прынцыпаў, метадаў, сродкаў і форм кіравання, якія маюць на мэце павышэнне эфектыўнасці працы прадпрыемства, называецца **менеджмент** (англ. *management* — кіраванне, сістэма кіравання).

Менеджмент накіраваны на эфектыўнае планаванне дзейнасці прадпрыемства, яе непасрэдную арганізацыю і кантроль за яе ажыццяўленнем. Эфектыўнае кіраванне мае на ўвазе адказы на пытанні: хто кіруе, з дапамогай якіх механізмаў і якімі метадамі? Менеджары розных узроўняў каардынуюць выкарыстанне ўсіх рэсурсаў прадпрыемства, выбіраюць разнастайныя метады і сродкі для ўзмацнення матывацыі работнікаў да рашэння агульнай задачы. Як правіла, мае месца спалучэнне такіх метадаў, як матэрыяльнае стымуляванне (надбаўкі, прэміі), адміністрацыйныя ўздзеянні (загады, інструкцыі), сацыяльна-псіхалагічныя метады (фарміраванне спрыяльнага маральна-псіхалагічнага клімату, абвяшчэнне падзяк, прадстаўленне да ўзнагарод і да т. п.).

Амерыканскі інжынер Фрыдэрык Тэйлар стаў заснавальнікам навуковай арганізацыі працы і менеджменту. Разглядаючы арганізацыю ў асноўным як працэс, арыентаваны на забеспячэнне эфектыўнай працоўнай дзейнасці, вучоны ў пачатку XX ст. выказаў перакананне, што не тэхніка, а менавіта кіраванне людзьмі з'яўляецца асноўным фактарам, які ўплывае на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Адным з першых палажэнні тэорыі менеджменту на практыцы прымяніў амерыканскі прамысловец Генры Форд.



Як паказаны на ілюстрацыі тры новаўвядзенні Генры Форда, якія тычыліся арганізацыі вытворчага працэсу, адносін да працоўных кампаніі і ўзроўню іх падрыхтоўкі? Праверце свае здагадкі. ■

**Маркетынг.** Кіраўніцкая дзейнасць на прадпрыемстве мае на ўвазе ў тым ліку і эфектыўную арганізацыю прасоўвання яго прадукцыі. Гэта асабліва важна, калі прадпрыемства існуе на рынку манапалістычнай канкурэнцыі або алігаполіі, дзе значная роля няцэнавай канкурэнцыі і, як вынік, выбранай маркетынгавай стратэгіі.

**Маркетынг** (англ. *marketing* — рыначная дзейнасць) — гэта сукупнасць працэсаў стварэння, прасоўвання і прадастаўлення прадукту ці паслугі пакупнікам. Маркетынг мае на мэце выяўленне, прагназаванне і задавальненне патрэб пакупніка, а таксама мэтанакіраванае фарміраванне ў пакупнікоў новых патрэб.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Аснову маркетынгу складае marketing mix, што ўключае 4P: прадукт, прасоўванне, прадажная цана, пазіцыя (месца).




Знайдзіце дадатковую інфармацыю і ахарактарызуйце кожны з чатырох асноўных кампанентаў маркетынгу. Якія яшчэ P прапануюць сучасныя маркетолагі ў дадатак да традыцыйных? ■

**Асноўнымі задачамі маркетынгу з'яўляюцца: комплекснае даследаванне рынкаў збыту (дзейнасць канкурэнтаў, патрэбы спажыўцоў і г. д.), арганізацыя матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння прадпрыемства, фарміраванне яго асартыментнай і цэнавай палітыкі, транспарціроўка, збыт прадукцыі і яе пасляпродажнае сэрвіснае абслугоўванне, узаемадзеянне са спажыўцамі і іх заахвочванне. Важную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае рэклама, якая ўяўляе сабой распаўсюджванне інфармацыі для прыцягнення ўвагі да пэўнага аб'екта з мэтай фарміравання ці падтрымання інтарэсу да яго.**

Якую колькасць пасты, згодна з рэкамендацыямі стаматолагаў, дастаткова выкарыстоўваць для чысткі зубоў? Якая колькасць пасты адлюстроўваецца ў рэкламе?

Зрабіце вывад, якія фактары ўплываюць на паводзіны спажыўца. ■

Колькі пасты вы выкарыстоўваеце для чысткі зубоў?



**Ацэньваючы ў цэлым ролю канкурэнцыі ў эканоміцы, варта адзначыць яе бясспрэчныя станоўчыя наступствы: паляпшэнне якасці і змяншэнне цаны тавараў і паслуг, пастаяннае абнаўленне прадукцыі і пашырэнне яе асартыменту на рынку, павышэнне навукова-тэхнічнага ўзроўню і паляпшэнне арганізацыі**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вытворчасці, што спрыяе больш эфектыўнаму задавальненню патрэб людзей. Сусветная практыка сведчыць, што эканомікі, заснаваныя на канкурэнцыі, з'яўляюцца больш паспяховымі і эфектыўнымі, дэманструюць высокі ўзровень і якасць жыцця насельніцтва.

Аднак у выніку канкурэнтнай барацьбы з'яўляюцца не толькі пераможцы, але і пераможаныя, якія церпяць банкруцтва і вымушаны сыходзіць з рынку. Негатыўнымі бакамі канкурэнцыі з'яўляюцца разарэнне прадпрыемстваў, звальненне работнікаў, эканамічная нестабільнасць і сацыяльная напружанасць у грамадстве. Пераадоленне гэтых наступстваў з'яўляецца адной з задач дзяржавы як рэгулятара ў сучаснай эканамічнай сістэме.

1. Што такое канкурэнцыя? Чаму канкурэнцыю лічаць галоўным маторам рыначнай эканомікі?
2. Вытворчасць якіх тавараў і паслуг павінна быць дзяржаўнай манаполіяй? Чаму?
3. У вытворчасць халадзільнікаў укаранілі новую тэхналогію, што забяспечыла зніжэнне выдаткаў. Што здарыцца з прапановай на рынку гэтага тавару? Аргументуйце свой адказ. Ахарактарызуйце ролю канкурэнцыі ў развіцці эканомікі. ■

Правядзіце міні-даследаванне і складзіце спіс пад назвай «Асноўныя маркетынгавыя прыёмы, або Як стымуляваць спажыўца да пакупак». Абмяркуйце ў класе атрыманыя спісы маркетынгавых прыёмаў і хітрыкаў. Выкарыстайце памятку для выяўлення характэрных прыёмаў пры стварэнні рэкламы. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 17. Фінансавая сістэма грамадства

**Дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту прыводзіць да зніжэння ўзроўню жыцця?**




**Паняцце фінансавай сістэмы.** *Фінансы* — гэта сукупнасць эканамічных адносін, звязаных са стварэннем і выкарыстаннем грашовых сродкаў. Тэрмін «фінансаваць» значыць «забяспечыць грашыма тую ці іншую дзейнасць». Напрыклад, можна фінансаваць навучанне дзіцяці ў спартыўнай секцыі (сямейныя фінансы), працу завода па выпуску малочнай прадукцыі (фінансы



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

прадпрыемства), выданне школьных падручнікаў (дзяржаўныя фінансы).

**Фінансавая сістэма** — гэта сістэма збору і размеркавання дзяржаўнай уладай грашовых сродкаў.

**Бюджэт** (ад англ. *budget* — сумка, кашалёк) — гэта зводны план збору даходаў і выкарыстання атрыманых сродкаў на пакрыццё расходаў за пэўны перыяд.

**Структура грашовых даходаў насельніцтва***
*(у працэнтах да выніку)*




- Аплата працы
- Даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход
- Трансферты насельніцтву
- Даход ад уласнасці
- Іншыя даходы

**Структура грашовых расходаў дамашніх гаспадарак у 2019 г.**
*(у разліку на дамашнюю гаспадарку; у працэнтах да выніку)*




- Спажывецкія выдаткі
- Уклады і зберажэнні
- Расходы на будаўніцтва і куплю нерухомасці
- Падаткі, узносы і іншыя плацяжы
- Расходы на асабістую падсобную гаспадарку
- Іншыя расходы

* *Крыніца: Белстат, «Беларусь у лічбах», 2020*

Вызначце, што з'яўляецца асноўнай крыніцай даходаў і асноўным пунктам расходаў беларускіх домагаспадарак.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Дзяржаўны бюджэт.** Дзяржаўны бюджэт займае асноўнае месца ў сістэме дзяржаўных фінансаў. Ён фарміруе цэнтралізаваны фонд грашовых рэсурсаў для ўтрымання дзяржаўнага апарату, узброеных сіл, сістэмы аховы здароўя, адукацыі, выплаты сацыяльных дапамог і выступае рухаючай сілай дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, рэалізацыі мер па яе стабілізацыі.

*Дзяржаўны бюджэт* — гэта асноўны фінансавы план дзяржавы па даходах і расходах. Бюджэт прадстаўляе поўную інфармацыю пра дзяржаўныя фінансы, дзейнасць, напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі. Бюджэт дзяржавы абавязковы для выканання ўдзельнікамі бюджэтных адносін.

Дзяржава імкнецца, каб яе расходы не перавышалі даходаў. Калі паміж імі адзначаецца роўнасць, то бюджэт з'яўляецца *збалансаваным*. Аднак такі бюджэт сустракаецца не часта. У большасці выпадкаў расходы дзяржавы перавышаюць даходы. Такі бюджэт называецца *дэфіцытным*. Іншы раз назіраецца адваротная сітуацыя, калі даходы бюджэту перавышаюць расходы. Такі бюджэт называецца *прафіцытным*.

У тых краінах, дзе існуе ўнітарнае дзяржаўнае ўладкаванне, бюджэтная сістэма мае двухузроўневую будову — дзяржаўны і мясцовы бюджэты. У краінах з федэральным дзяржаўным уладкаваннем маюцца прамежкавыя звёны — бюджэты штатаў, земляў, кантонаў, суб'ектаў федэрацыі і да т. п.

*Мясцовыя бюджэты* — гэта бюджэты абласцей, раёнаў, гарадоў і да т. п. У сувязі з удасканаленнем працэсу вытворчасці, развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу і алічбаваннем эканомікі ў розных краінах свету назіраецца тэндэнцыя росту і ўзмацнення ўплыву мясцовых органаў улады. Узмацняюцца маштабы і аб'ёмы рэгіянальных гаспадарак, пашыраюцца і ўскладняюцца міжтэрытарыяльныя сувязі і функцыі мясцовых улад. Усё гэта павышае значэнне мясцовых бюджэтаў.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Падаткі, іх віды і роля ў эканоміцы.** Многія людзі задаюцца пытаннем: навошта плаціць падаткі? Справа ў тым, што кожнай дзяржаве для ажыццяўлення сваіх функцый неабходны сродкі. Яны фарміруюцца з дапамогай падаткаў, гэта значыць, шляхам пераразмеркавання нацыянальнага даходу. Падаткі складаюць аснову даходаў дзяржаўных бюджэтаў усіх краін свету.

Падаткі вядомы з глыбокай старажытнасці, тады іх называлі данінай. Першы грашовы пагалоўны падатак на грамадзян быў уведзены яшчэ ў Рымскай імперыі ў II ст. Развіццё таварна-грашовых адносін і эканомікі ў цэлым прывяло да таго, што падаткі пачалі выцясняць іншыя віды плацяжоў, у тым ліку натуральных.

**Падаткі** — гэта абавязковыя дармовыя плацяжы асобных грамадзян і юрыдычных асоб, якія спаганяюцца дзяржавай з мэтай задавальнення патрэб у фінансавых рэсурсах. Фактычна гэта даходы дзяржавы, што збіраюцца на рэгулярнай аснове з дапамогай прыналежнага ёй права прымусу.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступнае палажэнне:**

**Артыкул 56.** Грамадзяне Рэспублікі Беларусь абавязаны прымаць удзел у фінансаванні дзяржаўных расходаў шляхам выплаты дзяржаўных падаткаў, пошлін і іншых плацяжоў.

Зайдзіце на сайт Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь (http://nalog.gov.by/) і даведайцеся, якія звесткі ўтрымліваюцца ў Дзяржаўным рэестры плацельшчыкаў (іншых абавязаных асоб). ■

Пад падаткамі разумеюць плацяжы, у назве якіх, як правіла, прысутнічае слова «падатак». Напрыклад, падаходны падатак, падатак на нерухомасць. Разам з тым падатковы характар носяць таксама

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*зборы (пошліны)* — абавязковыя плацяжы, якія спаганяюцца за здзяйсненне дзяржаўнымі органамі юрыдычна значных дзеянняў (напрыклад, мытныя пошліны, пошліна за замену пашпарта і г. д.), а таксама абавязковыя адлічэнні ў дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды (напрыклад, у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва). Усе гэтыя плацяжы з'яўляюцца элементам падатковай сістэмы. Гэта сістэма таксама ўключае органы збору падаткаў і нагляду за іх уплатай (падатковая інспекцыя, падатковая міліцыя або паліцыя).

Існуюць розныя віды падаткаў. У залежнасці ад спосабу спагнання вылучаюць прамыя і ўскосныя падаткі. *Прамыя падаткі* спаганяюцца непасрэдна з даходаў і маёмасці падаткаплацельшчыкаў. Крыніцай прамых падаткаў з'яўляюцца: прыбытак прадпрыемстваў, заработная плата наёмных работнікаў, дывідэнды (даход, які атрымлівае ўладальнік акцый), працэнты па ўкладах, нерухомасць і інш. Такім чынам, да прамых падаткаў належаць: падатак на прыбытак, падаходны падатак з фізічных асоб, які спаганяецца з даходу, атрыманага імі з розных крыніц (зарплата, дывідэнды, працэнты па ўкладах і г. д.), падатак на нерухомасць, зямельны падатак, экалагічны падатак і г. д.

**Падаходны падатак**

| **Прапарцыянальны** | **Прагрэсіўны** |
| --- | --- |
| Падатковая стаўка складае пэўны працэнт ад даходу, незалежна ад сумы даходу | Падатковая стаўка павялічваецца ў працэнтах па меры росту даходу |

Вызначце, да якога віду належыць падаходны падатак у Рэспубліцы Беларусь, калі вядома, што з зарплаты 500 р. грамадзянін заплаціць 65 р. падаходнага падатку, з зарплаты 1300 р. — 169 р., а з зарплаты 2000 р. — 260 р. Вылічыце памеры стаўкі/ставак падаходнага падатку. З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі ўдакладніце, ці не адбыліся змены ў стаўках з часу выдання вучэбнага дапаможніка. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Ускосныя падаткі*** **выплачваюцца апасродкавана, шляхам уключэння ў цану тавараў і паслуг. Купляючы пэўны тавар ці паслугу, спажывец выплачвае такі падатак. Да ўскосных падаткаў належаць падатак на дабаўлены кошт, акцызы (падаткі на пэўныя тавары), мытныя пошліны.**

**Падатак на дабаўлены кошт (ПДК) выплачваецца з так званага дабаўленага кошту (рыначны кошт прадукцыі, выраблены фірмай, за вылікам кошту спажытых сыравіны і матэрыялаў, набытых ёю ў пастаўшчыкоў).**

Разгледзьце чэкі сваіх апошніх пакупак, у якіх асобным радком пазначаны памер ПДК. Вызначце суму выплачанага падатку. Які яго памер? ■




*Tax Free* — гэта сістэма вяртання ПДК замежным грамадзянам за пакупкі, зробленыя на тэрыторыі дзяржавы, пры выездзе з яе. Беларусь падтрымлівае сістэму Tax Free з 2013 г. Сістэма вяртання распаўсюджваецца на асоб, якія не пражываюць пастаянна ў Беларусі і краінах Еўразійскага эканамічнага саюза. Вяртанне робіцца з цаны тавараў, што абкладаюцца 20 % ПДК, пры ўмове куплі на пэўную суму ў гандлёвым аб'екце, падключаным да сістэмы Tax Free, на працягу аднаго працоўнага дня. Сістэма вяртання не распаўсюджваецца на прадукты са стаўкай ПДК 10 %.

Якія стаўкі ПДК існуюць у нашай краіне? Якую ролю адыгрывае сістэма Tax Free у стымуляванні замежных турыстаў рабіць пакупкі? ■

***Акцызны падатак*** **— гэта падатак на спажыванне пэўных тавараў. Ён уяўляе сабой спецыяльныя надбаўкі да цэн, уключаецца ў іх і аплачваецца пакупнікамі. Гэты падатак, як правіла, распаўсюджваецца на пэўныя тавары (транспартныя сродкі, паліва, спіртныя напоі і тытунёвыя вырабы і інш.).**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Па сферы распаўсюджвання падаткі падзяляюцца на агульнадзяржаўныя (рэспубліканскія) і мясцовыя. Да агульнадзяржаўных належаць падаткі, якія паступаюць у дзяржаўны бюджэт і фарміруюць яго на 85–90 % (большая частка падатку на прыбытак і даходы, мытныя пошліны і г. д.). Да мясцовых падаткаў адносяцца падаткі, якія паступаюць у мясцовыя бюджэты.

1. Што такое падаткі? Якія функцыі выконваюць падаткі?
2. Пералічыце асноўныя віды падаткаў. Чым прамыя падаткі адрозніваюцца ад ускосных?
3. Назавіце асноўныя даходныя і расходныя артыкулы дзяржаўнага бюджэту.
4. Разгледзьце структуру грашовых даходаў насельніцтва (2016—2019 гг.) і вызначце, да якіх катэгорый адносяцца даходы ад фактараў вытворчасці (рэнта, прыбытак, заработная плата, працэнт, роялці). Параўнайце долі першасных і другасных грашовых даходаў насельніцтва. Зрабіце вывад. ■

Выканайце міні-праект. Правядзіце даследаванне даходнай і расходнай частак бюджэту беларускай дзяржавы за гэты год. Зрабіце візуалізацыю ТОП-5 найбольшых і найменшых расходаў і даходаў. Напішыце кароткі каментарый. ■

*Зборнік Белстата «Беларусь у лічбах»*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 18. Дзяржава і эканоміка

**Без дзяржаўнага ўмяшання эканоміка больш эфектыўная, але размеркаванне даброт менш справядлівае?**

**Мэты**

- Забеспячэнне грамадскімі дабротамі
- Поўная занятасць
- Дабрабыт
- Росквіт
- Эканамічны рост
- Стабільнасць




**Метады**

- **Манетарная палітыка** (грошы, крэдыты)
- **Фіскальная палітыка** (падаткі)
- **Рэгуляванне працоўных адносін** (мінімальная зарплата)
- **Пратэкцыянізм** (мытныя пошліны)
- **Кіраванне дзяржуласнасцю**
- **Інвестыцыі ў розныя галіны**
- **Фінансаванне навуковых даследаванняў**
- **Антыманапольнае рэгуляванне**
- **Усталяванне прававых норм** (заканадаўства)
- **Сацыяльная абарона** (дапамога маламаёмасным, беспрацоўным)

**Задачы і метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі.** Дзяржава заўсёды аказвала і аказвае сур’ёзны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства. Сёння ніводная эканоміка не існуе і не функцыянуе без умяшання дзяржавы. Рыначнаму механізму патрэбна рэгуляванне для таго, каб не дапускаць маштабных крызісных з’яў у эканоміцы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У першай палове XX ст. сфарміраваўся шэраг тэорый цыклічнага развіцця эканомікі (Сайман Кузнец, Мікалай Кандрацеў і інш.). У наш час прынята вылучаць наступныя стадыі эканамічнага цыкла: пад'ём (бум), крызіс (рэцэсія, спад), дэпрэсія (дно), ажыўленне (пашырэнне).

Амерыканскі вучоны Джон Мейнард Кейнс у 1930-я гг. сфармуляваў асноўныя палажэнні тэорыі дзяржаўнага рэгулявання эканомікі для пераадолення крызісу перавытворчасці тавараў і паслуг, якая стала вядома як «кейнсіянства». ■

Пад дзяржаўным рэгуляваннем эканомікі разумеюць комплекс эканамічных мерапрыемстваў дзяржавы, якія распрацоўваюцца і рэалізуюцца для таго, каб уздзейнічаць на сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства.

Асноўныя эканамічныя задачы, што рашаюцца сёння большасцю дзяржаў свету, можна звесці да наступных:

- пераразмеркаванне даходаў домагаспадарак і прадпрыемстваў;
- абарона правоў уласнасці;
- пераразмеркаванне рэсурсаў краіны ў інтарэсах грамадства ў цэлым;
- клопат пра тое, каб кожны, хто можа і хоча працаваць, меў працу;
- рэгуляванне працоўных адносін;
- арганізацыя вытворчасці дзяржаўных даброт, якія прадастаўляюцца дзяржавай усім грамадзянам на роўных асновах.

Калі кажуць аб «правілах гульні» для эканамічных суб'ектаў, то маюць на ўвазе прававы фундамент, створаны дзяржавай, на аснове якога «працуе» эканоміка. Своечасовае прыняцце неабходных законаў і іх выкананне забяспечвае прававую абарону суб'ектаў эканамічнай дзейнасці. Дзяржава афармляе прававы статус эканамічных суб'ектаў, устанаўлівае правілы і нормы гаспадарання.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі падзяляюцца на *прамыя* і *ўскосныя*.

*Прамыя метады* праяўляюцца ў тым, што дзяржава вядзе барацьбу з манаполіямі, інвестуе ў асобныя галіны эканомікі, фінансуе навуковыя даследаванні і падрыхтоўку прафесійных кадраў, стварае дзяржаўныя прадпрыемствы, кантралюе экспарт і імпарт шэрагу тавараў і абараняе айчынных вытворцаў.




Растлумачце, як вы разумееце тэрміны «экспарт» і «імпарт». Розніца паміж экспартам і імпартам у грашах называецца «сальда знешняга гандлю». У якім выпадку гэта сальда з'яўляецца станоўчым — калі экспарт па кошце перавышае імпарт ці наадварот? ■

Прыгадайце з гісторыі, што такое пратэкцыянісцкая палітыка. Якія меры пратэкцыянізму вы можаце назваць? ■

Да *ўскосных метадаў* рэгулявання належаць мерапрыемствы падатковай (фіскальнай) палітыкі па змяненні падаткаў для стымулявання эканамічнай актыўнасці, грашовай (манетарнай) палітыкі шляхам рэгулявання колькасці грошай у абарачэнні, сацыяльнай палітыкі шляхам рэгулявання працоўных адносін (напрыклад, устанаўленне мінімальнага ўзроўню аплаты працы).

**Інфляцыя і яе сацыяльна-эканамічныя наступствы.** Адной з актуальных задач дзяржаўнага рэгулявання эканомікі з'яўляецца недапушчэнне высокай інфляцыі. Як адзначалася раней, інфляцыя праяўляецца ў росце ўзроўню цэн на тавары і паслугі і абясцэньванні грошай. На адну і тую ж суму можна набыць менш тавараў і паслуг, а значыць, пакупніцкая здольнасць грошай падае.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Звычайна для характарыстыкі інфляцыі выкарыстоўваюць такі паказчык, як *узровень інфляцыі*, які вымяраецца павелічэннем узроўню цэн на той ці іншы працэнт за пэўны перыяд (месяц, квартал, год і г. д.). У міжнароднай практыцы прынята лічыць, што жаданы ўзровень інфляцыі складае прыкладна 3–5 % за год.

| **Віды інфляцыі** | |
|---|---|
| **Па тэмпах росту** | • Умераная (паўзучая) — да 10 % за год<br>• Галапіруючая — да 200 % за год<br>• Гіперінфляцыя — звыш 200 % за год |
| **Па форме праяўлення** | • Адкрытая — праяўляецца праз рост цэн<br>• Скрытая — праяўляецца праз дэфіцыт тавараў |
| **Па спараджальных фактарах** | • Інфляцыя попыту — рост цэн у выніку апярэджвання даходаў насельніцтва і прадпрыемстваў над рэальным аб'ёмам выраблены тавараў і паслуг<br>• Інфляцыя выдаткаў — рост цэн у выніку павелічэння выдаткаў на сыравіну, што выкарыстоўваецца ў вытворчасці, і іншыя вытворчыя расходы<br>• Інфляцыя чакання — рост цэн у выніку чакання інфляцыі |

Пры інфляцыі ў большасці ўдзельнікаў эканамічнага працэсу непазбежны страты. Першымі ў гэтай чарзе становяцца спажыўцы, у якіх абясцэньваюцца асабістыя зберажэнні, а значыць, змяншаецца бягучае спажыванне, бо за тую ж суму грошай ва ўмовах росту цэн спажыўцы могуць набыць меншую колькасць тавараў і паслуг. У той самы час ад інфляцыі церпяць страты і вытворцы тавараў, таму што не ведаюць, якую цану прызначаць за выраблены тавары і паслугі, і адчуваюць цяжкасці з планаваннем сваёй дзейнасці на перспектыву.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ва ўмовах высокіх тэмпаў інфляцыі ўсе імкнуцца хутчэй пазбавіцца ад грошай і перавесці іх у надзейныя каштоўнасці, што можа прывесці да крызісу грашовага абарачэння. У такіх умовах грошы перастаюць выконваць свае функцыі, растуць узаемныя неплацяжы, бо ўсе чакаюць далейшага абясцэньвання грошай і імкнуцца адцягнуць выкананне фінансавых абавязацельстваў. Дзяржава не атрымлівае патрэбнага аб’ёму падатковых паступленняў і для аплаты сваіх расходаў выпускае ў абарачэнне ўсё новыя і новыя грошы, павялічваючы іх намінал. Самая вялікая па намінале банкнота (1 мільярд трыльёнаў) была выпушчана ў Венгрыі ў 1946 г., калі краіна перажывала самы высокі ўзровень інфляцыі за ўсю гісторыю грашовага абарачэння ў свеце.







Самай буйной банкнотай у Беларусі была банкнота наміналам 5 мільёнаў рублёў, якая знаходзілася ў абарачэнні з 1999 па 2001 г. У 2000 і 2016 гг. у Беларусі з мэтай пераадолення негатыўных наступстваў інфляцыі і стабілізацыі нацыянальнай грашовай адзінкі былі праведзены дзве дэнамінацыі. *Дэнамінацыя* (ад лац. *denominatio* — перайменаванне) — змяненне намінальнай вартасці грашовых знакаў. У 2016 г. яна была зменшана ў 10 000 разоў. У абарачэнне былі ўведзены манеты, а самая буйная купюра на дадзены момант складае 500 рублёў.

Чаму ўвядзенне манет можна разглядаць у якасці прыметы стабілізацыі грашовай адзінкі? ■

Дзяржава можа змагацца з інфляцыяй, выкарыстоўваючы разнастайныя метады. Першы — скараціць колькасць грошай

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

у абарачэнні. Тым самым грошай, якія могуць быць патрачаны на набыццё тавараў і паслуг у эканоміцы, стане менш. Попыт на тавары і паслугі знізіцца. У гэтым выпадку на цэны будзе аказвацца паніжальнае ўздзеянне. Другі — павялічыць колькасць тавараў і паслуг, што прапануюцца да продажу за кошт, напрыклад, стварэння магчымасцей для набыцця зямлі, інвестыцый у вытворчасць тавараў. Вынікам будзе таксама паніжальнае ўздзеянне на цэны.

На сайце Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (http://nbrb.by) у раздзеле «Манетарная палітыка» знайдзіце запланаванае і фактычнае значэнне паказчыку інфляцыі ў нашай краіне сёлета. Зрабіце вывад наконт бягучых тэмпаў інфляцыі ў Рэспубліцы Беларусь. ■

Антыінфляцыйная палітыка з’яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў дзяржаўнага рэгулявання. Асноўная мэта дадзенай палітыкі заключаецца ў тым, каб устанавіць над інфляцыяй надзейны кантроль і ўтрымліваць параўнаўча невысокія тэмпы росту цэн. Важная роля пры гэтым належыць рэгуляванню цэн і скарачэнню расходаў, у тым ліку дзяржаўных.

**Беспрацоўе, яго формы, эканамічныя і сацыяльныя наступствы.** Яшчэ адным напрамкам дзяржаўнага рэгулявання эканомікі з’яўляецца барацьба з беспрацоўем. **Беспрацоўе** — гэта сацыяльна-эканамічная з’ява, пры якой частка эканамічна актыўнага насельніцтва не можа працаўладкавацца.



Ці можа ў краіне існаваць стопрацэнтная занятасць? Для якой эканамічнай сістэмы яна будзе характэрнай? Як вы думаеце, беспрацоўны і непрацуючы — гэта адно і тое ж? Хто ўваходзіць у склад непрацаздольнага насельніцтва? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Віды беспрацоўя

| Від | Апісанне |
|---|---|
| **Фрыкцыйнае** | Звязана з пошукамі чалавекам новай працы і доўжыцца некалькі тыдняў ці месяцаў. Напрыклад, чалавек становіцца часова беспрацоўным у сітуацыі пераезду на іншае месца жыхарства, на час пошуку больш высокааплатнай працы і інш. |
| **Сезоннае** | Звязана з сезонным характарам занятасці ў пэўных галінах. Напрыклад, сельскагаспадарчыя рабочыя становяцца беспрацоўнымі пасля завяршэння збору ўраджаю ў летне-асенні перыяд і інш. |
| **Структурнае** | Звязана з навукова-тэхнічным прагрэсам і змяненнем галіновай структуры эканомікі, зніжэннем попыту на работнікаў пэўнай прафесіі. Напрыклад, падзенне попыту на вугаль прывяло да скарачэння занятасці шахцёраў |
| **Цыклічнае** | Звязана з цыклічным характарам эканомікі, перыядам эканамічнага спаду. Напрыклад, масавыя звальненні і закрыццё прадпрыемстваў у перыяд дэпрэсіі |

Як вы лічыце, якія віды беспрацоўя эканамісты называюць натуральным беспрацоўем (гэта значыць, што яны з'яўляюцца нармальным станам для эканомікі і пазбавіцца іх немагчыма)?

Якое беспрацоўе сведчыць пра сур'ёзныя праблемы ў эканоміцы і патрабуе ўмяшання дзяржавы і прыняцця антыкрызісных мер?

Аргументуйце свой пункт погляду. ■

Беспрацоўе для чалавека і членаў яго сям'і — гэта вялікая праблема. Адсутнасць крыніцы даходаў прыводзіць да пагаршэння эканамічнага становішча сям'і, крызісу ў адносінах, сацыяльнай напружанасці ў грамадстве. Беспрацоўным, як правіла, пагражае страта кваліфікацыі, сацыяльнага статусу і зніжэнне жыццёвага ўзроўню.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Для рэгулявання рынку працы і змяншэння неспрыяльнага ўздзеяння беспрацоўя на эканоміку, сацыяльную сферу дзяржава імкнецца ажыццяўляць шэраг мер па стымуляванні занятасці насельніцтва.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 41.** Грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека, гэта значыць права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэб, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

Дзяржава стварае ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва. У выпадку незанятасці асобы па не залежных ад яе прычынах ёй гарантуецца навучанне новым спецыяльнасцям і павышэнне кваліфікацыі з улікам грамадскіх патрэб, а таксама дапамога па беспрацоўі ў адпаведнасці з законам.

*Пасіўная палітыка* занятасці ўключае меры, накіраваныя на згладжванне негатыўных наступстваў беспрацоўя: выплату дапамогі па беспрацоўі, прадастаўленне магчымасці знайсці новае працоўнае месца праз дзяржаўныя органы па пытаннях занятасці.




На сайце Дзяржаўнай службы занятасці Рэспублікі Беларусь (http://gsz.gov.by) у раздзеле «Рынак працы» азнаёмцеся з актуальнай статыстыкай наконт узроўню беспрацоўя ў краіне. Якія асноўныя мерапрыемствы праводзяцца для таго, каб дапамагчы людзям працаўладкавацца?

*Актыўная палітыка* занятасці распаўсюджваецца на эканамічна актыўнае насельніцтва і носіць папераджальны характар,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

накіраваны на зніжэнне беспрацоўя да яго мінімальнага (натуральнага) узроўню.

Асноўнымі інструментамі такой палітыкі з’яўляюцца прафесійная падрыхтоўка і перападрыхтоўка кадраў, грамадскія работы і арганізацыя часовай занятасці, стымуляванне стварэння новых працоўных месцаў, садзейнічанне развіццю малога бізнесу і самастойнай занятасці, прадастаўленне падатковых ільгот і развіццё прадпрымальніцтва.




Чаму, на ваш погляд, дзяржава павінна быць зацікаўлена ў падтрымцы малога бізнесу і самазанятасці? Якому механізму падтрымкі малога бізнесу прысвечана дадзеная рэклама? ■

Сусветная практыка рэгулявання працоўных адносін сведчыць, што асобны работнік з’яўляецца найбольш слабым і ўразлівым юрыдычным суб’ектам, таму заканадаўства павінна забяспечваць большую ступень яго абароненасці. Фарміраванне палітыкі занятасці павінна спрыяць хуткаму вяртанню грамадзян, што страцілі работу, у сферу занятасці.

Прафесіі, якія існуюць сёння, паступова аўтаматызуюцца, ручная праца выцясняецца. У якіх прафесіях людзей ўжо замянілі робаты і штучны інтэлект? Ці пагражае чалавецтву масавае беспрацоўе? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сацыяльная палітыка.** Адным з найважнейшых напрамкаў дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца таксама павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступнае палажэнне:**

**Артыкул 21.** Кожны мае права на годны ўзровень жыцця, уключаючы дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў.

Нагадаем, што *ўзровень жыцця* характарызуе забяспечанасць людзей матэрыяльнымі дабротамі і паслугамі, ступень задавальнення патрэб людзей. Для яго вызначэння выкарыстоўваюцца такія паказчыкі, як памер даходу на душу насельніцтва, доля расходаў на харчаванне ў сямейным бюджэце, спажыванне тавараў працяглага карыстання, колькасць жылой плошчы на аднаго чалавека і інш.

*Якасць жыцця* з'яўляецца больш шырокім паняццем і ўключае не толькі эканамічныя параметры, але і доступ да якаснай адукацыі, аховы здароўя, стан навакольнага асяроддзя, сацыяльнае асяроддзе, задавальненне духоўных патрэб, псіхалагічны камфорт.

Кожны чалавек імкнецца мець пастаянны даход на працягу ўсяго свайго жыцця. Аднак не заўсёды гэта атрымліваецца ў поўнай меры. Дапамагчы ў гэтым могуць прыватныя зберажэнні ці дзяржаўная сістэма сацыяльнай абароны.

Сацыяльная абарона забяспечвае грамадзянам даход або прадастаўляе сацыяльныя паслугі, неабходныя для забеспячэння іх патрэб у пэўныя перыяды жыцця. У адпаведнасці з замацаванай заканадаўчай практыкай да сацыяльна ўразлівых (неабароненых) слаёў насельніцтва прынята адносіць грамадзян, якія не маюць магчымасці за кошт працы забяспечыць прымальны ўзровень задавальнення жыццёвых патрэб для сябе і членаў сваёй сям'і. У цэлым сістэма сацыяльнай абароны заклікана ствараць пэўную абароненасць і бяспеку сацыяльна ўразлівых слаёў насельніцтва.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

А асноўнай яе функцыяй становіцца аказанне дапамогі чалавеку, які знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Мэтанакіраваная сацыяльная палітыка, якая праводзіцца дзяржавай, дазваляе падтрымліваць пэўныя сацыяльныя групы (маладыя і шматдзетныя сем'і, людзей з інваліднасцю, састарэлых і інш.). На аснове рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы краіны самастойна распрацоўваюць сваё нацыянальнае сацыяльнае заканадаўства. Нягледзячы на розныя падыходы ў пытаннях сацыяльнай абароны, існуюць і агульныя прынцыпы яе арганізацыі ў розных краінах, сярод якіх:

- прынцып дыферэнцыраванага падыходу да розных слаёў і груп насельніцтва ў залежнасці ад іх сацыяльнага становішча, узросту, працаздольнасці і ступені эканамічнай самастойнасці, прафесійнай падрыхтоўкі і кваліфікацыйнага росту;
- прынцып пераходу ад сацыяльнага ўтрыманства да сацыяльных гарантый, што ўключае папярэджанне магчымых фактараў сацыяльнай рызыкі;
- прынцып інтэграванасці, які прадугледжвае, што сістэма сацыяльнай абароненасці павінна працаваць з дакладным вызначэннем правоў, адказнасці і функцый кожнага інстытута грамадзянскага грамадства.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назавіце асноўныя метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі.
2. Што такое інфляцыя? Якія віды інфляцыі існуюць? Якая інфляцыя лічыцца бяспечнай для эканомікі?
3. У чым прычыны беспрацоўя? У чым праяўляюцца асаблівасці розных відаў беспрацоўя?
4. Навошта дзяржава ўстанаўлівае мінімальны памер аплаты працы? Ці дапаможа гэта скараціць колькасць людзей, якія жывуць за мяжой беднасці? Сфармулюйце свае прапановы па барацьбе з гэтай сацыяльнай праблемай. ■

Распрацуйце з аднакласнікамі памятку «Парады моладзі па пытаннях працаўладкавання». Паспрабуйце ўлічыць рэгіянальныя асаблівасці рынку працы. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Эканамічная сфера грамадства»

1. Дайце азначэнне наступным паняццям: *банк, беспрацоўе, бюджэт, вытворчасць, грошы, даход, інфляцыя, канкурэнцыя, крэдыт, манаполія, маркетынг, менеджмент, падаткі, рынак, спажыванне, уласнасць, фактар вытворчасці, фінансавая сістэма, цана, эканоміка.*
2. У сферы эканомікі чалавек выступае ў ролі ўласніка, наёмнага работніка, працадаўцы. Якія веды, уменні, рысы характару неабходны для паспяховага выканання гэтых роляў?
3. У розных краінах існуюць розныя мадэлі змешанай эканомікі. Растлумачце, як рэалізуецца «змешанасць». Назавіце вартасці і недахопы кожнай мадэлі.

   *Амерыканская мадэль эканомікі.* Для яе характэрны нязначная ўдзельная вага дзяржаўнай уласнасці і ролі дзяржавы ў эканоміцы, вялікае расслаенне насельніцтва па даходах. У сацыяльнай сферы прадугледжваецца стварэнне роўных магчымасцей для ўсіх эканамічных суб’ектаў, аднак вынікі іх дзейнасці залежаць толькі ад іх саміх і існуючых абставін.

   *Еўрапейская мадэль.* Эканоміка, якая хаця і базіруецца на рыначных прынцыпах, але дапускае значнае дзяржаўнае ўмяшанне ў эканамічнае жыццё грамадства. Мае месца меншая ступень дыферэнцыяцыі даходаў насельніцтва. Сацыяльная абароненасць грамадзян знаходзіцца на высокім узроўні. Прыкладам можа служыць нямецкая мадэль, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Разам з тым за кошт высокага ўзроўню падаткаабкладання дзяржава пераразмяркоўвае даходы, што стрымлівае маёмаснае расслаенне насельніцтва. У шведскай мадэлі дзяржава, праводзячы сваю эканамічную палітыку, таксама мае на мэце скарачэнне маёмаснай няроўнасці. Высокія падаткі ўраўнаважваюцца значнымі сацыяльнымі дапамогамі. Як у Германіі, так

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і ў Швецыі дзяржаве ўдаецца забяспечыць высокі ўзровень жыцця насельніцтва.

*Японская мадэль.* Асноўныя рысы мадэлі: апора на нацыянальныя прыярытэты, перавага агульнанацыянальных, калектыўных інтарэсаў над асабістымі, дысцыплінаванасць і адказнасць, сістэма пажыццёвага найму работнікаў, невысокая дыферэнцыяцыя насельніцтва па даходах, а таксама рэкамендацыйнае планаванне эканомікі дзяржавай.

*Кітайская мадэль.* Дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі з магутным прытокам замежных інвестыцый, развіццём прыватнай уласнасці і рыначных адносін.

4. Вы з сябрамі з розных краін вырашылі параўнаць цэны ў рэстаранах хуткага харчавання «Макдональдс», каб даведацца, дзе самы дарагі і самы танны фаст-фуд. Дамовіліся выкладваць фота чэка з рэстарана ў групе ў сацыяльнай сетцы. Якія ўмовы неабходна выканаць удзельнікам для таго, каб параўнанне цэн было карэктным?
5. Што паказвае схема ўзаемадзеяння эканамічных суб'ектаў? Якую ролю адыгрываюць рынкі тавараў і рэсурсаў? Прывядзіце прыклады дзейнасці дзяржавы ў рыначнай эканоміцы.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Іваноўскія на сямейнай нарадзе вырашылі, што для ўмацавання здароўя будзе карысна заняцца спортам. Вызначыўшы інтарэсы і магчымасці членаў сям'і, спынілі свой выбар на занятках лыжамі. Склалі спіс неабходнага і ацанілі грашовыя рэсурсы, дамовіліся пра месца і ўмовы куплі.
   - У чым складаецца эканамічны інтарэс сям'і як спажыўца?
   - Якія эканамічныя веды дапамогуць ёй ажыццявіць рацыянальную (выгадную) пакупку і атрымаць ад яе найбольшую карысць?
7. Выберыце адзін з банкаў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у нашай краіне.
   - Высветліце, на якіх умовах банк прыме ад вас дэпазіт на суму 1000 рублёў, а на якіх умовах можа прадаставіць вашай сям'і спажывецкі крэдыт на такую самую суму.
   - Хто з членаў сям'і можа толькі ўнесці дэпазіт, а хто — і ўнесці дэпазіт, і ўзяць крэдыт?
   - Разлічыце суму, якую выплаціць вам банк у якасці працэнтаў па дэпазіце, і суму, якую вам неабходна выплаціць банку ў якасці працэнтаў па крэдыце.
8. У коміксе «Самаабслугоўванне» вядомага мастака-карыкатурыста адлюстраваны паход пакупніцы ў магазін. Арыентуючыся на паказальнікі ўздоўж паліц, застаўленых рознай прадукцыяй, яна набірае ў кошык вялікую колькасць тавараў. Аднак на касе пакупніца заўважае, што ў яе кашальку мала грошай, і ў выніку аплачвае на касе толькі адну ўпакоўку макароны. З ёй яна і выходзіць з магазіна.

   Вызначце:
   - Якая эканамічная дзейнасць адлюстравана ў коміксе?
   - У якіх тыпах эканамічнай сістэмы магчыма прадстаўленая сітуацыя, а у якіх — не?
   - Якая функцыя грошай можа быць праілюстравана праз аплату тавару на касе?
   - Прыёмамі чаго з'яўляюцца: вялікі кошык, «няроўная» цана на тавары (1.99, 4.48, 29.98), навязлівыя паказальнікі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- Якім чынам змест комікса звязаны з паняццем «кансьюмерызм»?
- Даведайцеся, хто з’яўляецца аўтарам гэтага комікса.

9. У 2018 г. была ўведзена ў абарачэнне памятная манета (сярэбраная і медна-нікелевая) «Фінансавая сістэма Рэспублікі Беларусь». На аверсе адлюстраваны Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь і ўказаны намінал манеты — 20 рублёў; на рэверсе ў цэнтры на фоне арнаментальнай кампазіцыі размешчана стылізаванае адлюстраванне карты Рэспублікі Беларусь; па перыметры манеты — дэкор з элементаў электроннай тэкстуры і надпіс «Фінансавая сістэма Беларусі. 100 гадоў».




Кім эмітавана (выпушчана) дадзеная манета? Якая функцыя грошай будзе пераважаць у дадзенай манеты? Якія сучасныя тэндэнцыі развіцця грашовага абарачэння знайшлі адлюстраванне ў афармленні манеты?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Духоўная сфера грамадства

IV

## 1 Што такое?

- Этыка навукі
- Свабода сумлення і веравызнання
- Адукацыя праз усё жыццё

## 2 Як функцыянуе сацыяльны інстытут?

- Навука
- Адукацыя
- Царква

## 3 Чым адрозніваюцца?

- Прыкладныя і фундаментальныя даследаванні

## 4 Як узаемазвязаны?

- Тэорыя і практыка
- Каштоўнасці і нормы
- Навучанне і выхаванне

## 5 Якія бываюць?

- Навуковыя метады
- Філасофскія сістэмы
- Рэлігіі

## ? Духоўная сфера вызначае змены іншых сфер жыцця грамадства?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 19. Мараль

**Мараль — гэта тое агульнае, што нас аб’ядноўвае, дазваляючы меркаваць адзін пра аднаго як пра людзей?**



**Сэнс жыцця чалавека**

- Шчасце
- Абавязак
- Асалода
- Карысць

**Этыка — навука пра мараль і маральнасць**

**Мараль**

Існуючыя ў грамадстве механізмы рэгуляцыі паводзінаў людзей (каштоўнасці, ідэалы, нормы)

**Маральнасць**

Індывідуальныя ўяўленні аб правільных паводзінах і практычнае прытрымліванне ідэалаў і норм маралі ў жыцці







**Сутнасць маральнай рэгуляцыі грамадскага жыцця.** Сацыяльнае жыццё ўладкавана такім чынам, што дасягненне (ці недасягненне) мэт аднаго чалавека залежыць ад таго, як будуць паводзіць сябе навакольныя людзі. Так, каб сяброўства было надзейным і моцным, недастаткова жадання толькі аднаго з сяброў — трэба, каб і другі чалавек паводзіў сябе адпаведным чынам. Гэтае правіла працуе ў абодва бакі: калі для дасягнення маіх мэт патрэбна добрая воля іншых людзей, то і іх мэты могуць быць дасягнуты, толькі калі астатнія (у тым ліку і я) паводзяць сябе пэўным чынам. Гэта значыць, што любыя мэты ў грамадстве мо-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

гуць быць рэалізаваны, толькі калі людзі выказваюць гатоўнасць пайсці насустрач адзін аднаму.

Каб дасягнуць згоды, неабходны сацыяльны механізм, які рэгуляваў бы паводзіны людзей у тых выпадках, калі іх мэты супярэчаць адна адной. Такім механізмам і выступае мараль (ад лац. *moralis* — «які датычыць звычаяў»).

Тэрмін «мараль» увёў старажытнарымскі філосаф Цыцэрон у I ст. да н. э.

*Мараль* — гэта механізм рэгуляцыі сацыяльнага жыцця, заснаваны на прынятых у тым або іншым грамадстве правілах паводзінаў. За гэтымі правіламі стаяць уяўленні пра тое, якія паводзіны лічацца ў гэтым грамадстве добрымі (правільнымі), а якія — дрэннымі (няправільнымі). Адпаведна, той воссю, вакол якой будуецца ўся маральная сістэма, выступае супрацьлегласць дабра і зла. У структуру маралі ўваходзяць каштоўнасці (уяўленні пра тое, дзеля чаго чалавек будуе свае паводзіны тым ці іншым чынам), ідэалы (тое, да чаго варта імкнуцца) і нормы (тое, што варта выконваць).

Славянскае слова «маральнасць» утварылася ад слова «мараль», аднак тэрміны *мараль* і *маральнасць*, хоць і блізкія, але не тоесныя. Калі пад мараллю разумеюць механізмы рэгуляцыі паводзінаў людзей, што склаліся ў грамадстве, а таксама ўяўленні пра дабро і зло, характэрныя для гэтага грамадства, то пад маральнасцю разумеюць індывідуальныя ўяўленні аб правільных паводзінах, характэрныя для таго ці іншага канкрэтнага чалавека. Інакш кажучы, маральнасць — гэта свайго роду індывідуальная мараль, якая можа адрозніваецца ад агульнапрынятых установак. Гэта адрозненне можа стаць прычынай амаральных паводзінаў чалавека, але можа паслужыць і асновай развіцця маралі, з'яўлення новых, больш прагрэсіўных правіл і норм.

**Дынаміка маральных норм і ідэалаў.** Змест маральных каштоўнасцей, ідэалаў і норм залежыць ад светапогляду грамадства, у якім фарміруецца тая ці іншая сістэма маралі, а канкрэтна: ад сацыяльнага ладу гэтага грамадства, ад узроўню яго развіцця і інш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У адным і тым жа сацыяльным арганізме могуць функцыянаваць розныя і нават супрацьлеглыя сістэмы маралі. Гэтыя адрозненні могуць караніцца ў класавай прыналежнасці людзей (напрыклад, мараль рабоў прынцыпова адрознівалася ад маралі рабаўладальнікаў); у саслоўным грамадстве яны могуць вызначацца прыналежнасцю да саслоўя (так, мараль духавенства не супадала з мараллю дваранства ці купецтва); яны могуць узнікаць з рэлігійных перакананняў (мараль хрысціяніна не тоесная маралі будыста, а мараль атэіста будзе адрознівацца ад абедзвюх).

Знайдзіце ў дадатковых крыніцах інфармацыі дзесяць запаведзяў хрысціянства, пяць свяшчэнных запаведзяў будызму, дзесяць правіл даасізму. Якія агульныя палажэнні характэрныя для дадзеных рэлігійных маральных кодэксаў? ■

Адрозненні маральных каштоўнасцей могуць быць абумоўлены і цягам часу, таму іншы раз кажуць пра маральныя адрозненні пакаленняў. Насамрэч ва ўсе часы мараль маладога чалавека не супадала з мараллю яго прадзядулі. І калі культура ў цэлым развіваецца прагрэсіўна, то можна казаць аб новай, больш высокай прыступцы маральнай свядомасці. Змены маральных норм звязаны з дэмакратызацыяй грамадства і пашырэннем асабістай свабоды (напрыклад, з магчымасцю свабодна выбіраць веру ці не выбіраць ніякай). Аднак магчыма і адваротная сітуацыя: пры агульным заняпадзе культуры (напрыклад, у Старажытным Рыме на познім этапе яго развіцця) у сферы маралі таксама можа назірацца рэгрэс. Таму пытанне пра суадносіны маралі розных пакаленняў — гэта пытанне, на якое нельга даць адказ загадзя: магчыма, што мараль бацькоў будзе захоўваць тыя важныя каштоўнасці і нормы, якія вымываюцца з маралі больш позняга перыяду, робячы яе больш простай і прымітыўнай, але разам з тым магчыма, што мараль новага пакалення выпрацуе правілы і каштоўнасці, якія будуць дакладней адпавядаць дадзенай сітуацыі і несці ў сабе больш прагрэсіўныя ідэалы.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне



На мяжы 2000–2010-х гг. дзякуючы развіццю ўбудаваных функцый фотаапарата мабільных прылад набыла развіццё такая з’ява, як «селфі» (стварэнне аўтапартрэта з дапамогай фотаапарата).

Сфармулюйце маральныя нормы для выканання селфі. На фоне якіх аб’ектаў, на ваш погляд, рабіць селфі некарэктна з пункту гледжання маралі? ■

## Прафесійная этыка




**Існуюць таксама прафесійныя маральныя нормы, якія апісваюцца паняццем *прафесійная этыка*. Гэта звязана з тым, што да некаторых відаў прафесійнай дзейнасці грамадства прад’яўляе павышаныя маральныя патрабаванні. Да традыцыйных відаў прафесійнай этыкі належаць: педагагічная, медыцынская, юрыдычная, этыка вучонага. Таксама існуюць параўнальна новыя яе віды, актуальнасць якіх звязана з узрастаннем ролі чалавечага фактару ў якой-небудзь дзейнасці (напрыклад, журналісцкая этыка, біяэтыка).**

Якія асаблівасці кожнай з названых прафесій абумоўліваюць, на ваш погляд, павышаныя маральныя патрабаванні да іх? ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Клятва Гіпакрата* — клятва ўрачоў, якая выражае асноватворныя маральна-этычныя прынцыпы паводзінаў урача.

Знайдзіце і прааналізуйце тэкст клятвы, сфармуляваны Гіпакратам, а таксама сучасны тэкст клятвы ўрача Рэспублікі Беларусь. Вызначце, якія палажэнні першапачатковай клятвы Гіпакрата не адпавядаюць рэаліям сённяшняга дня. Чаму, на ваш погляд, урачэбную клятву і сёння ў гутарковай мове называюць клятвай Гіпакрата, нягледзячы на тое што на працягу стагоддзяў яе тэкст відазмяніўся? ■



**Аднак скрозь усе адрозненні маральных сістэм чырвонай ніткай праходзяць тыя агульначалавечыя каштоўнасці, значэнне якіх з'яўляецца адвечным: гэта каштоўнасці гуманізму і свабоды. Існуе і ўніверсальнае правіла, якое атрымала ў гісторыі назву *«залатога правіла маралі»*.**

Прыгадайце, як сфармулявана «залатое правіла маралі». Чым адрозніваюцца пазітыўная і негатыўная фармулёўкі «залатога правіла маралі»? ■

**У XVIII ст. нямецкі філосаф Імануіл Кант сфармуляваў вышэйшы прынцып (або закон) маральнасці. Ён загадвае чалавеку дзейнічаць так, каб яго паводзіны маглі стаць узорам для ўсеагульнага прымянення, у тым ліку і ў адносінах да яго самога («рабі так, каб максіма тваёй волі магла б быць усеагульным законам»).**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**У чалавека могуць быць розныя памкненні, у тым ліку такія, што супярэчаць маралі. У гэтым выпадку маральны закон вымушае яго пераадолець свае жаданні, кіруючыся пачуццём абавязку, і забяспечвае рэалізацыю дзеяння за кошт унутранага прымусу, які ажыццяўляецца розумам і сілай волі. І менавіта маральны закон, які вымушае чалавека дзейнічаць у адпаведнасці з уласным маральным прынцыпам, незалежна ад знешняга прымусу, робіць яго па-сапраўднаму свабодным.**

Як вы разумееце наступныя словы І. Канта: «Чалавек заўсёды павінен быць мэтай і ніколі сродкам»? ■

**У жыцці чалавеку ўвесь час даводзіцца рабіць выбар і несці за яго адказнасць. *Маральная дылема* — гэта сітуацыя выбару, у якой хто-небудзь пастаўлены перад неабходнасцю маральнага выбару паміж дзвюма магчымасцямі, пры якой выбар любой з іх звязаны з парушэннем тых або іншых маральных прадпісанняў.**



Адной з вядомых маральных дылем з'яўляецца «праблема ваганеткі». Яна фармулюецца наступным чынам:

Цяжкая ваганетка, страціўшы кіраванне, нясецца па рэйках. На яе шляху знаходзяцца пяць чалавек, якія не паспеюць адысці. На шчасце, вы можаце перавесці стрэлку — і тады ваганетка паедзе па іншым, запасным шляху. Аднак на запасным шляху знаходзіцца адзін чалавек, які таксама не паспее адысці.

Якімі будуць вашы дзеянні? Ці можна ў жыцці выбраць меншае з двух зол? ■

**Этыка як тэорыя маралі.** **Філасофская дысцыпліна, прадметам тэарэтычнага асэнсавання якой з'яўляецца мараль, называецца этыкай (ад ст.-грэч. ἦθος — звычай). Як бачым, паходжанне гэтага слова тое самае, што і ў слова «мараль».**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Старажытнагрэчаскі філосаф Арыстоцель утварыў прыметнік «этычны», аднёсшы яго да групы чалавечых якасцей, якія ён назваў этычнымі дабрачыннасцямі. Зрабіўшы іх прадметам тэарэтычнага асэнсавання, ён назваў гэту новую дысцыпліну этыкай.



*Платон і Арыстоцель. Фрагмент фрэскі Рафаэля Санці «Афінская школа». 1511 г.*

Арыстоцель (у цэнтры справа) трымае ў руках «Нікамахаву этыку». ■

**Адной з цэнтральных праблем этыкі з'яўляецца вызначэнне сэнсу жыцця чалавека. На працягу гісторыі этыка сфарміравала вучэнні, якія прапаноўвалі розныя мадэлі сэнсу жыцця зыходзячы са зместу агульначалавечых каштоўнасцей.**

Якое сцвярджэнне пра сэнс жыцця вам бліжэйшае? Чаму?

- Сэнс жыцця ў тым, каб быць шчаслівым.
- Сэнс жыцця — атрымаць максімум асалод.
- Сэнс жыцця — у асабістай выгадзе і карысці.
- Сэнс жыцця — у служэнні абавязку.
- Сэнс жыцця — у імкненні да дасканаласці. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Даведайцеся, як называюцца этычныя вучэнні, якія прадстаўлены сцвярджэннямі пра сэнс жыцця.

**Сучасная этыка ўваходзіць у пералік філасофскіх дысцыплін і з'яўляецца вучэннем пра сутнасць маралі (разглядаючы яе праз прызму таго, што павінна быць, і таго, што існуе), яе структуру, функцыі, заканамернасці гістарычнага развіцця, ролю ў грамадскім жыцці.**

1. У чым адрозненне маралі ад маральнасці? Прывядзіце прыклады.
2. Якія асноўныя фактары ўплываюць на змяненне маральных норм?
3. Як вы лічыце, ці могуць маральныя кодэксы, якія адносяцца да прафесійнай дзейнасці, папярэдзіць узнікненне маральных дылем і вызваліць чалавека ад прыняцця цяжкага ў асабістым плане рашэння? Абгрунтуйце сваё меркаванне, прывядзіце прыклады.

Выканайце міні-праект «Як змяняліся ўяўленні пра дабро і зло ў розныя гістарычныя эпохі?». Стварыце плакат пра змены дабрачыннасцей і заган у грамадстве.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 20. Рэлігія

## Роля рэлігіі ў грамадстве сёння памяншаецца або павялічваецца?

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Артыкул 31.** Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам.

### Структура рэлігіі

- Рэлігійная свядомасць
- Рэлігійныя паводзіны
- Рэлігійная арганізацыя



### Раннія формы рэлігійных вераванняў



Фетышызм



Анімізм



Татэмізм



Магія

### Рэлігіі ў сучасным свеце

**Па колькасці багоў**

- **Політэістычныя** (багоў шмат)
- **Монатэістычныя** (Бог адзін)

**Па распаўсюджанасці**

- **Сусветныя** (распаўсюджаны ў розных краінах і сярод розных народаў)
- **Нацыянальныя** (распаўсюджаны ў адной краіне ці сярод прадстаўнікоў адной нацыі)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сутнасць рэлігіі, яе функцыі.** **Рэлігійны светапогляд суправаджае развіццё чалавецтва на працягу многіх тысячагоддзяў.**

Найбольш ранніміі формамі рэлігійных вераванняў з'яўляліся:
- *фетышызм* (вера ў звышнатуральную сілу матэрыяльных прадметаў);
- *анімізм* (вера ў існаванне душы і духаў);
- *татэмізм* (уяўленне пра звышнатуральную сувязь паміж групай людзей і пэўным відам жывёл, раслін);
- *магія* (вера ў звышнатуральныя сувязі паміж прыроднымі аб'ектамі і з'явамі).

**Асноўнымі прыметамі рэлігійнага светапогляду з'яўляюцца дзве: уяўленне пра *падваенне свету* і *вера* ў гэта. Свядомасць верніка бачыць рэальнасць падзеленай на два светы: звычны і свяшчэнны. Ён верыць у свяшчэнны свет. Гэтая вера спараджае веданне, якое не патрабуе доказаў і выступае як Ісціна (ведаю, бо веру).**

**Увесь комплекс з'яў, народжаных рэлігійным светапоглядам, абазначаецца паняццем «рэлігія». Рэлігія — гэта сістэма вераванняў у звышнатуральнае і звязаныя з ёй асаблівыя, спецыфічныя паводзіны (культ). Можна вызначыць рэлігію і як сувязь чалавека з Вышэйшай сілай, Абсалютам: адзін з варыянтаў этымалогіі слова «рэлігія» гучыць як «аднаўленне сувязі». Асобныя напрамкі ў рамках адной рэлігіі, асаблівасці веравызнання ў межах пэўнага рэлігійнага вучэння называюцца канфесіямі (лац. *confessio* — спавяданне).**

Абапіраючыся на гістарычныя веды, з дапамогай уводнай інфаграфікі апішыце наступныя рэлігіі: будызм, даасізм, індуізм, іслам, іўдаізм, сінтаізм, хрысціянства. Якія з іх політэістычныя, а якія монатэістычныя? Якія рэлігіі складана класіфікаваць па такім крытэрыі, як колькасць багоў? Назавіце першую ў гісторыі монатэістычную рэлігію.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Пантэон, Рым



Вул. Рабкораўская, Мінск

Пантэон — «храм усіх багоў», пабудаваны ў Рыме ў 126 г. Таксама паняццем «пантэон» вызначаецца група багоў, што належаць да якой-небудзь аднной рэлігіі ці міфалогіі.

Вызначце, да якіх відаў рэлігіі можа прымяняцца паняцце «пантэон». Прывядзіце гістарычныя прыклады рэлігій з пантэонам багоў.

Графіці на вул. Рабкораўскай, 13 у Мінску называецца «Ярыла». Якім чынам гэтая назва звязана з рэлігіяй? Ці можна лічыць дадзены твор стрыт-арту праявай рэлігійнасці? ■

**Рэлігія — адзін з найбольш складаных і неадназначных феноменаў культуры: ён спарадзіў даўнюю і бясконцую дыскусію як аб прыродзе рэлігіі, прычынах яе паходжання, так і аб яе дарэчнасці ў жыцці чалавека разумнага. Але як ні вырашаліся б гэтыя пытанні прыхільнікамі і праціўнікамі рэлігіі, абодва бакі згодныя, што яна адыгрывае значную ролю ў гісторыі чалавецтва, паколькі выконвае цэлы шэраг важных сацыяльных функцый.**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Функцыі рэлігіі | |
|---|---|
| **Светапоглядная** | Фарміраванне ў чалавека карціны свету, сістэмы поглядаў на свет і самога сябе |
| **Кампенсаторная** | Стварэнне душэўнага камфорту, наданне пачуцця абароненасці, упэўненасці, суцяшэння |
| **Інтэграцыйна-камунікацыйная** | Аб'яднанне вернікаў, стасункі на базе адзіных каштоўнасцей і перакананняў, умацаванне сацыяльных сувязей. Рэлігія можа і раз'ядноўваць людзей (дэзінтэграцыйная роля), служыць нагодай маштабных сацыяльных канфліктаў |
| **Рэгулятыўная** | Стварэнне норм і ўзораў паводзінаў, кантроль за іх выкананнем |
| **Культуратворчая** | Назапашванне і перадача культурнага вопыту ад аднаго пакалення да другога, асвета, дабрачыннасць, мастацтва (развіццё рэлігійнай музыкі, жывапісу, архітэктуры, пісьменства), падтрыманне культурна-гістарычных традыцый |

Французскаму філосафу эпохі Асветніцтва Вальтэру належыць вядомае выказванне: «Калі б Бога не існавала, яго трэба было б выдумаць».

Як вы разумееце гэтае выказванне? Як дадзенае выказванне суадносіцца з асноўнымі функцыямі рэлігіі?

**Структурныя элементы рэлігіі.** Выкананне адзначаных функцый патрабавала ад рэлігіі фарміравання адпаведнай структуры, у рамках якой вылучаюцца:

- *рэлігійная свядомасць* як адлюстраванне ў свядомасці верніка навакольнага свету праз веру. Гэты структурны элемент рэлігіі ўтрымлівае сукупнасць уяўленняў, ідэй, перакананняў і каштоўнасцей верніка. Рэлігійная свядомасць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

функцыянуе на двух узроўнях: *царкоўнай ідэалогіі* (афіцыйнае і сістэматызаванае веравучэнне) і *рэлігійнай псіхалогіі* (суб'ектыўныя перажыванні верніка, успрыманне рэлігіі масай вернікаў, народныя рэлігійныя прыметы, міфы, паданні);

- *рэлігійныя паводзіны* як сукупнасць дзеянняў, якія вызначаюцца верай чалавека. Рэлігійныя паводзіны бываюць двух відаў: *культавыя* (свяшчэннадзейства, накіраванае на аб'ект веры, — малітва, богаслужэнне, ахвярапрынашэнне і да т. п.) і *пазакультавыя* (штодзённыя паводзіны ў адпаведнасці з рэлігійнымі запаведзямі — праведны лад жыцця);
- *рэлігійная арганізацыя* — формы і механізмы функцыянавання рэлігіі: група вернікаў, культавыя пабудовы, вучэбныя ўстановы і да т. п.

На прыкладзе хрысціянства вылучаюць чатыры віды рэлігійных арганізацый.

| Рэлігійныя арганізацыі ў хрысціянстве | |
|---|---|
| Царква | Дэнамінацыя |
| Секта | Культ |

- *Царква* — складаная іерархізаваная і цэнтралізаваная сістэма ўзаемадзеяння святароў і свецкіх людзей, якая заснавана на сімвале веры, лаяльнасці да дзяржавы і свецкай культуры.
- *Дэнамінацыя* (веравучэнне) — рэлігійная арганізацыя, накіраваная на прыцягненне новых удзельнікаў шляхам прапаганды і актыўнай рэлігійна-грамадскай дзейнасці (прапаведніцтва, лячэнне, дабрачыннасць).
- *Секта* — рэлігійная арганізацыя, якая адмаўляе каштоўнасці агульнай культуры (рэлігійная контркультура) і з'яўляецца,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

як правіла, у выніку адыходу групы вернікаў ад царквы ці дэнамінацыі.

- *Культ* — рэлігійная арганізацыя або група, заснаваная на містычным ці псіхічным рэлігійным вопыце яе ўдзельнікаў. Узнікае культ як рэлігійная навацыя, мала падобная на папярэднія веравучэнні. Спецыфіка культу: малая колькасць удзельнікаў, агрэсіўныя метады прыцягнення і ўтрымання членаў, харызматычная аснова (апора на аўтарытэт настаўніка), ярка выражаная прэтэнзія на выключнасць, містыцызм, часта варожыя адносіны да свецкай культуры і дзяржавы.

Для дакладнага вызначэння статусу рэлігійнай арганізацыі неабходна ўлічваць традыцыйныя рэлігіі краіны, на тэрыторыі якой яна дзейнічае.

Культы, а часткова секты і дэнамінацыі складаюць арганізацыйную форму так званай новай рэлігійнасці — веравучэнняў, якія з'явіліся ў сярэдзіне і другой палове XX ст. Некаторыя з гэтых вучэнняў носяць аўтарытарны і дэструктыўны характар, пагражаюць псіхічнаму здароўю асобы, накіраваны на ізаляцыю сваіх членаў і разбурэнне традыцыйных сацыяльных сувязей у грамадстве.

**Сацыяльная дынаміка рэлігіі.** Існаванне рэлігіі на працягу тысячагоддзяў характарызавалася альбо павелічэннем, альбо памяншэннем яе ролі ў грамадстве.

Вялікія вучоныя мінулага і сучаснасці бачылі вытокі рэлігіі ў многіх прычынах: бяссіллі чалавека перад прыродай, страху смерці, наіўнасці і неадукаванасці старажытных людзей, злосным намеры і падмане з боку аўтараў рэлігійных вучэнняў, дэфіцыце інфармацыі пра гэты свет і з'явы, што адбываюцца ў ім, сацыяльных умовах, якія спараджаюць аддаленне і несправядлівасць і інш.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



У аснову карціны нідэрландскага мастака Пітэра Брэйгеля Старэйшага «Вавілонская вежа» (1563) пакладзены сюжэт са Старога запавету, згодна з якім людзі вырашылі пабудаваць вежу да нябёсаў. Аднак Бог, каб уціхамірыць іх ганарлівасць, стварыў новыя мовы, у выніку чаго людзі перасталі разумець адзін аднаго, не маглі працягваць будаўніцтва і рассяяліся па ўсёй зямлі. Такім чынам, гісторыя пра Вавілонскую вежу дае рэлігійнае разуменне з'яўлення розных моў.

Для якіх гістарычных перыядаў у найбольшай ступені было характэрна ўзмацненне ролі рэлігіі ў грамадскім жыцці?

**Рост уплыву рэлігіі змяняецца працэсам страты рэлігіяй сваіх пазіцый у грамадстве. Да прычын зніжэння ролі рэлігіі вучоныя адносяць развіццё навукі, з'яўленне свецкіх палітычных рэжымаў (адасабленне царквы ад дзяржавы, наданне роўных правоў**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

вернікам і атэістам), урбанізацыю і гарадскі лад жыцця, мадэрнізацыю як асучасванне рэлігіі праз яе спрашчэнне, кампраміс са свецкай культурай, камерцыялізацыю рэлігійных свят і страту іх сакральнага сэнсу.

| Тэакратычная дзяржава | Свецкая дзяржава |
| --- | --- |
| Дзяржава, дзе рэлігійныя дзеячы аказваюць вырашальны ўплыў на палітыку, існуе «дзяржаўная рэлігія» як крыніца заканадаўства | Дзяржава, дзе рэлігія аддзеленая ад улады; рашэнні дзяржаўных органаў не маюць рэлігійнага абгрунтавання |

Рост уплыву рэлігіі абавязкова прыводзіць да ўзнікнення тэакратычнай дзяржавы або можа выяўляцца і ў свецкай дзяржаве? Ці азначае станаўленне свецкай дзяржавы поўную страту рэлігіяй сваіх пазіцый? ■

Нягледзячы на працэс страты рэлігіяй сваіх пазіцый, які ахапіў з XIV–XV стст. Еўропу і пэўную частку іншых рэгіёнаў, рэлігія застаецца ў сучасным свеце значнай культурнай і сацыяльнай з'явай: большая частка насельніцтва нашай планеты лічыць сябе веруючымі людзьмі (амаль 6/7 насельніцтва Зямлі) і адносіць сябе да адной з існуючых рэлігій. Найбольшая колькасць прыхільнікаў у такіх рэлігій, як хрысціянства (больш за 2 млрд), іслам (больш за 1,5 млрд), індуізм і канфуцыянства (па 1 млрд), будызм (каля 0,5 млрд).

Сусветнымі рэлігіямі, што зрабілі найбольшы ўплыў на развіццё чалавецтва, прызнаюцца будызм, хрысціянства і іслам. Іх характэрнымі рысамі з'яўляюцца: *касмапалітызм* (ад грэч. *κοσμοπολίτης* — грамадзянін свету), які ставіць адзінства веры вышэй за палітычнае або нацыянальнае адзінства; *эгалітарнасць* — роўнасць вернікаў перад Богам незалежна ад іх колеру скуры, нацыянальнасці, сацыяльнага становішча; абяцанне веруючаму чалавеку справядлівых адносін да яго на тым свеце ў залежнасці ад яго набожнасці ў зямным жыцці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сусветныя рэлігіі

| Будызм | Хрысціянства | Іслам |
|---|---|---|
| Узнік у VI ст. да н. э. у Індыі | Узнікла ў I ст. ва ўсходняй частцы Рымскай імперыі, на тэрыторыі Палесціны | Узнік у VII ст. у Заходняй Аравіі |
| **Асноўныя імёны і паняцці** | | |
| Сідхартха Гаўтама, Буда, сансара, нірвана, карма, пáгада | Тройца, Ісус Хрыстос, Святое Пісанне (Біблія), Святое Паданне, каталіцызм, праваслаўе, пратэстантызм (лютэранства, кальвінізм, англіканства), касцёл, царква, кірха | Алах, Мухамед, Мекка і Медына, Каран, суна, сунізм і шыізм, шарыят, хадж, Кааба, мячэць, мінарэт |





На аснове гістарычных ведаў і дадатковых крыніц інфармацыі растлумачце асноўныя паняцці, звязаныя з сусветнымі рэлігіямі. Якія з прыведзеных паняццяў з'яўляюцца назвамі канфесій? Падрыхтуйце паведамленне пра адну з сусветных рэлігій. ■

**Сучасныя рэлігійныя арганізацыі і рэлігійныя дзеячы выступаюць важнымі і актыўнымі суб'ектамі сацыяльных адносін**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

у разнастайных сферах жыцця грамадства. Рэлігія працягвае адыгрываць пэўную ролю ў арганізацыі і ажыццяўленні культурнага, палітычнага, эканамічнага ўзаемадзеяння паміж дзяржавамі і народамі. Разам з тым, згодна з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека, «кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду змяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і сумесна з іншымі, публічным ці прыватным парадкам у вучэнні, богаслужэнні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў». Такім чынам, **свабода сумлення** мае на ўвазе самастойнасць чалавека ў выбары, верыць яму ў Бога ці адмаўляць рэлігійную веру. Свабода сумлення ўключае *свабоду веравызнання*, права быць прыхільнікам якой-небудзь рэлігіі, выбіраць або змяняць сваю веру. Важнае значэнне ў сучасным свеце мае **верацярпімасць** — прызнанне за кожным грамадзянінам права вызнаваць любую рэлігію, а значыць, паважлівае стаўленне да прадстаўнікоў іншых веравызнанняў.

З курса гісторыі вам вядома, што адной з праяў міжканфесійных супярэчнасцей з'яўляюцца рэлігійныя войны. Прывядзіце прыклады, да якіх трагічных наступстваў яны прыводзілі. Якія меры могуць папярэдзіць небяспеку ўзнікнення ўзброеных сутыкненняў на аснове міжканфесійнай варожасці? ■

Разам з тым не знікаюць факты рэлігійных і рэлігійна-палітычных канфліктаў, якія дэстабілізуюць цэлыя рэгіёны нашай планеты, што сведчыць не толькі пра пазітыўны патэнцыял сучасных рэлігій, але і пра іх дэструктыўныя магчымасці. Наша цывілізацыя павінна працягнуць пераадоленне негатыўных бакоў функцыянавання рэлігіі ў грамадстве: рэлігійнага фанатызму, нецярпімасці — у апоры на гуманістычны сэнс рэлігійных вучэнняў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Ахарактарызуйце спецыфіку рэлігійнага светапогляду.
2. Якія функцыі рэлігіі, на ваш погляд, з'яўляюцца самымі важнымі ў жыцці сучаснага грамадства? Якія функцыі былі найбольш значнымі ў больш раннія перыяды гісторыі?
3. Канкрэтызуйце прыкладамі працэсы павелічэння і памяншэння ролі рэлігіі ў грамадстве. Прывядзіце прыклады рэлігійных і свецкіх падзей з гісторыі Сафійскага сабора ў Полацку. ■



Выканайце міні-праект «Гіпертэкст з тэксту». Знайдзіце тэксты песень айчынных і замежных выканаўцаў, у назве якіх прысутнічае слова «вера» або «рэлігія». Стварыце з тэкстаў песень гіпертэксты — устаўце гіперспасылкі на імёны і назвы, што ў іх сустракаюцца. Прадстаўнікі якіх рэлігійных плыняў прыгадваюцца ў песнях? Які гуманістычны пасыл закладзены ў песнях? ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 21. Філасофія

## Філосафы працягваюць шукаць адказы на адвечныя пытанні?




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце філасофіі і яе структура.** Любая культура заснавана на светапоглядзе — уяўленнях пра свет, чалавека і яго месца ў ім. Людзі, як правіла, не задумваюцца пра паходжанне, сутнасць і межы функцыянавання гэтых уяўленняў. Але калі гэтыя межы даюць сябе адчуць, існуючыя ўяўленні пачынаюць адмiраць. У працэсе ўзаемадзеяння культур выяўляецца розніца іх светапоглядных асноў, якія асэнсоўваюцца і пачынаюць усведамляцца. На базе гэтага асэнсавання ўзнікае асаблівы ўзровень развіцця культуры — філасофія.

Філасофія ўзнікае як першая спроба чалавека рацыянальна спазнаць свет і сваё месца ў ім. У VII–VI стст. да н. э. філасофія ўзнікае адначасова ў Старажытным Кітаі, Старажытнай Індыі, Старажытнай Грэцыі.

Даведайцеся і назавіце імёны мысліцеляў, філосафаў, якія жылі ў перыяд паміж 800 і 200 гг. да н. э. у Кітаі, Індыі, Грэцыі.

Што вам пра іх вядома? Ці гучаць гэтыя імёны сёння? ■




Як вы мяркуеце, чаму перыяд з VIII па II ст. да н. э. філосафы называюць часам духоўнага заснавання чалавецтва? ■

**Філасофія** (ст.-грэч. *φιλοσοφία* — любоў да мудрасці) — гэта форма тэарэтычнага мыслення, якая аперыруе абстрактнымі паняццямі і фарміруе сістэму ведаў пра найбольш агульныя і фундаментальныя характарыстыкі рэальнасці і спосабы яе пазнання чалавекам.

Выключна агульныя, фундаментальныя паняцці філасофіі называюцца *катэгорыямі*.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне






Паспрабуйце сваімі словамі даць азначэнні паняццям «час», «прастора», «рух», «матэрыя». Параўнайце іх з азначэннямі з філасофскага слоўніка.

Апішыце час па карціне Сальвадора Далі «Пастаянства памяці» і папулярным інтэрнэт-меме пра час.

У структуру філасофіі ўваходзяць такія раздзелы (філасофскія дысцыпліны), як *анталогія* (вучэнне пра быццё), *гнасеалогія* (вучэнне пра свядомасць), *антрапалогія* (вучэнне пра чалавека), сацыяльная філасофія, філасофія культуры, а таксама *этыка* (вучэнне пра мараль), *эстэтыка* (філасофія мастацтва, або вучэнне аб прыгожым), рэлігіязнаўства і інш.

Іншы раз у паўсядзённым ужытку, калі хочуць абазначыць выключна абагульненыя веды пра які-небудзь прадмет, кажуць пра філасофію мовы, філасофію кахання, філасофію музыкі і да т. п. Аднак у дакладным сэнсе гэтага слова філасофія мае на ўвазе форму пазнання свету ў выключна шырокім маштабе.

**Гістарычная дынаміка філасофіі.** Гісторыя філасофіі ўключае ў сябе мноства філасофскіх вучэнняў — самых розных, якія не супадаюць адно з адным ні па сваіх базавых прынцыпах, на якія яны абапіраюцца, ні па каштоўнасцях, на якія арыентуюцца. Гэтыя вучэнні разнастайныя і іншы раз не толькі несумесныя адно з адным, але і супрацьлеглыя па сваім змесце. Аднак у цэлым у гісторыі філасофіі прасочваюцца пэўныя заканамернасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Па-першае, фарміраванне філасофскіх вучэнняў, школ і напрамкаў у многім залежыць ад агульнага ўзроўню развіцця грамадства, яго культурнай традыцыі; па-другое, філасофскія вучэнні змястоўна ўплываюць адно на адно.**

Існуе некалькі інтэрпрэтацый (тлумачэнняў) вядомай карціны XVI ст. «Тры філосафы». Найбольш распаўсюджаным з'яўляецца ўяўленне, што персанажы ўвасабляюць старажытнагрэчаскую філасофію (стары чалавек), арабскую філасофію (дарослы мужчына) і філасофію Адраджэння (юнак). Карціна нібы сімвалізуе перадачу ведаў старажытнагрэчэскай філасофіі праз арабскія пераклады італьянскаму Адраджэнню.



*Джарджоне. Тры філосафы. 1509 г.*

Іншыя інтэрпрэтацыі разглядаюць персанажаў у якасці трох стадый чалавечага жыцця (юнацтва, сталасць, старасць) або трох эпох еўрапейскай цывілізацыі (Антычнасць, Сярэднявечча, Адраджэнне).

Як можна патлумачыць, што ёсць некалькі сэнсавых інтэрпрэтацый прадстаўленай карціны? ■

Вызначце на аснове ведаў па гісторыі і з дадатковых крыніц інфармацыі, чаму передача ведаў старажытнагрэчаскай філасофіі адбылася ў эпоху Адраджэння праз пераклады арабскіх тэкстаў. ■

**Перыядызацыя гісторыі філасофіі можа ажыццяўляцца па розных крытэрыях. Так, пры выкарыстанні гістарычнага крытэрыю кажуць пра філасофію Старажытнага Усходу, філасофію Антычнасці, сярэднявечную філасофію, філасофію Новага часу і Асветніцтва і г. д. — да самай сучаснай філасофіі.**


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Асноўныя этапы развіцця заходнееўрапейскай філасофіі

| | |
|---|---|
| **Антычная філасофія** (з VII–VI стст. да н. э.) | Сузіральная філасофія. Асноўныя пытанні: з чаго ўсё ўзнікла, што з'яўляецца першаасновай свету (ідэя ці матэрыя), як уладкаваны космас, грамадства, дзяржава |
| **Сярэднявечная філасофія** | Ва ўмовах панавання рэлігійнага хрысціянскага светапогляду задача філосафа бачылася ў вытлумачэнні ісцін, што адкрыты людзям Богам і ўтрымліваюцца ў Святым Пісанні (Бібліі). Асноўныя пытанні: аб суадносінах веры і розуму, аб доказах існавання Бога |
| **Філасофія Адраджэння** | Прынцыпам светапогляду робіцца ідэя *гуманізму*. Чалавек не проста пазнае сябе і навакольны свет, ён стварае самога сябе, усведамляе сябе творцам свайго лёсу |
| **Філасофія Новага часу** | Галоўнай праблемай філасофіі выступае абгрунтаванне магчымасці і шляхоў дасягнення правільнага пазнання свету. Узнікае спрэчка паміж прыхільнікамі *эмпірычнага* (заснаванага на доследзе) і *рацыянальнага* (заснаванага на мысленні) пазнання. У другой палове XVIII — сярэдзіне XIX ст. узнікаюць цэласныя філасофскія сістэмы |
| **Сучасная філасофія** | У сярэдзіне XIX ст. на змену бязмежнай веры ў розум прыходзіць імкненне да пераацэнкі ўсіх каштоўнасцей, узнікае недавер да розуму, або *ірацыяналізм*. У XX–XXI стст. існуе мноства філасофскіх школ і напрамкаў |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Нярэдка да філасофіі прымяняюць і такія крытэрыі, як рэгіянальны (у гэтым выпадку кажуць, напрыклад, пра заходнееўрапейскую або лацінаамерыканскую філасофію) ці нацыянальны (пры такім падыходзе можна казаць пра беларускую філасофію, італьянскую, рускую, французскую і інш.).

**Філасофія ў сістэме культуры.** Разам з філасофіяй у культуры існуюць і іншыя формы пазнання свету: міф, мастацтва, рэлігія і, вядома, навука.

Філасофія вырастае са старажытнай міфалогіі; у рамках міфаў таксама ўзнікалі своеасаблівыя карціны светабудовы — першыя ўяўленні пра свет і чалавека. Аднак філасофія адрозніваецца ад міфалогіі сваёй доказнасцю і дакладнасцю паняццяў. Філасофскія паняцці, у адрозненне ад слоў натуральнай мовы, характарызуюцца дакладна вызначаным зместам. За кожным паняццем стаіць зафіксаванае азначэнне, у той час як у гутарковай мове людзі могуць ужываць словы, абапіраючыся не на дакладна зададзенае лагічнае азначэнне, а на пачуццёвае ўяўленне.

Філасофія прынцыпова адрозніваецца ад мастацтва як формы пазнання тым, што будуе свае сістэмы *светатлумачэння* на рацыянальнай аснове: усе філасофскія развагі строга адпавядаюць логіцы, абапіраюцца на адкрыта абумоўленыя прынцыпы і выкарыстоўваюць тэрміны з дакладна акрэсленым зместам. У процілегласць гэтаму творы мастацтва прапануюць апісанне *светаперажывання* герояў, асноўныя ідэі аўтара могуць быць не выказаны адкрыта (але разумеюцца ў працэсе ўспрымання твора) і будуюцца на аснове мастацкіх вобразаў, якім уласціва шматзначнасць і якія выклікаюць у розных людзей розныя асацыяцыі.

Філасофія адрозніваецца ад рэлігіі, якая будуецца на дапушчэнні таго факта, што свет створаны і кіруецца звышнатуральнай і абсалютнай сілай (напрыклад, Богам або багамі). Такім чынам, рэлігія грунтуецца на веры, у той час як філасофія


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

абапіраецца на рацыянальныя і лагічна абгрунтаваныя веды. Акрамя таго, філасофскае мысленне вылучаецца ўнутранай свабодай, бо не абмежавана прынятымі ў той ці іншай рэлігіі дагматамі веры (палажэннямі, непадлеглымі сумненню і крытыцы), зместам свяшчэнных тэкстаў, аўтарытэтам айцоў царквы. Разам з тым у філасофіі і рэлігіі ёсць і агульнае: у фокусе інтарэсу і адной, і другой — найбольш агульныя, гранічныя пытанні, на якія чалавек заўсёды шукае адказы: як уладкаваны сусвет, у чым сутнасць жыцця, што ёсць чалавек і для чаго ён прыходзіць у свет, да чаго павінен імкнуцца.




Да нашых дзён дайшла адзіная выява выдатнага беларускага мысліцеля XVI ст. Сымона Буднага. Чалавек, якога сёння мы шануем як аўтара філасофскіх трактатаў, гуманіста, асветніка і перакладчыка кніг Бібліі, адлюстраваны езуітамі на карыкатуры — у пекле, па шыю ў кіпучай смале.

Якім чынам прыведзеная выява характарызуе рэлігійны і філасофскі светапогляд эпохі Адраджэння?

Што да філасофіі і навукі, то яны ў многім блізкія і падобныя між сабой. Філасофскія вучэнні могуць, з аднаго боку, абапірацца на навуковыя веды і абагульняць іх, з другога — прапаноўваць вучоным метадалогію вывучэння навакольнай прыроднай і сацыяльнай рэальнасці. Навука, як і філасофія, таксама выкарыстоўвае тэрміны з дакладна вызначаным зместам і таксама абапіраецца на рацыянальныя развагі і логіку, аднак філасофія і навука — розныя формы пазнання свету, і філасофскае пазнанне свету мае сваю спецыфіку.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Ці пазнавальны свет? | | |
|---|---|---|
| **Гнасеалагічны аптымізм** | **Скептыцызм** | **Агнастыцызм** |
| Свет пазнавальны | Выказвае сумненне ў магчымасці атрымання дакладных ведаў | Свет непазнавальны |

Пытанне, ці пазнавальны свет, у гнасеалогіі мае наступную фармулёўку: як адносяцца нашы ўяўленні пра навакольны свет да самога гэтага свету? Ці здольнае наша мысленне пазнаваць рэчаісны свет, ці можам мы ў нашых ўяўленнях і паняццях пра рэчаісны свет складаць правільныя адносіны да рэчаіснасці?

Якую ролю адыгрывае сумненне ў пазнанні?

Спецыфіка філасофіі заключаецца ў тым, што прадметам філасофскага інтарэсу з'яўляюцца так званыя *адвечныя*, ці *фатальныя* пытанні, якія стаяць перад чалавецтвам заўсёды і патрабуюць новага адказу ў кожную новую эпоху. Так, калі фізіка ўстанавіла хуткасць распаўсюджання святла ў вакууме, то гэта можа лічыцца дасягнутым навукай веданнем. Зразумела, рэальнасць развіваецца і новыя яе формы патрабуюць новых пазнавальных намаганняў; развіваецца і сама навука, узнікаюць новыя прыборы і новыя метады пазнання, што таксама прыводзіць да ўдакладнення сфарміраванага на гэты момант масіву ведаў. Аднак гаворка ідзе, тым не менш, менавіта пра ўдакладненне і ўдасканаленне.

У адрозненне ад гэтага, напрыклад, пытанне, для чаго жыве чалавек (ці, па-іншаму, у чым сэнс жыцця), — гэта пытанне, якое зноў і зноў паўстае перад кожнай гістарычнай эпохай і перад кожнай індывідуальнай свядомасцю ва ўсёй вастрыні і навізне: яно актуальнае для любога чалавека і патрабуе канкрэтнага адказу, аднак гэты адказ не можа быць дадзены аднойчы і назаўсёды,


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

бо залежыць і ад культуры той ці іншай эпохі, і ад асабістых якасцей кожнага чалавека (яго маральнай свядомасці, рэлігійных поглядаў, гісторыі яго жыцця і жыццёвага досведу і г. д.).

**НАВОШТА**
**Я філасофствую?**

**У каго ёсць «для чаго» жыць, зможа вынесці амаль любое «як».**
*Фрыдрых Ніцшэ*

**Сэнсу жыцця не існуе, мне давядзецца самому стварацьяго.**
*Жан-Поль Сартр*

**#філасофія**

**Што ёсць свет?**
**Што ёсць ісціна?**
**Што ёсць чалавек?**
**Што ёсць жыццё?**
**Што ёсць душа?**
**У чым сэнс жыцця?**

**#адвечныя пытанні**

- **Што я магу ведаць?**
- **Што я павінен рабіць?**
- **На што я магу спадзявацца?**

*Імануіл Кант*

Філасофія абагульняе ў сваім змесце ўсе дасягненні ў галіне культуры чалавецтва таго ці іншага гістарычнага перыяду — яго навукі, рэлігіі, маралі, мастацкай, палітычнай і прававой традыцый, выступаючы квінтэсенцыяй культурных дасягненняў кожнай канкрэтнай гістарычнай эпохі, выяўляючы ў рацыянальнай форме тыя сэнсавыя і каштоўнасныя асновы, на якіх яна сфарміравана.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Назавіце асноўныя адрозненні філасофскага светапогляду ад звычнага, ахарактарызуйце спецыфіку філасофіі ў параўнанні з іншымі формамі пазнання свету — мастацтвам, рэлігіяй, навукай.
2. Вызначце, які падыход да пазнання (эмпірызм ці рацыяналізм) можа быць праілюстраваны з дапамогай цытаты:
   - «Думаю, значыць, існую» (Рэне Дэкарт);
   - «Эксперымент — гэта катаванне прыроды з мэтай выпытаць яе тайны» (Фрэнсіс Бэкан).
3. Ці можна разлічваць на тое, што ўсе філосафы выпрацуюць адзіную светапоглядную пазіцыю? Абгрунтуйце сваю думку. ■

Выканайце міні-праект «Партрэт філосафа ў часе» (як і чаму зрабіўся філосафам, галоўныя ідэі і творы, ці быў цікавы сучаснікам або нашчадкам і інш.). ■


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 22. Навука

## Навука можа вырашыць усе праблемы чалавецтва?



**Каштоўнасці**

**Ісціна**

**Прынцыпы**

- Універсалізм
- Агульнасць
- Бескарыслівасць
- Арганізаваны скептыцызм

**Навука**

**Узроўні**
- Тэарэтычны
- Эмпірычны

**Даследаванні**
- Фундаментальныя
- Прыкладныя

**Сацыяльны інстытут**
- Універсітэцкая
- Акадэмічная

**Віды**
- Прыродазнаўчая
- Гуманітарная
- Тэхнічная



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Навуковае пазнанне, мэты і каштоўнасці навукі.** Пад **навукай** разумеюць дзейнасць па выпрацоўцы і сістэматызацыі аб'ектыўных ведаў пра свет, а таксама сацыяльны інстытут, мэтай якога з'яўляецца такая дзейнасць. У адпаведнасці з гэтым разглядаць навуку магчыма з двух пунктаў погляду.

Навука як адмысловая пазнавальная дзейнасць адрозніваецца ад звычнага, паўсядзённага пазнання тым, што вывучае з'явы, якія яшчэ толькі ўваходзяць у сферу чалавечага разгляду. Звычнае ж пазнанне мае справу з прадметамі, што выступаюць новымі толькі для таго ці іншага чалавека, а для чалавецтва ў цэлым ужо даўно з'яўляюцца вывучанымі. Так, дзіця, што адкрывае для сябе свет і ўпершыню бачыць матылька, успрымае яго як нешта новае, аднак яго пазнанне ў дадзеным выпадку нічога новага да біялогіі як навукі не дадае.

Навуковае пазнанне адрозніваецца ад звычнага тым, што патрабуе наяўнасці адмысловых інструментаў. Гэтыя інструменты бываюць двух відаў.

Пад *інструментамі* перш за ўсё разумеюць прыборы, з дапамогай якіх ажыццяўляецца вывучэнне тых або іншых з'яў і вымярэнне тых або іншых велічынь. У гісторыі навукі назіраецца тэндэнцыя пераходу навуковых прыбораў у штодзённы ўжытак чалавека: так, першыя халадзільнік, радыёпрыёмнік і г. д. былі сканструяваны менавіта як прыборы для навуковых даследаванняў, а ўжо потым сталі выкарыстоўвацца як бытавыя прылады.

Пад навуковым інструментарыем разумеюць таксама *спецыяльныя тэрміны* — маўленчыя сродкі, што выкарыстоўваюцца ў навуковай мове (пры зносінах вучоных у час абмеркавання навуковых праблем, пры публікацыі вынікаў даследаванняў і да т. п.). Паняцці, якія выражаюцца гэтымі тэрмінамі, вылучаюцца асаблівай дакладнасцю значэння, не дапускаючы шматзначнасці. Гэта трэба для таго, каб вучоныя цалкам разумелі адзін аднаго, а вынікі даследаванняў маглі быць апісаны без разначытанняў.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне







У 1543 г. была апублікавана праца Мікалая Каперніка «Аб вярчэнні нябесных сфер» — адна з прац, якая здзейсніла сур'ёзны пераварот у поглядах людзей. У гэтай кнізе была прапанавана новая мадэль сусвету, згодна з якой Сонца з'яўляецца цэнтрам Сусвету, а планеты рухаюцца вакол яго. Сістэма сусвету Каперніка прапаноўвалася замест агульнапрызнанай на той момант мадэлі Пталемея, дзе цэнтрам лічылася нерухомая Зямля. ■

Назавіце кожную з апісаных мадэляў сусвету, выкарыстоўваючы навуковыя тэрміны, якія абазначаюць:

- мадэль сусвету, у цэнтры якой знаходзіцца Зямля;
- мадэль сусвету, у цэнтры якой знаходзіцца Сонца.

Прывядзіце прыклады навуковых тэрмінаў з сацыялогіі, паліталогіі, эканомікі, што былі ўведзены ў папярэдніх параграфах. ■

**Навуковае пазнанне патрабуе для свайго ажыццяўлення адмысловай падрыхтоўкі, у той час як звычнае пазнанне ажыццяўляецца ўсімі без выключэння (напрыклад, дзіця з першых дзён жыцця спасцігае знешні свет, вучыцца ўзаемадзейнічаць з навакольнымі прадметамі і г. д.). Адмысловая падрыхтоўка мае на ўвазе засваенне ўжо назапашаных у пэўнай галіне навукі ведаў,**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

авалоданне прыёмамі і метадамі навуковага даследавання, мовай навукі.

Канчатковай мэтай навуковага пазнання з'яўляецца паляпшэнне жыцця чалавека на аснове ўкаранення ў практыку атрыманых навуковых ведаў, але веды пра свет каштоўныя і самі па сабе. Гэта каштоўнасць выражаецца ў пазнанні *ісціны*, пад якой разумеюць адпаведнасць ведаў пра свет самому свету. Паняцце ісціны адрозніваецца ад паняцця *праўды*, паколькі ісціна аб'ектыўная, а значыць, незалежная ад чалавека, у той час як праўда суб'ектыўная і залежыць ад таго, хто пра яе гаворыць, з-за чаго ў розных людзей можа быць *свая праўда* (сваё ўяўленне пра мастацкія вартасці таго ці іншага твора, свая ацэнка таго ці іншага чалавека і да т. п.).

**Узроўні навуковага пазнання.** У навуковым пазнанні вылучаюць два ўзроўні: *эмпірычны* (грэч. *εμπειρία* — вопыт) і *тэарэтычны* (грэч. *θεωρία* — разгляд, даследаванне).

Галоўным вынікам эмпірычнага пазнання выступае навуковы факт. Без масіву фактаў (эмпірычнай базы) немагчыма пачаць даследаванні. Разам з тым самі па сабе разрозненыя факты — без іх абагульнення і інтэрпрэтацыі — таксама не забяспечваюць атрымання навуковых ведаў.

На тэарэтычным ўзроўні навуковага пазнання ствараюцца тэорыі, якія не толькі апісваюць, але і тлумачаць з'явы і працэсы, што вывучаюцца. Тэорыі ўзнікаюць з гіпотэз — выказаных меркаванняў, якія павінны быць абгрунтаваны. Гэта абгрунтаванне адбываецца ў два этапы: спачатку правяраюць, ці няма ў выказанай гіпотэзе ўнутраных супярэчнасцей, затым высвятляюць, ці адпавядае выказанае меркаванне эмпірычным фактам, ісціне. Зразумела, з часам тэорыі могуць змяняць адна адну, паколькі пазнанне рухаецца наперад: з аднаго боку, чалавек пашырае сферу свайго пазнання, з другога боку, сама навука развіваецца, і з'яўленне новых метадаў і прыбораў удакладняе і пашырае існуючую сістэму ведаў.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Вызначце, да якіх навук адносяцца дадзеныя эксперыменты. Які ўзровень навуковага пазнання яны прадстаўляюць? ■

**Класіфікацыя навук.** Навука падзяляецца на *гуманітарную* (прадметам вывучэння якой выступаюць чалавек і грамадства — ад лац. *humanus* — чалавечы, *homo* — чалавек) і *прыродазнаўчую* (засяроджаную на вывучэнні прыроды); кажуць таксама пра *тэхнічныя навукі*. Да гуманітарных навук належаць псіхалогія, культуралогія, гісторыя, сацыялогія, паліталогія і інш., да прыродазнаўчых — фізіка, хімія, біялогія, геаграфія і інш.; да тэхнічных навук адносяцца электратэхніка, інфарматыка і інш.

Гуманітарныя, прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі ўключаюць у сябе мноства навуковых дысцыплін. Так, фізіка ўключае механіку, оптыку, квантавую фізіку і інш.; інфарматыка — тэорыю моў праграмавання, штучны інтэлект і інш.; філалогія — мовазнаўства і літаратуразнаўства, якія, у сваю чаргу, таксама распадаюцца на больш прыватныя навуковыя дысцыпліны (напрыклад, у мовазнаўстве ў залежнасці ад моў, што вывучаюцца, вылучаюць славістыку, цюркалогію, раманістыку і інш., а ў залежнасці ад ракурсу вывучэння мовы — марфалогію, дыялекталогію і інш.).

Навуковыя даследаванні падзяляюць на *фундаментальныя*, арыентаваныя на адкрыццё асноватворных законаў уладкавання

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

свету, і *прыкладныя*, што маюць сваёй задачай вынаходства тэхналогій, якія могуць быць выкарыстаны ва ўсіх сферах чалавечага жыцця (у прамысловай вытворчасці, сельскай гаспадарцы, медыцыне, адукацыі, транспарце, сувязі, культуры і г. д.) і прызначаны для паляпшэння жыцця чалавека (росту эфектыўнасці і экалагічнасці вытворчасці, павышэння бяспекі, камфорту жыцця і да т. п.). Прыкладная навука развіваецца на аснове адкрыццяў, зробленых навукай фундаментальнай, таму, каб заўтра атрымаць добры прыкладны эфект ад развіцця навукі, ужо сёння неабходна забяспечваць развіццё яе фундаментальных галін.

**Навука як сацыяльны інстытут.** Функцыянаванне сучаснай навукі — гэта складаны працэс, які мае на ўвазе яе прадуманую арганізацыю, планаванне навуковых даследаванняў і ўкараненне іх вынікаў, кіраванне навуковым працэсам і яго фінансаванне. Навука як сацыяльны інстытут — гэта разгалінаваная сістэма арганізацый, якія займаюцца навуковай дзейнасцю. Пры такім падыходзе ў навуцы вылучаюць два кампаненты: акадэмічную навуку і навуку ўніверсітэцкую.

*Акадэмічная навука* прадстаўлена навукова-даследчымі інстытутамі (НДІ) і, як правіла, кіруецца Акадэміяй навук, прычым кожны НДІ мае сваю спецыялізацыю. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі была адкрыта ў 1929 г. і з’яўляецца вядучай навуковай арганізацыяй нашай краіны. Менавіта яна ажыццяўляе арганізацыю і каардынацыю навуковых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь.

*Універсітэцкая навука* развіваецца ў вышэйшых навучальных установах (ВНУ). Яна мае сваёй мэтай падрыхтоўку навуковых кадраў, якія будуць валодаць неабходнымі ведамі, кампетэнцыямі і навыкамі, каб працягнуць навуковы пошук.

У сучасных умовах гэты падзел з’яўляецца даволі ўмоўным, паколькі, з аднаго боку, кафедры і лабараторыі ўніверсітэтаў вядуць вялікую навукова-даследчую работу, з другога — пры Акадэміях


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

навук нярэдка маюцца аспірантура і дактарантура, дзе рыхтуюцца навуковыя кадры вышэйшай кваліфікацыі — кандыдаты і дактары навук. Напрыклад, пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі функцыянуе спецыяльны Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі.





Каля ўвахода ў будынак Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі ўсталяваны незвычайны памятны знак — «Стужка Мёбіуса». Даведайцеся, у чым заключаецца ідэя гэтай мемарыялізацыі. Выкарыстайце памятку для працы з фота мемарыяла, помніка.

Паспяховае правядзенне навуковых даследаванняў і эфектыўнае ўкараненне ў жыццё атрыманых вынікаў надзвычай важныя для кожнай краіны, бо забяспечваюць прагрэс ва ўсіх галінах жыцця грамадства. Разам з тым развіццё навукі мае і агульначалавечую размернасць, паколькі навуковыя веды, якія дазваляюць спасцігнуць законы навакольнага свету — як прыроднага, так і сацыяльнага, з'яўляюцца набыткам усяго чалавецтва.

Вельмі важна, каб дасягненні навукі і тэхнікі не паварочваліся супраць самога чалавека. Пошук ісціны не можа ажыццяўляцца па-за сувяззю з маральнымі прынцыпамі і нормамі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Альфрэд Нобель быў хімік, інжынер і вынаходнік. За сваё жыццё ён назапасіў значнае багацце, большая частка якога з'яўлялася даходам ад яго 355 вынаходстваў, сярод якіх самае вядомае — дынаміт.

У 1888 г., калі памёр брат Альфрэда Людвіг Нобель, у газетах памылкова з'явіўся некралог на смерць самога вынаходніка. Прачытаўшы яго назву — «Гандляр смерцю мёртвы», Альфрэд Нобель задумаўся над тым, якім яго будзе памятаць чалавецтва. ■

Якім чынам Альфрэд Нобель змяніў сваё завяшчанне? Як гэта адбілася на развіцці сусветнай навукі? ■

**Амерыканскім сацыёлагам XX ст. Робертам Мертанам былі сфармуляваны чатыры базавыя прынцыпы, якімі павінны кіравацца вучоныя ў сваёй даследчай дзейнасці. Па-першае, ацэнка любой навуковай ідэі павінна вынікаць толькі з яе зместу, незалежна ад навуковага аўтарытэту і сацыяльнага статусу яе аўтара (*прынцып універсалізму*). Па-другое, вынікі навуковых даследаванняў павінны рабіцца агульным набыткам, без манапольнага валодання імі (*прынцып агульнасці*). Па-трэцяе, вучоны ў першую чаргу павінен імкнуцца да пошуку ісціны, вырашэння навуковай праблемы, а не атрымання асабістай карысці (*прынцып бескарыслівасці*). Па-чацвёртае, вучоныя павінны крытычна ставіцца да выказаных ідэй, у тым ліку і сваіх уласных, і падвяргаць іх крытычнаму абмеркаванню (*прынцып арганізаванага скептыцызму*).**

**З праблемай маральных асноў навукі шчыльна звязана праблема адказнасці вучонага перад грамадствам. Як паказаў досвед XX ст., развіццё новых тэхналогій у разнастайных галінах у шэрагу выпадкаў можа быць непрадказальным. Сёння грамадства прыйшло да ўсведамлення таго, што тэхнічны прагрэс без гуманітарных каштоўнасцей можа прывесці да гібелі чалавецтва (напрыклад, выкарыстанне ядзернай энергіі з ваеннай мэтай павінна блакіравацца маральнымі і юрыдычнымі абмежаваннямі).**



Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Абодва прадстаўленыя аб'екты з'явіліся ў 1958 г. Збудаванне Атаміум (якое адлюстроўвае фрагмент крышталічнай рашоткі жалеза) было ўзведзена ў г. Бруселі як сімвал атамнага веку і мірнага выкарыстання атамнай энергіі. Дзіцячы помнік міру быў адкрыты ў г. Хірасіме. У яго верхняй частцы ўвекавечана дзяўчынка Садака Сасакі з жураўлікам-арыгамі ў руках.

З якімі гістарычнымі падзеямі звязана з'яўленне дадзеных аб'ектаў? Які сімвалічны сэнс мае выява жураўліка? Якім чынам дадзеныя аб'екты звязаны з праблемай адказнасці вучоных за свае даследаванні? ■

1. Ахарактарызуйце асаблівасці навуковага пазнання і яго прынцыповыя адрозненні ад пазнання звычнага.
2. Якім чынам выказванне старажытнагрэчаскага філосафа Арыстоцеля «Платон мне сябар, аднак ісціна даражэйшая» адлюстроўвае спецыфіку навуковага пазнання?
3. Прывядзіце прыклад прыкладных даследаванняў у галіне прыродазнаўчых навук. ■

Выканайце міні-праект «Вобраз вучонага ў мастацкай культуры». Вызначце, якая праблема навукі раскрыта праз вобраз Пачвары Франкенштэйна — персанажа многіх кніжных і кінематаграфічных твораў. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 23. Адукацыя

## Ад «адукацыі на ўсё жыццё» да «адукацыі праз усё жыццё»?

**Навучанне** + **Выхаванне** =

### Адукацыя

**Фармальная**
(школы, ліцэі, каледжы, універсітэты)



**Нефармальная**
(адукацыйныя курсы, гурткі па інтарэсах, зносіны са значнымі людзьмі)





### Кампетэнцыі XXI стагоддзя

**1 Крытычнае мысленне**

Уменне арыентавацца ў патоках інфармацыі, аналізаваць і ацэньваць яе



**2 Крэатыўнасць**

Уменне ацэньваць сітуацыю з розных бакоў, генерыраваць ідэі, прымаць нестандартныя рашэнні і адчуваць сябе ўпэўнена пры змене абставін



**3 Кааперацыя (супрацоўніцтва)**

Уменне вызначаць агульную мэту і спосабы яе дасягнення, размяркоўваць ролі і ацэньваць вынік, працаваць у камандзе



**4 Камунікацыя**

Уменне дамаўляцца і наладжваць кантакты, слухаць суразмоўцу і даносіць свой пункт погляду





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце адукацыі.** Права на адукацыю лічыцца найважнейшым правам чалавека: яно было абвешчана ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (1948 г.), у Міжнародным пакце аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.), Канвенцыі аб правах дзіцяці (1989 г.) і забяспечваецца нацыянальнымі прававымі актамі.

Што ж такое адукацыя? **Адукацыя** — гэта мэтанакіраваны працэс навучання і выхавання, які ажыццяўляецца на прафесійнай аснове спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі. Пад *навучаннем* разумеюць арганізацыю дзейнасці навучэнцаў, у ходзе якой яны засвойваюць веды, уменні і навыкі. *Выхаванне* прадугледжвае арганізацыю дзейнасці вучняў, у ходзе якой фарміруюцца каштоўнасці, светапогляд, асабістыя якасці. Кожная гістарычная эпоха выбудоўвала такую сістэму адукацыі, якая не толькі абапіралася на дасягнуты да гэтага часу ўзровень ведаў, але і адпавядала мэтам развіцця грамадства. У развітых сістэмах адукацыі навучанне і выхаванне з'яўляюцца непарыўнымі кампанентамі адзінага цэлага.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 49.** Кожны мае права на адукацыю.

Гарантуюцца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступная для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі кожнага. Кожны можа на конкурснай аснове бясплатна атрымаць адпаведную адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах.

Вызначце спецыфіку гарантый дзяржавы ў адносінах да розных відаў адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




У 2015 г. дзяржавы-члены Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прынялі дакумент «Пераўтварэнне нашага свету: Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года», які ўтрымлівае 17 глабальных мэт развіцця чалавецтва на бліжэйшыя гады. Чацвёртая мэта мае на ўвазе «забеспячэнне ўсёахопнай і справядлівай якаснай адукацыі і садзейнічанне магчымасці навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх».

Дасягненне якога ўзроўню адукацыі з'яўляецца актуальнай задачай у сусветным маштабе? Якая адукацыя з'яўляецца ў нашай краіне абавязковай? ■

Растлумачце, у чым заключаецца кожная з мэт устойлівага развіцця, і суаднясіце іх з асноўнымі сферамі грамадскага жыцця. ■



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Адукацыя як сацыяльны інстытут.** У сучасным грамадстве адукацыя ўяўляе сабой складаны і шматузроўневы сацыяльны інстытут. Па-першае, гэта ўстановы адукацыі, у якіх арганізавана навучанне і выхаванне (дзіцячыя сады, школы, каледжы, універсітэты і інш.). Па-другое, гэта сістэма норм і правіл, сацыяльных роляў і адносін, якія ўзнікаюць у адукацыйным працэсе паміж яго рознымі суб'ектамі (настаўнік, вучань, выкладчык, студэнт і г. д.).

У Рэспубліцы Беларусь склалася і паспяхова функцыянуе шматузроўневая сістэма адукацыі. Першым узроўнем з'яўляецца дашкольная адукацыя, затым ідзе агульная сярэдняя адукацыя, якая ўключае пачатковую адукацыю, базавую адукацыю, сярэднюю адукацыю.

Закончыўшы базавую школу, падлетак можа працягнуць навучанне ва ўстанове агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі (каледжах, прафесійных ліцэях) ёсць магчымасць адначасова атрымаць агульную сярэднюю адукацыю і прафесійную падрыхтоўку. Навучэнцы, якія авалодалі прафесіяй на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі, могуць атрымаць сярэднюю спецыяльную адукацыю па роднаснай спецыяльнасці ў скарочаны тэрмін.

Вышэйшая адукацыя забяспечваецца вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, да якіх належаць інстытуты, акадэміі, універсітэты. Пераход па ўзроўнях адукацыі ад прафесійна-тэхнічнай да сярэдняй спецыяльнай дае магчымасць пасля паступіць ва ўстановы вышэйшай адукацыі на 3-ці курс навучання па роднаснай спецыяльнасці.

Добрыя магчымасці для развіцця асобы навучэнцаў у сферах тэхнічнай, дэкаратыўна-прыкладной творчасці, мастацтва, спорту, турызму ствараюць установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь

| Асноўная адукацыя | Дадатковая адукацыя | Спецыяльная адукацыя |
|---|---|---|
| • Дашкольная<br>• Агульная сярэдняя<br>• Прафесійна-тэхнічная<br>• Сярэдняя спецыяльная<br>• Вышэйшая<br>• Пасляўніверсітэцкая | • Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі<br>• Дадатковая адукацыя дарослых | Рэалізацыя праграм спецыяльнай адукацыі для навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця |

Даведайцеся, якія тыпы (віды) устаноў адукацыі ёсць у рэгіёне, дзе вы жывяце. ■

Якія гурткі, студыі, клубы, секцыі або іншыя аб'яднанні па інтарэсах вы наведваеце? Якую ролю адыгрывае дадатковая адукацыя ў вашым жыцці? Ці плануеце вы працягваць займацца па інтарэсах пасля заканчэння школы? ■

У кожнай краіне існуюць асаблівасці пабудовы адукацыйнай сістэмы і зместу адукацыі, якія абумоўлены нацыянальнымі, гістарычнымі і рэлігійнымі традыцыямі, характэрнымі для канкрэтных краін і рэгіёнаў.

Важную ролю ў развіцці вышэйшай адукацыі сёння адыгрывае Балонскі працэс, арыентаваны на фарміраванне адзінай еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі з дапамогай зближэння сістэм адукацыі краін Еўропы.

У цэлым можна казаць пра ўніверсальныя заканамернасці развіцця адукацыі: па меры развіцця грамадства яна робіцца ўсё больш глыбокай і ўсебаковай, а свабода доступу да адукацыі з'яўляецца адным з найважнейшых крытэрыяў прагрэсіўнасці і адкрытасці грамадства.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сацыёлаг Піцірым Сарокін адзначаў значную ролю адукацыі (першая палова XX ст.): «У грамадстве, дзе школы даступныя ўсім яго членам, школьная сістэма ўяўляе сабой “сацыяльны ліфт”, які рухаецца з самага нізу грамадства да самых вярхоў. У грамадстве, дзе прывілеяваныя школы даступныя толькі вышэйшым слаям насельніцтва, школьная сістэма ўяўляе сабой ліфт, які рухаецца толькі па верхніх паверхах сацыяльнага будынка і перавозіць уверх і ўніз толькі жыхароў верхніх паверхаў. Аднак нават у такім грамадстве некаторым індывідам з ніжэйшых слаёў усё ж удавалася пранікнуць у гэты школьны ліфт і дзякуючы яму ўзвысіцца». ■

Ці з'яўляецца адукацыя сацыяльным ліфтам у нашы дні? ■

**Тэндэнцыі ў развіцці адукацыі.** Сістэма адукацыі пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца. Развіццё лічбавых тэхналогій забяспечвае ўсё большыя магчымасці для дыстанцыйнага навучання, робячы адукацыю даступнай у любы час.

Найважнейшай тэндэнцыяй у развіцці сучаснай адукацыі з'яўляецца яе бесперапыннасць (адукацыя праз усё жыццё — *lifelong learning*), якая рэалізуецца праз павышэнне кваліфікацыі і разнастайныя курсы (адукацыя для дарослых). Сістэма бесперапыннай адукацыі адкрывае магчымасці не толькі для прафесійнага ўдасканалення, але і для больш поўнага развіцця асобы.

Бесперапынная адукацыя — адукацыя, якая ахоплівае ўсё жыццё чалавека і ўключае ў сябе фармальную (школа, універсітэт і інш.) і нефармальную (зносіны са значнымі людзьмі, гурткі па інтарэсах, адукацыйныя курсы без сертыфікацыі і г. д.) адукацыю.

У XXI ст. веды робяцца больш значнымі для грамадства, чым сыравінныя рэсурсы. *Грамадства ведаў* — канцэпцыя сучаснага этапу грамадскага развіцця, дзе дамінуючай каштоўнасцю становяцца веды самі па сабе. У грамадстве ведаў важней за ўсё навучыцца вучыцца, арыентавацца ў патоку інфармацыі, развіць крытычнае мысленне, якое дазваляе адрозніваць карысную інфармацыю ад бескарыснай, умець яе аналізаваць, тлумачыць і ацэньваць.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асноўнымі каштоўнасцямі робяцца інтэлект, крэатыўнасць, сацыяльныя ўменні, якія развіваюцца на працягу ўсяго жыцця чалавека. Адукацыя ва ўсім свеце ўжо арыентавана не толькі на фарміраванне традыцыйных прадметных ведаў і ўменняў, але і на стварэнне ўмоў для развіцця кампетэнцый XXI стагоддзя. Да іх, у прыватнасці, належаць крытычнае мысленне, крэатыўнасць, камунікацыя, кааперацыя.




Вызначце ключавыя паняцці ў воблаку «Грамадства ведаў», складзеным са слоў на англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай мовах. Выкарыстоўвайце электронныя рэсурсы для перакладу паняццяў. Наколькі проста іх перакласці ў наш час з замежнай мовы і як гэтая магчымасць звязана з грамадствам ведаў? Складзіце аналагічнае воблака слоў на беларускай або рускай мове. ■

*Крытычнае мысленне* мае на ўвазе ўменні аналізаваць інфармацыю, знаходзіць сувязі паміж сцвярджэннямі, пытаннямі, аргументамі, ацэньваць іх надзейнасць і пераканаўчасць, выяўляць недахоп інфармацыі, фармуляваць гіпотэзы, рабіць самастойныя высновы і абараняць іх, праводзіць праверку высноў.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Крэатыўнасць* з'яўляецца здольнасцю прапаноўваць новыя падыходы да вырашэння праблем, генерыраваць ідэі, прымаць нестандартныя рашэнні, мае на ўвазе цікаўнасць, самастойны пошук адказаў на пытанні, што ўзнікаюць.

*Камунікацыя* азначае здольнасць выказваць думкі, пачуцці і факты ў вуснай і пісьмовай форме, тлумачыць свае ідэі і прапановы, дамаўляцца з суразмоўцам.

*Кааперацыя* разглядаецца як эфектыўнае ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі і праца ў разнастайных камандах, уменне вызначаць агульную мэту і спосабы яе дасягнення, размяркоўваць ролі, ацэньваць вынік.

Такім чынам, у грамадстве ведаў, акрамя прадметных, прафесійных навыкаў, усё больш запатрабаванымі становяцца такія навыкі, якія не звязаны з пэўнай прадметнай сферай, а маюць на ўвазе рашэнне нестандартных задач і эфектыўнае ўзаемадзеянне з навакольнымі людзьмі ў самых розных сітуацыях.

1. У чым заключаецца спецыфіка адукацыі як працэсу і як сацыяльнага інстытута?
2. Назавіце фактары, якія прывялі да істотных змен у адукацыі сёння.
3. Чаму крытычнае мысленне, крэатыўнасць, кааперацыю і камунікацыю называюць кампетэнцыямі будучыні? Абгрунтуйце сваю думку. ■

Выканайце міні-праект. Стварыце ТОП-5 анлайн-платформ для самаадукацыі старшакласнікаў. Афарміце вынікі ў выглядзе плей-аркуша з апісаннем гэтых рэсурсаў. ■

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Духоўная сфера грамадства»

1. Дайце азначэнні наступным паняццям: *адукацыя, верацярпімасць, канфесія, навука, рэлігія, свабода сумлення, тэорыя, філасофія, эмпірыя, этыка.*
2. Падрыхтуйце візуальную азбуку «Духоўная сфера грамадства ад А да Я», уключыўшы ў яе асноўныя паняцці і персаналіі з раздзела навучальнага дапаможніка. Стварыце мультымедыйную прэзентацыю, якая павінна ўтрымліваць слайды ў алфавітным парадку. На кожным слайдзе размясціце візуальны матэрыял па тым паняцці, якое вы хочаце праілюстраваць.
3. Перыяд з 1715 па 1770-я гг., калі ў Францыі правіў кароль Людовік XV, атрымаў назву «Галантны век». Для яго было характэрна актыўнае развіццё моды і забаў, заўсёдныя балі, канцэрты і маскарады для прыдворных арыстакратаў. Галантным лічыўся выключна ветлівы, далікатны, выхаваны чалавек з вытанчанымі манерамі, маўленнем і касцюмам, чалавек, які цікавіўся навукамі і мастацтвам. Таксама гэты перыяд характарызуе вядомая фраза «Пасля нас хоць патоп», сказаная маркізай дэ Пампадур пры атрыманні каралём Людовікам XV весткі пра паражэнне войскаў у адной з бітваў Сямігадовай вайны (1756–1763). Сёння даследчыкі задаюцца пытаннем, што было прычынай імкнення арыстакратаў да заўсёднага свята і нежадання несці адказнасць за свае ўчынкі. Як можна назваць гэту псіхалагічную асаблівасць чалавека «Галантнага веку»? Як вы разумееце прынцып «Пасля нас хоць патоп»? Ці можна сцвярджаць, што прынцып «Пасля нас хоць патоп» і сёння характэрны для сучаснага грамадства? Абгрунтуйце сваю думку.
4. Выявіце агульнае і рознае паміж паняццямі «свабода сумлення» і «свабода веравызнання». Вызначце, якое паняцце з'яўляецца больш шырокім.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Ахарактарызуйце навуку як пазнавальную дзейнасць, сацыяльны інстытут, фактар вытворчасці. Складзіце і запоўніце табліцу.

| Навука як | Асаблівасці |
|---|---|
| пазнавальная дзейнасць | |
| сацыяльны інстытут | |
| фактар вытворчасці | |

6. Як вы лічыце, чаму мастак назваў сваю карціну «Размова з Богам»? Ці можа вучоны быць рэлігійным чалавекам?



*Капернік. Размова з Богам. Карціна Яна Матэйкі. 1874 г.*

7. У чым заключаецца сацыяльна-гістарычная абумоўленасць філасофскіх вучэнняў? Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з філосафаў.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Растлумачце, як узаемазвязаны навука, філасофія і рэлігія. Прывядзіце прыклады.




9. Параўнайце адукацыю і навуку як сацыяльныя інстытуты. У чым заключаецца іх падабенства, а ў чым адрозненне? Растлумачце ўзаемасувязь адукацыі і навукі ў сучасным грамадстве.
10. Разгледзьце карціну і адкажыце на пытанні.



*Рафаэль Санці. Афінская школа. 1511 г.*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

- Якая рэлігія была характэрна для гістарычнага перыяду, адлюстраванага на карціне?
- Які ўзровень развіцця навуковых ведаў быў характэрны для гістарычнага перыяду, адлюстраванага на карціне?
- Што ў дадзеным выпадку ўключае ў сябе паняцце «школа»?
- Якім чынам праз дадзеную фрэску можна прасачыць узаемасувязі паміж мараллю, рэлігіяй, навукай, мастацтвам, філасофіяй, адукацыяй?

11. Складзіце і запоўніце табліцу па ключавых пытаннях па вывучаных тэмах раздзела «Духоўная сфера грамадства». Прапануйце ўласныя ключавыя пытанні.

| Тэма | Ключавое пытанне | Кароткі адказ на пытанне | Уласнае ключавое пытанне |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Выніковае абагульненне

1. Ахарактарызуйце статус, якім вы валодаеце, і сацыяльныя ролі, якія вы выконваеце, у кожнай са сфер жыцця грамадства. На аснове характарыстыкі стварыце плакат з выявай уласнага статуснага набору.
2. Складзіце і запоўніце табліцу «Сферы жыцця грамадства ў паняццях». Устанавіце і растлумачце сувязі паміж асноўнымі паняццямі, якія ўжываюцца для характарыстыкі сфер жыцця грамадства.

| Сацыяльная | Палітычная | Эканамічная | Духоўная |
|---|---|---|---|
| | | | |

3. Дакажыце ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць сфер жыцця грамадства. Выкарыстайце пры адказе ментальныя карты на форзацах.
4. Вывучэнне якой сферы жыцця грамадства вас больш за ўсё зацікавіла? Абгрунтуйце свой выбар.
5. На аснове тэксту вучэбнага дапаможніка складзіце імянны паказальнік асоб, якія зрабілі істотны ўклад у развіццё навук пра грамадства. Каго вы туды ўключыце?
6. Якія кнігі або навуковыя працы пра грамадства, што прыгадваюцца ў вучэбным дапаможніку, вас зацікавілі? Чаму? Стварыце ТОП-5 «Кнігі пра грамадства, якія варта прачытаць кожнаму».
7. Якія ідэі прапанаваных у вучэбным дапаможніку міні-праектаў вы ўвасобілі ў гэтым навучальным годзе? Чаму? Ці будзе іх працяг?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Заключэнне

Давайце сцісла падвядзём вынікі вывучэння грамадазнаўства ў 10 класе. Мы шмат даведаліся пра сваё грамадства. Падрабязна разгледзелі сацыяльную структуру, палітычную, эканамічную, духоўную сферы. Даведаліся, як змянялася сацыяльная структура грамадства, якія новыя сацыяльныя супольнасці і групы з'явіліся, як у ім функцыянуюць сацыяльныя інстытуты і працэсы. Мы прыйшлі да высновы, што чалавецтва сутыкнулася з самым вялікім выклікам за час свайго існавання, калі рэальны свет злучаецца з віртуальным. Інфармацыйныя тэхналогіі, тэлекамунікацыі і вытворчасць зліваюцца, імкліва змяняючы лад жыцця і жыццёвыя стратэгіі людзей.

Мы бачым, што палітычная сфера ў сучасным грамадстве поўніцца пошукам кансэнсусу. Палітычная сістэма трансфармуецца, павялічваецца ідэалагічная разнастайнасць, множацца палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, павышаецца палітычная роля сродкаў масавай інфармацыі, дэмакратыя абагачаецца новымі практыкамі.

Мы вывучалі работу сучаснай эканомікі і пераканаліся ў эфектыўнасці рынкавых механізмаў у спалучэнні з дзяржаўным рэгуляваннем у інтарэсах усяго грамадства. У нас на вачах змяняецца тып уладкавання жыцця, разрастаюцца контуры лічбавага грамадства, робяцца рэальнасцю «разумны дом», «разумная фабрыка», «разумны горад» і да т. п.

Мы разам паспрабавалі расшыфраваць код духоўнага жыцця сучаснага грамадства. Упэўніліся, што менавіта праз культуру захоўваюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне нашы традыцыі і каштоўнасці, у іх — наша мараль, рэлігія, разуменне жыцця. Мы адкрылі для сябе фантастычны і бясконцы свет філасофіі і навукі і дакрануліся да фаліянтаў вялікіх мысліцеляў старажытнасці

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

і сучасных вучоных. Адчулі на сабе словы вялікага Сакрата: «Ёсць толькі адно дабро — веды і толькі адно зло — няведанне».

Пры вывучэнні сучаснага грамадства мы не цураліся праблем, якія існуюць сёння ў свеце і ў нас таксама, разам шукалі іх прычыны. Шмат спрачаліся і, як правіла, імкнуліся не столькі знайсці вінаватых, колькі выказаць прапановы, што рабіць. Вашы прапановы былі яшчэ ў чымсьці недасканалыя, але яны вельмі важныя. У іх — праява вашай грамадзянскасці і імкненне заняць актыўную пазіцыю ў далейшым развіцці нашага грамадства.

Што ж, курс гэтага года завершаны, але работа па спазнанні грамадства, у якім мы жывём, працягваецца. Колькі яшчэ вам трэба вывучыць, пазнаць, засвоіць!



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Асноўныя паняцці

**Адукацыя** — мэтанакіраваны працэс навучання і выхавання, якія ажыццяўляецца на прафесійнай аснове спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі.

**Банк** — фінансавая ўстанова, якая спецыялізуецца на накапленні грашовых сродкаў, крэдытаванні, пасрэдніцтве ў грашовых разліках і аперацыях з каштоўнымі паперамі.

**Беспрацоўе** — сацыяльна-эканамічная з'ява, пры якой частка эканамічна актыўнага насельніцтва не можа працаўладкавацца.

**Бюджэт** — зводны план збору даходаў і выкарыстання атрыманых сродкаў на пакрыццё расходаў за пэўны перыяд.

**Верацярпімасць** — прызнанне за кожным грамадзянінам права вызнаваць любую рэлігію, а значыць, паважлівае стаўленне да прадстаўнікоў іншых веравызнанняў.

**Выбарчая сістэма** — сукупнасць устаноўленых законам правіл, прынцыпаў і прыёмаў, з дапамогай якіх вызначаюцца вынікі галасавання ў прадстаўнічыя органы ўлады і на дзяржаўныя пасады.

**Вытворчасць** — працэс стварэння эканамічных даброт.

**Грамадзянскае грамадства** — асаблівая сфера грамадскіх адносін, сістэма самастойных і параўнаўча незалежных ад дзяржавы інстытутаў, грамадскіх інтарэсаў, адносін.

**Грамадства** — устойлівая сістэма адносін паміж людзьмі, якая гістарычна склалася ў працэсе сумеснай жыццядзейнасці.

**Грошы** — усеагульны эквівалент (мера) кошту, сродак абарачэння, плацяжу і зберажэння.

**Даход** — любое паступленне грашовых сродкаў ці атрыманне матэрыяльных даброт.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Дзяржава** — асаблівая форма арганізацыі палітычнай улады, якая валодае адмысловым апаратам кіравання грамадствам для забеспячэння яго цэласнасці, арганізаванасці і пэўнага парадку ў ім.

**Дэмакратыя** — палітычная сістэма, пры якой улада ажыццяўляецца народам або праз асабісты ўдзел (выбары, рэферэндумы), або праз сваіх прадстаўнікоў, абраных у органы дзяржаўнай улады.

**Інфляцыя** — абясцэньванне грошай, выкліканае перавышэннем колькасці грошай, што знаходзяцца ў абарачэнні, над іх таварным пакрыццём.

**Канкурэнцыя** — спаборніцтва, саперніцтва паміж эканамічнымі суб'ектамі за найлепшыя ўмовы вытворчасці і/ці рэалізацыі тавараў і паслуг, за выжыванне і эканамічны росквіт.

**Канфедэрацыя** — саюз юрыдычна і палітычна самастойных дзяржаўных утварэнняў, які ствараецца для дасягнення агульных мэт і вырашэння агульных праблем.

**Канфесія** — асобны напрамак у рамках адной рэлігіі, асаблівасці веравызнання ў межах пэўнага рэлігійнага вучэння.

**Крэдыт** — грашовыя сродкі, выдзеленыя банкам іншай асобе (атрымальніку крэдыту) у памеры і на ўмовах, прадугледжаных крэдытным дагаворам.

**Манаполія** — выключнае права вытворчасці, гандлю і іншых відаў дзейнасці, якое належыць адной фізічнай асобе, пэўнай групе асоб, кампаніі, арганізацыі ці дзяржаве.

**Манархія** — форма праўлення, пры якой улада засяроджана ў руках аднаасобнага кіраўніка дзяржавы.

**Маркетынг** — сукупнасць працэсаў стварэння, прасоўвання і прадастаўлення прадукту ці паслугі пакупнікам.

**Менеджмент** — сукупнасць сучасных прынцыпаў, метадаў, сродкаў і форм кіравання, якія маюць на мэце павышэнне эфектыўнасці працы прадпрыемства.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Моладзь** — сацыяльна-дэмаграфічная група (асобы ва ўзросце ад 14 да 31 года), якая валодае сукупнымі полаўзроставымі і сацыяльна-псіхалагічнымі асаблівасцямі і праходзіць стадыю сацыялізацыі ў канкрэтных ўмовах жыццядзейнасці грамадства.

**Навука** — дзейнасць па выпрацоўцы і сістэматызацыі аб'ектыўных ведаў пра свет, а таксама сацыяльны інстытут, мэтай якога з'яўляецца такая дзейнасць.

**Натоўп** — часовае скопішча людзей, якія пры непасрэдным фізічным кантакце спантанна рэагуюць на адзін і той жа раздражняльнік падобным чынам.

**Падаткі** — абавязковыя дармовыя плацяжы асобных грамадзян і юрыдычных асоб, якія спаганяюцца дзяржавай з мэтай задавальнення патрэб у фінансавых рэсурсах.

**Палітыка** — сфера грамадскіх стасункаў і дзейнасць, накіраваная на заваяванне дзяржаўнай улады і яе рэальнае ажыццяўленне.

**Палітычная ідэалогія** — сукупнасць ідэй, ідэалаў, каштоўнасцей, у якіх адлюстроўваюцца значныя, істотныя інтарэсы пэўных сацыяльных слаёў, што імкнуцца рэалізаваць гэтыя інтарэсы з дапамогай дзяржаўнай улады.

**Палітычная партыя** — арганізаваная група людзей з агульнымі палітычнымі поглядамі, якая выказвае інтарэсы пэўнай часткі грамадства і мае на мэце заваяванне дзяржаўнай улады ці ўдзел у яе ажыццяўленні.

**Палітычная сістэма грамадства** — сукупнасць палітычных інстытутаў і арганізацый, распаўсюджаных у грамадстве ідэй, поглядаў, каштоўнасцей, а таксама палітычных і прававых норм і спосабаў узаемадзеяння паміж інстытутамі ўлады і грамадствам.

**Палітычная эліта** — група, якая валодае рэальнай палітычнай уладай, магчымасцю ўздзейнічаць на грамадства.

**Прававая дзяржава** — форма арганізацыі палітычнай улады ў краіне, заснаваная на вяршэнстве права, падзеле ўлад, захаванні правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Рынак** — сістэма адносін абмену паміж пакупнікамі і прадаўцамі пры пасрэдніцтве грошай.

**Рэлігія** — сістэма вераванняў у звышнатуральнае і звязаныя з ёй асаблівыя, спецыфічныя паводзіны (культ).

**Рэспубліка** — форма праўлення, пры якой вышэйшыя органы дзяржаўнай улады абіраюцца насельніцтвам.

**Сацыяльнае дзеянне** — дзеянне, якое ўсведамляецца самім чалавекам, арыентавана на паводзіны іншых людзей і зразумела навакольным.

**Сацыяльная група** — устойлівая супольнасць людзей з наступнымі прыметамі: два і больш чалавек, агульныя інтарэсы і каштоўнасці, наяўнасць рэгулярнага ўзаемадзеяння членаў групы, чаканні адносна адзін аднаго, якія падзяляюцца кожным членам групы, адасобленасць ад іншых груп і аб'яднанняў.

**Сацыяльная камунікацыя** — працэс узаемадзеяння паміж суб'ектамі (індывідамі, групамі, арганізацыямі і да т. п.) з мэтай перадачы ці абмену інфармацыяй.

**Сацыяльная мабільнасць** — змена індывідам або групай сваёй пазіцыі ў сацыяльнай структуры.

**Сацыяльная роля** — узор паводзінаў, які грамадства прызнае мэтазгодным для ўладальніка дадзенага статусу.

**Сацыяльная страта** — сацыяльны слой, аб'яднаны якой-небудзь агульнай грамадскай прыметай (маёмаснай, прафесійнай ці іншай).

**Сацыяльная структура грамадства** — размеркаванне сацыяльных груп, сукупнасць сувязей і спосабы ўзаемадзеяння паміж імі.

**Сацыяльны інстытут** — форма арганізацыі сумеснай жыццядзейнасці людзей з дапамогай устаноўленых правіл, норм, санкцый.

**Сацыяльны клас** — вялікая сацыяльная група, адрозная па месцы і ролі ў сістэме вытворчасці і размеркавання даброт, а таксама — па адноснай долі спажываных даброт.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Сацыяльны працэс** — сукупнасць аднанакіраваных і паўторных сацыяльных дзеянняў, якія захоўваюць або змяняюць бягучую сітуацыю.

**Сацыяльны рух** — масавыя дзеянні, якія спрыяюць або перашкаджаюць сацыяльным зменам.

**Сацыяльны статус** — становішча чалавека ў грамадстве, з якім звязаны пэўны набор правоў і абавязкаў.

**Свабода сумлення** — самастойнасць чалавека ў выбары, верыць яму ў Бога ці адмаўляць рэлігійную веру.

**Спажыванне** — працэс непасрэднага задавальнення патрэб.

**Тэорыя** — абагульненая сістэма ведаў, якая дае тлумачэнне тым ці іншым бакам і ўласцівасцям прадмета або з'явы, што вывучаецца.

**Уласнасць** — прызнаныя грамадствам стасункі ў сувязі з размеркаваннем і прысваеннем эканамічных даброт паміж разнастайнымі суб'ектамі эканамічных адносін.

**Унітарная дзяржава** — адзіная дзяржава, якая складаецца з адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, што не валодаюць прыметамі дзяржаўнай самастойнасці або якой-небудзь уласнай аўтаноміяй.

**Фактар вытворчасці** — тая частка эканамічных рэсурсаў, што непасрэдна ўключаецца ў працэс вытворчасці або выкарыстоўваецца ў якасці яго ўмоў.

**Федэрацыя** — саюзная дзяржава, што складаецца з суб'ектаў, якія валодаюць пэўнымі прыметамі дзяржаўнай самастойнасці.

**Філасофія** — форма тэарэтычнага мыслення, якая аперыруе абстрактнымі паняццямі і фарміруе сістэму ведаў пра найбольш агульныя і фундаментальныя характарыстыкі рэальнасці і спосабы яе пазнання чалавекам.

**Фінансавая сістэма** — сістэма форм і метадаў стварэння, размеркавання і выкарыстання фондаў грашовых сродкаў дзяржавы, прадпрыемстваў, дамашніх гаспадарак.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Цана** — колькасць грошай, за якую прадаецца або купляецца эканамічная даброта.

**Эканоміка** — спосаб арганізацыі дзейнасці людзей па стварэнні даброт, неабходных для задавальнення патрэб; навука, якая даследуе, як выкарыстоўваюцца наяўныя абмежаваныя рэсурсы для задавальнення неабмежаваных патрэб.

**Эмпірыя** — вопыт чалавека, успрыманне знешняга свету з дапамогай органаў пачуццяў; назіранне, якое ажыццяўляецца ў звычайных натуральных умовах у адрозненне ад эксперыменту.

**Этыка** — філасофская дысцыпліна, прадметам асэнсавання якой з'яўляецца мараль.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Памяткі



## Пытанні для аналізу медыяпрофілю персоны

1. У якіх сацыяльных сетках ёсць уліковы запіс (акаўнт)?
2. Ці выкарыстоўваецца асабістае фота ў медыяпрофілі? Якая асабістая інфармацыя з’яўляецца агульнадаступнай?
3. Як часта выкарыстоўваецца Сетка?
4. Якія фатаграфіі пераважаюць у стужцы?
   - З адпачынку, падарожжаў, сямейных свят, значных падзей.
   - Селфі.
   - Аб прафесійнай дзейнасці, вучобе.
5. Хто бачыць паведамленні? Для якой аўдыторыі ствараюцца паведамленні, выкладваюцца пасты?
   - Для ўсіх без абмежавання доступу.
   - Для сяброў сяброў.
   - Для сяброў.
6. Якую мэту часцей за ўсё маюць пасты, публікацыі?
   - Падзяліцца карыснай інфармацыяй, уласнымі назіраннямі, вопытам калег і інш.
   - Напісаць пра сябе, падзяліцца лайфхакамі, тэстамі, апублікаваць віншаванні.
7. Зрабіце вывад, з якой мэтай створаны акаўнт.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



## На што неабходна звярнуць увагу пры чытанні навін (як распазнаць фейкі)

1. Якія эмоцыі выклікае ў вас гэта паведамленне? Ці можа яно раззлаваць вас, выклікаць у вас абурэнне, нешта вам навязаць або прадаць?
2. Звяртайце ўвагу на загаловак. Ці адпавядае ён інфармацыі ў тэксце? Ці ўтрымлівае катэгарычныя сцвярджэнні? Ці абяцае сенсацыю?
3. Абавязкова прачытайце тэкст цалкам, каб сфарміраваць пра яго сваё меркаванне. Ці сустракаюцца ў тэксце памылкі, супярэчнасці?
4. Калі навіна трапіла да вас з сацыяльнай сеткі, ці ведаеце вы, дзе яна была апублікавана ўпершыню? Ці ведаеце вы таго чалавека, на старонцы якога вы даведаліся пра гэту навіну?
5. Ці ёсць выява, якая ілюструе тэкст? Што можна сказаць пра гэту выяву (месца здымак, ракурс фатаграфіі і інш.)? Ці мае фота адносіны да інфармацыі ў тэксце?
6. Ці вядомы рэсурс, на якім апублікавана навіна? Ці падпісаўся аўтар паведамлення?
7. Ці ёсць спасылкі на першакрыніцу, на афіцыйныя рэсурсы (у выпадку неабходнасці), на экспертны погляд?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Як адрозніць факты ад меркаванняў у медыя

## 1 Факты

**Факты ўтрымліваюць інфармацыю пра тое, што, дзе, калі адбылося, лічбы, вынікі даследаванняў і да т. п.**

- **Факт — гэта тое, што адбылося ў рэальнасці, зафіксавана і што можна праверыць і пацвердзіць іншымі фактамі.**
- **Факт не ўтрымлівае ніякіх ацэнак ці заклікаў.**

## 2 Меркаванні

**Меркаванне ў тэксце можна знайсці ў выглядзе каментарыя, прапановы, высновы, ацэнкі і г. д.**

- **Меркаванне заўсёды перадае суб'ектыўныя адносіны, эмацыйна афарбавана, можа ўтрымліваць заклік да дзеяння.**
- **Адрозніць меркаванне ад фактаў можна з дапамогай слоў-маркераў, якія дазваляюць распазнаць наяўнасць ацэначнай інфармацыі ў тэксце:**
  - **адкрытае меркаванне: на мой погляд… здаецца… падобна… я лічу…**
  - **скрытае меркаванне: гэта значыць… відавочна… усе гэта разумеюць…**
- **Выкарыстанне якасных прыметнікаў таксама сведчыць пра ацэначную інфармацыю ў тэксце: стары — малады, шчыры — няшчыры, карысны — шкодны.**

## 3 Факты і меркаванні ў медыя

| Рэпартаж | Публіцыстыка |
|---|---|
| • Жанр, пазбаўлены эмоцый, які сцісла асвятляе бягучыя падзеі.<br>• Што? Дзе? Калі?<br>• Факты, факты, факты. | • Жанр, накіраваны на кантакт з чытачом.<br>• Чаму? Як? Навошта?<br>• Факты, погляды, меркаванні, каментарыі, аргументы, вывады. |

## 4 Прыметы якаснага медыякантэнту:

- **баланс меркаванняў пра падзею (не менш за два розныя пункты погляду);**
- **дакладнасць і паўната перадачы фактаў і інфармацыі;**
- **адасабленне фактаў ад меркаванняў/каментарыяў;**
- **абавязковая спасылка на крыніцу інфармацыі.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



# Пытанні для аналізу электронных зваротаў і петыцый

## 1 Праца з сэрвісамі і платформамі для электронных зваротаў

### Рубрыка «Электронныя звароты»

- Знайдзіце рубрыку «Электронныя звароты» на сайце органа дзяржаўнай улады, установы ці арганізацыі.
- Вызначце, якую інфармацыю павінен утрымліваць электронны зварот грамадзяніна ў абавязковым парадку, тэрміны разгляду звароту і якія звароты пакідаюцца без разгляду.
- Высветліце, якія сярод размешчаных адказаў на электронныя звароты носяць масавы характар.

### Сэрвісы для калектыўных зваротаў і петыцый

- Звярніцеся на сайты айчынных платформ для электронных зваротаў і петыцый (petitions.by, zvarot.by і інш.).
- Вывучыце інфармацыю аб працы сэрвісу (як стварыць петыцыю, якія звесткі неабходна пазначыць, як далучыцца да кампаніі і г. д.).

## 2 Аналізуем змест зваротаў і петыцый

- Вызначце праблемы, якія больш за ўсё хвалююць грамадзян (за апошні год ці паўгоддзе). Да якіх зваротаў далучылася найбольшая колькасць удзельнікаў? Якія звароты не выклікалі цікавасці і падтрымкі?
- Якія кампаніі можна лічыць паспяховымі? Як была вырашана праблема?
- У чым плюсы і мінусы электронных зваротаў?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



# Аналіз прыёмаў у рэкламе

**1** **Высветліце, ці выкарыстоўваюцца ў рэкламе наступныя прыёмы.**

- **Маніпуляванне эмоцыямі.** У роліку закранаюцца пачуцці і выклікаюцца станоўчыя эмоцыі (выкарыстанне вобразаў шчаслівай сям'і, закаханых людзей, музычнага афармлення, гумару і інш.).
- **Прыцягненне зорак шоу-бізнесу, спорту, кіно.** Стварэнне эфекту прывабнасці тавару ці паслугі, якую прапануе купіць любімы акцёр, зорка спорту і інш.
- **Паказ тавараў у лепшым святле.** Тавары і паслугі паказаны як дасканалыя, лепшыя ў параўнанні з іншымі, дэманструюцца ў ідэальных сітуацыях.
- **З'яўленне ў кадры экспертаў.** Стварэнне эфекту аўтарытэту з дапамогай акцёраў ва ўніформе, якія прадстаўляюць спецыялістаў у асобных сферах.
- **Маніпуляванне лічбамі.** Выкарыстанне неакругленых лічбаў у кошце тавару (напрыклад, 8,99 р.), пэўнага парадку лічбаў, паказ велічыні скідкі).

**2** **Зрабіце вывады.**

- Наколькі дакладна адлюстроўваюцца тавары і паслугі ў рэкламе?
- Што замоўчвае або наўмысна ўтойвае дадзеная рэклама?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



# Памятка для работы з фатаграфіяй помніка, мемарыяла

1 **Уважліва разгледзьце фатаграфію помніка і адкажыце на пытанні.**

- Як вы лічыце, каму прысвечаны гэты помнік?
- Што нам гавораць элементы, сімвалы, дэталі?
- Якую гісторыю распавядае помнік?
- Хто і пра што тут нагадвае?
- Якія каштоўнасці нясе помнік?
- Гэта адпавядае вашым каштоўнасцям?
- Якая функцыя помніка ў публічнай прасторы?
- Прапануйце назву для гэтага помніка і абгрунтуйце яе.
- Калі б вы былі мэрам, вы дазволілі б паставіць гэты помнік?

2 **Знайдзіце інфармацыю пра помнік (як называецца, каму прысвечаны, хто выступіў ініцыятарам, дата адкрыцця). Параўнайце гэту інфармацыю з уласнымі меркаваннямі.**

3 **Калі помнік усталяваны нядаўна, знайдзіце ў інтэрнэце тры публікацыі з гэтай фатаграфіяй аб адкрыцці помніка. Адкажыце на наступныя пытанні:**

- Якія загалоўкі выкарыстоўваюцца ў розных медыя?
- Ці адрозніваюцца мэсэджы (асноўныя пасылы, ідэі) публікацый? Сфармулюйце іх.
- Каму належаць медыя? На якую аўдыторыю яны арыентаваны?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Змест

**Уводзіны** ........ 3

**I. Сацыяльная сфера грамадства** ........ 6
§ 1. Грамадства як сістэма ........ 7
§ 2. Сацыяльная структура грамадства ........ 15
§ 3. Сацыяльныя статусы, ролі і мабільнасць ........ 23
§ 4. Сацыяльная камунікацыя ........ 33
§ 5. Сацыяльныя працэсы і змяненне грамадства ........ 40
Абагульненне па раздзеле «Сацыяльная сфера грамадства» ........ 49

**II. Палітычная сфера грамадства** ........ 52
§ 6. Палітыка і яе роля ў грамадскім жыцці ........ 53
§ 7. Дзяржава ў палітычнай сістэме ........ 61
§ 8. Дэмакратыя ........ 69
§ 9. Прававая дзяржава і грамадзянскае грамадства ........ 77
§ 10. Палітычныя ідэалогіі ........ 83
§ 11. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні ........ 90
Абагульненне па раздзеле «Палітычная сфера грамадства» ........ 100

**III. Эканамічная сфера грамадства** ........ 103
§ 12. Эканоміка і яе роля ў жыцці чалавека і грамадства ........ 104
§ 13. Уласнасць і даходы ........ 114
§ 14. Грашова-крэдытная сістэма ........ 123
§ 15. Рынак: попыт, прапанова, цана ........ 132
§ 16. Канкурэнцыя і яе роля ў эканоміцы ........ 140
§ 17. Фінансавая сістэма грамадства ........ 148
§ 18. Дзяржава і эканоміка ........ 155
Абагульненне па раздзеле «Эканамічная сфера грамадства» ........ 167

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**IV. Духоўная сфера грамадства** ........ 171
§ 19. Мараль ........ 172
§ 20. Рэлігія ........ 180
§ 21. Філасофія ........ 191
§ 22. Навука ........ 201
§ 23. Адукацыя ........ 210
Абагульненне па раздзеле «Духоўная сфера грамадства» ........ 218

**Выніковае абагульненне** ........ 222

**Заключэнне** ........ 223

**Асноўныя паняцці** ........ 225

**Памяткі** ........ 231
Пытанні для аналізу медыяпрофілю персоны ........ 231
На што неабходна звярнуць увагу пры чытанні навін (як распазнаць фейкі) ........ 232
Як адрозніць факты ад меркаванняў у медыя ........ 233
Пытанні для аналізу электронных зваротаў і петыцый ........ 234
Аналіз прыёмаў у рэкламе ........ 235
Памятка для работы з фатаграфіяй помніка, мемарыяла ........ 236

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вучэбнае выданне

**Данілаў** Аляксандр Мікалаевіч,
**Палейка** Алена Аляксандраўна,
**Кушнер** Надзея Васільеўна і інш.

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
(з электронным дадаткам
для павышанага ўзроўню)

Выкарыстаны:
ілюстрацыі А. Цвіка, Andy Council;
фотаматэрыялы Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў,
Беларускай валютна-фондавай біржы, БелТА, В. Дняпроўскага, А. Кандыба,
Л. Маспанавай, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь,
музея гістарычнага факультэта БДУ, Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;
ReptOn1x/wikimedia.org; сайта gedenkstaetten-uebersicht.de

Рэдактары *С. В. Зелянко, І. А. Стральчук*
Дызайн і вёрстка *Л. А. Маспанавай*
Карэктар *Т. В. Басалыга*

Падпісана да друку 14.08.2020. Фармат 70 × 90 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 17,55. Ул.-выд. арк. 12 + 25 электрон. дадат. Тыраж 11 350 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск. Тэл. 285-37-44, тэл./факс 233-99-34.
www.pshop.by; e-mail: aiv@aiv.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Беларускі Дом друку”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Адукацыя і выхаванне